ARCHE Зьмест № 8’2000 СКАРЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. Дастаеўскі Беларусі. Сакрат Яновіч у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Калі чытаеш аповесьці Васіля Быкава, узьнікае ўражаньне, што пэрыпэтыі вайны ў іх — гэта нешта другараднае, матэрыял, які аўтар найлепш ведае і якім можа найлепш пакарыстацца пры ўзьвядзеньні архітэктуры твору. Хай гэта „Здрада“, „Праклятая вышыня“ або „Пастка“, „Дажыць да сьвітаньня“ або „Мёртвым не баліць“..."
3. Мёртвыя сярод жывых. Стаўленьне да сьмерці ў постсавецкай Беларусі. Андрэй Екадумаў у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Праблема сьмерці мела два паралельныя вырашэньні. Першае — ліквідацыя ў чалавеку асобы, яе зьнікненьне ў таталітарнай масе..."
4. „Litvanija“ ci Eŭropa? Antoni Zapałota ŭ ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Analityka • Eseistyka • Krytyka • Recenzii. "...Tezy ab „histaryčnaj jednaści“ z Eŭropaj mohuć i musiać zaachvočvać samich biełarusaŭ da postupu ŭ spravie eŭrapiejskaj intehracyi, ale naŭrad ci mohuć być važkimi arhumentami ŭ Eŭropie ci dla Eŭropy..."
5. Танк, Ленін і Ажэшка зь Міцкевічам. Аб трох гарадзкіх краявідах. Сяргей Астраўцоў у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Сонечны летні дзень. Я стаяў каля вежаў з байніцамі Брыгіцкага касьцёла і дзівіўся: як такі горад маглі пакінуць беларусам, якія традыцыйна „нічога ня маюць“?..."
6. Аскепкі вялікага малюнку. Алесь Аркуш у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Кожны з далучаных да беларушчыны хоча пабачыць у Полацку нешта сваё, добра вядомае, зразумелае і чаканае. Знайсьці ілюстрацыі да ўласнага ўяўленьня аб зыходным, аб пачатку..."

7. Малая інтымная урбаністыка. Юры Андруховіч у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Ён яшчэ нядаўна ехаў праз горы, пра што сьведчылі ня толькі заінелыя дахі вагонаў, але й вялікая колькасьць карпацкіх цыганоў ува ўсіх без выключэньня тамбурах..."
8. Што Расіі ўзяць у XXI стагодзьдзе і што пакінуць у мінулым? Рычард Пайпс у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Безумоўна, пачуцьцё вялікадзяржаўнасьці грунтуецца на шэрагу фактараў, сярод якіх і велізарная тэрыторыя, і асаблівае геапалітычнае становішча. Не ў апошнюю чаргу — гэта вайсковая магутнасьць. Насамрэч ніводзін з гэтых фактараў ня робіць краіну вялікай дзяржавай..."
9. Паэзія і грэх. Людміла Рублеўская у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...пахмуры тып у піжонскім белым гольфе, з пушкінскімі бакенбардамі і скептычным позіркам. „Рэзаў“ услых усё, што хацеў, мог прылюдна сказаць „г... твае вершы“ любому літаксакалу з „палічкай кніг“, чорнай „Волгай“ і кватэрай у „раёне андатравых шапак“..."
10. Даведнік з памылкамі. Юрась Лаўрык у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Першае ўражаньне, якое гэтая кніга на мяне зрабіла, я б ахарактарызаваў адным словам: „Нарэшце!“ Грунтоўны даведнік, энцыкляпэдычна сьціслыя і багатыя на фактаграфію артыкулы, дыхтоўная аправа — гэта, здаецца, якраз тое, чаго ўжо даўно чакалі чытачы. У сам-раз паставіць на паліцу... і болей не чапаць — каб не псаваць гэтага першага ўражаньня..."
11. Паталёгіі рэалізму. Надзея Садзікава ў ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Аб тым, што „страта пачуцьця рэальнасьці“ — сацыяльны фэномэн і людзі жадаюць, каб зь імі пра гэта размаўлялі, сьведчаць, напрыклад, шумныя камэрцыйныя посьпехі стужкі „Матрыца“ братоў Энды і Лары Вачоўскіх, праекту „Догма“ Ларса фон Трыера і іншых дацкіх рэжысэраў, апошнія раманы Віктара Пялевіна, раман Мішэля Ульбэка „Элемэнтарныя часьцінкі“, стужка „Шчасьце“ амэрыканскага рэжысэра Тода Солондца..."

12. Вайна — вядомая й невядомая. Віктар Гарабец у ARCHE 8(13)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Аб'ектам дасьледаваньня сп.Сагановіча сталіся падзеі расейска-польскай вайны 1654–1667 гадоў, што разгортваліся на беларускіх землях. Аднак, нягледзячы на рэгіянальную скіраванасьць працы, яна, несумненна, зацікавіць і ўкраінскага чытача..."

[image]
A R C H E **S k a r y n a** **№ 8 (13) – 2000**
[image]

[image]

[image]
[image]–[image]2000
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

З ь м е с т

Сакрат Яновіч
Дастаеўскі Беларусі
„…Калі чытаеш аповесьці Васіля Быкава, узьнікае ўражаньне, што пэрыпэтыі вайны ў іх — гэта нешта другараднае, матэрыял, які аўтар найлепш ведае і якім можа найлепш пакарыстацца пры ўзьвядзеньні архітэктуры твору. Хай гэта „Здрада“, „Праклятая вышыня“ або „Пастка“, „Дажыць да сьвітаньня“ або „Мёртвым не баліць“…“
Андрэй Екадумаў
Мёртвыя сярод жывых
„…Праблема сьмерці мела два паралельныя вырашэньні. Першае — ліквідацыя ў чалавеку асобы, яе зьнікненьне ў таталітарнай масе…“
Antoni Zapałota
„Litvanija“ ci Eŭropa?
„…Tezy ab „histaryčnaj jednaści“ z Eŭropaj mohuć i musiać zaachvočvać samich biełarusaŭ da postupu ŭ spravie eŭrapiejskaj intehracyi, ale naŭrad ci mohuć być važkimi arhumentami ŭ Eŭropie ci dla Eŭropy…“
Сяргей Астраўцоў
Танк, Ленін і Ажэшка зь Міцкевічам
„…Сонечны летні дзень. Я стаяў каля вежаў з байніцамі Брыгіцкага касьцёла і дзівіўся: як такі горад маглі пакінуць беларусам, якія традыцыйна „нічога ня маюць“?…“
Алесь Аркуш
Аскепкі вялікага малюнку
„…Кожны з далучаных да беларушчыны хоча пабачыць у

Полацку нешта сваё, добра вядомае, зразумелае і чаканае. Знайсьці ілюстрацыі да ўласнага ўяўленьня аб зыходным, аб пачатку…“

Юры Андруховіч

Малая інтымная урбаністыка

„…Ён яшчэ нядаўна ехаў праз горы, пра што сьведчылі ня толькі заінелыя дахі вагонаў, але й вялікая колькасьць карпацкіх цыганоў ува ўсіх без выключэньня тамбурах…“

Рычард Пайпс

Што Расіі ўзяць у XXI стагодзьдзе і што пакінуць у мінулым?

„…Безумоўна, пачуцьцё вялікадзяржаўнасьці грунтуецца на шэрагу фактараў, сярод якіх і велізарная тэрыторыя, і асаблівае геапалітычнае становішча. Не ў апошнюю чаргу — гэта вайсковая магутнасьць. Насамрэч ніводзін з гэтых фактараў ня робіць краіну вялікай дзяржавай…“

Людміла Рублеўская

Паэзія і грэх

„…пахмуры тып у піжонскім белым гольфе, з пушкінскімі бакенбардамі і скептычным позіркам. „Рэзаў“ услых усё, што хацеў, мог прылюдна сказаць „г... твае вершы“ любому літаксакалу з „палічкай кніг“, чорнай „Волгай“ і кватэрай у „раёне андатравых шапак“…“

Кнігі — Рэакцыі — Лісты ў рэдакцыю
Юрась Лаўрык Даведнік з памылкамі
Надзея Садзікава Паталёгіі рэалізму
Віктар Гарабец Вайна — вядомая й невядомая

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 8 (13) – 2000
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 16-01-2001

[image]

Сакрат Яновіч

Дастаеўскі Беларусі

Vasil Bykaй: „Ściana“, tłum. Czesław Seniuch, Jan Maksymiuk, wyd. SETPro, Białystok 1999.

У беластоцкім выдавецтве „SETPro“ выйшла кніга „Сцяна“, у якую ўвайшлі некалькі дзясяткаў новых апавяданняў, навэляў, выдатна перакладзеных Чэславам Сэнюкам і Янам Максімюком.

Быкаў ужо ў гадох, але дагэтуль прадукцыйна працуе ніве літаратуры, дарма што адчуў патрэбу пакінуць бацькаўшчыну, якая знаходзіцца пад уладай д'ябальскага рэжыму Лукашэнкі. Сьпярша ён разам з жонкай знайшоў прытулак у Нямеччыне, а пасьля ў Нямеччыне. Гэты былы лейтэнант дывізіёна артылерыі часоў апошняй вялікай вайны, які цудам уратаваўся ад цяжкіх ранаў на палёх бітваў у Вугоршчыне і Аўстрыі, дэбютаваў толькі на пачатку 60-ых, маючы амаль пяцьдзесят гадоў. Гэтаму, безумоўна, паспрыяла славутая адліга. Нават ня тое, магчыма, ён бы і ня ўзяўся за пяро.

Чаму? Бо пачаўшы пісаць раней, Быкаў ня меў бы якіх шанцаў апублікаваць свае творы. Больш за тое, гэта б пагражала высылкай у сібірскія лягеры. Быкаў пісаў бы, ня ня зносіць брахні, ідэалягічнага зглумленьня чалавека, без адыходу ад маральнасьці. У сваіх творах ён выяўляе праўду аб вайне, вядомай яму з уласнага досьведу. Адзіны навэлы

САКРАТ ЯНОВІЧ кіраўнік культурнага асяродку Villa Sokrates у Крынках (Беласточчына). Аксуіт, празаік, выдавец „Дзеяння“, у якую ўвайшлі некалькі дзясяткаў новых апавяданняў, навэляў, выдатна перакладзеных Чэславам Сэнюкам і Янам Максімюком. Быкаў ужо ў гадох, але дагэтуль прадукцыйна працуе ніве літаратуры, дарма што адчуў патрэбу пакінуць бацькаўшчыну, якая знаходзіцца пад уладай д'ябальскага рэжыму Лукашэнкі. Сьпярша ён разам з жонкай знайшоў прытулак у Нямеччыне, а пасьля ў Нямеччыне. Гэты былы лейтэнант дывізіёна артылерыі часоў апошняй вялікай вайны, які цудам уратаваўся ад цяжкіх ранаў на палёх бітваў у Вугоршчыне і Аўстрыі, дэбютаваў толькі на пачатку 60-ых, маючы амаль пяцьдзесят гадоў. Гэтаму, безумоўна, паспрыяла славутая адліга. Нават ня тое, магчыма, ён бы і ня ўзяўся за пяро. Чаму? Бо пачаўшы пісаць раней, Быкаў ня меў бы якіх шанцаў апублікаваць свае творы. Больш за тое, гэта б пагражала высылкай у сібірскія лягеры. Быкаў пісаў бы, ня ня зносіць брахні, ідэалягічнага зглумленьня чалавека, без адыходу ад маральнасьці. У сваіх творах ён выяўляе праўду аб вайне, вядомай яму з уласнага досьведу. Адзіны навэлы

Аўтар альманаха **Amnis Albaruthenicus“, сузаснавальнік „Czasopisu“, аўтар кнігі „Беларускі хаўрус“ (1999) і кнігі разважаньняў пра гістарычны лёс Беларусі, пабудаваных у выглядзе дыялёгаў з**

герой у яго — жаўнер, ублытаны не па ўласнай волі ў экстрэмальныя сытуацыі і па сутнасьці гамлетаўскія.

журналістам Юрыдам Хмялеўскім „Nasze tysiąclat“ (Таварыства беларускіх журналістаў у Польшчы, 2000). Сярод апошніх публікацый — прадмова да „ARCHE-Панславізм: думка і злачынствы“ і эсэ „Ўсе мы патроху жыды“ ў „ARCHE-Габрэйскі нумар“. Артыкул перакладзены з ласкавай згоды аўтара паводле „Gazety Wyborczej“.

Так пра вайну ў Савецкім Саюзе да яго ніхто не пісаў. У модзе былі творы з панарамным ахопам, з паказам штабаў, гераічных камандзіраў і палітрукоў з жаўнерамі ў якасьці фону. Зь цягам часу ўтварылася плынь пад назвай „літаратура акопнай праўды“, якая вызначалася тым, што дзеяньне твораў перастала абмяжоўвацца штабнымі памяшканьнямі і апісаньнямі ваенных баталіяў, а аўтарская ўвага стала сягаць да „засраных акопаў і завашыўленых зямлянкаў“.

Быкаў пайшоў далей. Ён засяродзіўся на „атаме вайны“, гэта значыць на долі асобнага жаўнера; часам таксама на яго

беспасярэдніх начальніках, на сэржантах і лейтэнантах, якіх спасьцігла тая ж самая бяда. Штабныя ж работнікі — гэта іншы сьвет, для якога вайсковыя нізы — нішто.
У сваіх мастацка-літаратурных аналізах Быкаў дасягае ўнівэрсальнага вымярэньня — якое грамадзтва, такая і армія. Калі чытаеш аповесьці Васіля Быкава, узьнікае ўражаньне, што пэрыпэтыі вайны ў іх — гэта нешта другараднае, матэрыял, які аўтар найлепш ведае і якім можа найлепш пакарыстацца пры ўзьвядзеньні архітэктуры твору. Хай гэта „Здрада“, „Праклятая вышыня“ або „Пастка“, „Дажыць да сьвітаньня“ або „Мёртвым не баліць“...

Ня толькі цэнтральныя ўлады абвінавачвалі пісьменьніка ў ачарненьні рэчаіснасьці. У Беларусі Быкаў таксама ня меў апірышча, бо, ня лічачы адзінкавых выпадкаў, тут так і не сфармаваўся дысыдэнцкі рух. Пісьменьніка падтрымлівалі маскоўскія лібэралы, пераважна з асяродзьдзя слыннага некалі літаратурнага часопіса „*Новый Мир*“, рэдагаванага Аляксандрам Твардоўскім, які публікаваў забароненыя ў Менску тэксты вялікага беларуса. Трэба пры гэтым адначасна сказаць, што тады Быкава амаль імгненна перакладалі і выдавалі таксама і ў Польшчы, дзякуючы захадам і аўтарытэту такіх пісьменьнікаў, як Віктар Варашыльскі, Анджэй Дравіч або Ян Гушча. Нягледзячы на сапраўды сусьветную вядомасьць, стаўленьне да Васіля Быкава ў даперабудоўныя часы з боку ўладаў вагалася ад непрыязнасьціда падлабуньваньня, бо ўлады стараліся аблашчыць пісьменьніка і выкарыстаць для сваіх патрэбаў. Але неўзабаве зьявіўся Гарбачоў са сваёй утопіяй рэфармаваньня нерэфармавальнага камунізму, наданьня нялюдзкаму ладу людзкага аблічча; тады Быкаў пачаў уголас прамаўляць як пісьменьнік і чалавек. Ён стаў сумленьнем беларускай нацыі, знакавай постацьцю — як той, хто ніколі не выракаўся праўды ні словам, ні справай.
На жаль, БССР, перайменаваная ў незалежную Рэспубліку Беларусь пасьля распаду СССР, стала не дэмакратычнай дзяржавай, а нечым накшталт аскепка імпэрыі. Савецкая намэнклятура, перажыўшы часовыя паразы, поўніцай утрымала тут уладу і спрыяла ўзьнікненьню аўтарытарнага рэжыму. Яго ўзмацненьне адбылося пяць гадоў таму і дасягнула кульмінацыі ў сэрыі палітычных забойстваў, мэтай якіх было

аслабленьне апазыцыі. У дадзены момант шмат яе лідэраў апынуліся на эміграцыі, у тым ліку і ў Польшчы. Быкаў знайшоў прытулак сьпярша ў Скандынавіі.
У гэтым кантэксьце знамянальнае значэньне мае выезд зь Беларусі старшыні Саюзу беларускіх пісьменьнікаў Уладзімера Някляева сьпярша ў Варшаву, а потым у Гельсынкі. Някляеў ня быў у апазыцыі, аднак ня змог вынесьці антыбеларускага курсу Лукашэнкі, накіраванага на поўнае зьнішчэньне беларускай мовы і грунтаванай на ёй нацыянальнай культуры. Гэты парадокс, што беларуская дзяржава імкнецца да падрыву беларушчыны, то бок да самаадмаўленьня, з гледзішча нармальнага розуму цяжка вытлумачыць. Дзяржава, якая намагаецца стаць калёніяй іншай дзяржавы? Стала марыць аб тым, каб перастаць быць самой сабой?! Незалежнасьць, за якую іншыя народы пралівалі кроў пакаленьнямі, для Беларусі стаецца каменем на шыі? Як жа гэта растлумачыць? Хваробай? Быкаў у нядаўным інтэрвію, апублікаваным у „*Gazecie Wyborczej*“, поўніцца нядобрымі перажываньнямі і інтуіцыямі. Памятаючы свае шматлікія размовы з Васілём, — і трыццаць гадоў назад, і ўсяго пару, я ведаю, што ён ніколі ня меў ілюзіяў наконт *homo sovieticus*’а, бо, нягледзячы на ўсе спробы ідэалізацыі, дасканала ведаў яго. Быкаў паводзіў сябе быццам Міцкевіч у Расіі, не даючы сябе маральна зьнішчыць.
Быкаў дасьледуе прычыны гэткага лёсу Беларусі і беларусаў, дзякуючы чаму ўсё часьцей у яго творчасьці зьяўляецца партызанская тэматыка, менш знаёмая яму з уласнага досьведу. Зьяўляецца таксама гістарычная, паўстанцкая тэматыка, зьвязаная зь няўдалай спробай пабудовы беларускай незалежнасьці пасьля першай сусьветнай вайны. Пісьменьнік мае тую перавагу над любым палітыкам і любым прэзыдэнтам, што не палітыка вызначае яго месца ў гісторыі. Калі сярэдні паляк пазірае цяпер на мінуўшчыну вачыма Генрыка Сянкевіча, то звычайны беларус, безумоўна, ня будзе на яе глядзець вачыма прэзыдэнта (ня той талент і ня тая магія слова).

Згаданая „*Ściana*“ — збор напісаных апошнім часам твораў, выданьню якога ў Менску паспрыяла патрыятычнае асяродзьдзе, — зьмяшчае ў сабе атляс беларускіх нягодаў. Мэтафарай гэтых нягодаў служыць фінал аднайменнага твору, у якім вязень заўзята бурыць каменную сьцяну, каб нарэшце

вырвацца на волю, але аказваецца, што ён апынуўся на турэмным дворыку, паблізу ад шыбеніцы. „Жыцьцё ў турме, як і сьмерць, ня мела сэнсу“, — канстатуе аўтар. Чалавек завіс у касьмічным вакууме, у якім яго проста няма, дарма што ў зямных умовах ён жыве, есьць і дыхае, і нешта там бачыць. Гістарычная драма Беларусі і беларусаў, стала прысутная ў прозе Быкава, не прыводзіць да таго, што яго творчасьць стаецца малазразумелай для іншых. У рэчаіснасьці ўсё наадварот. Пісьменьнік выяўляе гэтую драму ня столькі праз палітычныя рэаліі, колькі праз асэнсаваньне чалавека як такога. Кранальную сцэну калектыўнага самагубства беларускіх паўстанцаў са слуцкай брыгады дваццатага году, пасьля прайгранай бальшавікам кампаніі, пісьменьнік прадстаўляе без гістэрыі („На чорных лядах“). Трагедыя адбываецца спакойна, можна сказаць — разважліва і лягічна. Без узьнёслых жэстаў, па-сялянску, прадметна. У мяне гэта выклікала асацыяцыю са сьмерцю маёй бабулі — днём раней яна дала сям’і апошнія распараджэньні і, спраўдзіўшы, што іх зразумелі правільна, неўзабаве ціхенька памерла. Гэткая сьмерць не была канцом сьвету.

Быкаў не выносіць ілюзіяў, і дзеля гэтага ён зусім непрыдатны да прапагандысцкага выкарыстаньня. Дарма што яго тэксты ня маюць займаючага дыханьне дзеяньня, яны чытаюцца запоем. Бо яны — захапляльнае падарожжа ў глыб чалавечай душы, выяўленьне яе шторазу іншых краявідаў. Яго можна назваць „Дастаеўскім беларускай літаратуры“, але настолькі своеасаблівым, што яго цікавіць не псыхалёгія літаратурнага героя наагул, не барацьба дабра са злом, а выяўленьне велічы і ўвадначас подласьці ў маленькім чалавеку, уцягнутым у колы гісторыі. Усё пачынаецца неўспадзеўкі. Жыў-быў сабе маленькі чалавек, які збольшага трымаўся дзесяцёх запаведзяў, хутчэй інстынктыўна, дзякуючы натуральнаму маральнаму закону. І зьнячэўку яго ўпіхнулі ў вір часу і эпохі, якую ён, як правіла, не да канца разумее. Увогуле ён зьбіты з панталыку, а калі і паддаецца злу, то зусім не з разьліку: ён проста не вытрымлівае. І што выходзіць? Пры сутыкненьні індывіда са злом часьцей прайграе першы. У індывідуальным вымярэньні пераадоленьне зла дабром канчаецца на крыжы. Таму дабро вымагае ахвярнасьці, адданасьці. І ў гэтым палягае ўнівэрсальная драма Беларусі — у яе сумленнай бясьсільнасьці

перад д’ябальскай сілай. Аднак так не павінна быць у будучыні. Вось мая рэфлексія.
Учытваючыся ў „*Ścianę*“ Васіля Быкава, з кожным наступным тэкстам трапляеш не ў дэпрэсію, а наадварот: узрастае прага ачышчэньня. Акурат у гэтым месьціцца незапатрабаваная прыцягальнасьць, сіла самога дабра як антыпода антычалавечых паводзінаў літургіі Зла. Мы ля сьцяны, бы сыны Ізраілю.

Тэкст перакладзены паводле

Gazety
Wyborczej
з ласкавай
згоды аўтара.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**
[image]

АНДРЭЙ ЕКАДУМАЎ
кандыдат філязофскіх навук, выкладчык філязофіі і лёгікі ў БДУ. Сярод апошніх публікацый — артыкул „Час імпэрыяў мінуўся“ ў першым нумары „ARCHE-Скарыны“.

Андрэй Екадумаў

Мёртвыя сярод жывых. Стаўленьне да сьмерці ў постсавецкай Беларусі

Сярод стандартных шматпавярховікаў і дзіцячых пляцовак, зь іх гоманам і мітусьлівасьцю, брыдуць, кіруючыся да месца свайго расстрэлу, маўклівыя шэрыя постаці ахвяраў генацыду. Такі помнік, працы мясцовага майстра Леаніда Левіна, зьявіўся ў Менску сёлета ўлетку. Падчас адкрыцьця манумэнтальнай кампазыцыі жывыя і мёртвыя нібыта зьліваліся ў адну непадзельную цэласьць — згадзіцеся, моцнае відовішча для стараньняга назіральніка. Малюнак застрашлівы й сымбалічны, асабліва калі згадаць, што назіральнік жыве ў постхрысьціянскую эпоху, вызнае прынцып падзелу сьветаў на прафанны й сакральны, дольны й вышні, гэты сьвет і той сьвет.

Шчыльнымі радамі

Ад карціны зьмяшчэньня постацяў увекавечаных памерлых сярод натоўпу пакуль што жывых (а яе можна пабачыць ува ўсіх цэнтральных газэтах) вее архаічнай жудасьцю. Мерцьвякі, што

не знайшлі спакою, паганскія наўцы, вупыры прыйшлі да месца свайго страшнага скону. Вось яны ці то брыдуць, ці то стаяць сярод жывых, а тым хоць бы што: нібыта й не заўважаюць мёртвых. Дый што ў іх насамрэч дзіўнага? Мерцьвякі, адлітыя з мэталу, — справа звыклая. Такі сабе будзённы сталічны пэйзаж: шматпавярховік над раскрытай магілай, побач дзеці ў футбол гуляюць, расстраляныя, што застылі ў вечным зыходзе да месца страты. Беларускія абэліскі, Беларускі Дзень Мёртвых у рэжыме *non-stop*, куды там мэксыканцам зь іхнымі перажыткамі індзейскіх культаў. Што нам гета, што нам курапаты, рана незагойная, нашыя мёртвыя пры нас, нікуды не падзенуцца.
Сымбалічна, што ня дужа далёка ад магілы расстраляных габрэяў знаходзіцца шчэ адно журботнае месца грамадзкага карыстаньня — сутарэньне Менскай Хадынкі, выхад са станцыі мэтро Няміга, аздоблены пачварнымі мэталёвымі кветкамі й нехлямяжнымі самаробнымі ахвярнікамі, зробленымі з куды большай цеплынёй, — такімі сабе надмагільлямі без магілаў. Напаўгісторыя-напаўлегенда пра Нямігі крывавыя берагі, наклаўшыся на мінулагоднія падзеі, атрымала, у дадатак да спаконвечнага, цалкам канкрэтнае сучаснае вытлумачэньне. Вось так Менск паступова абрастае сваёй незаўважнай міталёгіяй, дзе хрысьціянскіх матываў — кот наплакаў, затое перакручанага камунатэізмам дрымучага паганства — аж занадта.

Уздымаючыся або сыходзячы па прыступках станцыі, заўсёды сустракаешся вачыма зь яе ахвярамі, што пазіраюць з фотаздымкаў, наклееных на сьцены пераходу. Гэтыя імправізаваныя капішчы, як і мэталёвыя кветкі на ўяўным надмагільлі, як і працэсія памерлых на Мельнікайтэ ёсьць адзнакамі своеасаблівага беларускага постсавецкага ўспрыманьня сьмерці.
У адрозьненьне ад цэркваў, што ставяцца звычайна на ўзгорках і нібыта імкнуцца ўверх, да вышняга, да вечнага жыцьця, да адраджэньня, і Няміга, і Яма — нізкія месцы. Памінальныя месцы ў далох — гэта таксама сымбалічна. Нібыта мёртвыя ня могуць вырвацца з абдымкаў гэтага сьвету, зямнога быцьця, пераходу. Тыя, што на Нямізе, нібыта й не адыходзілі ў іншы сьвет, тыя, што на Мельнікайтэ, ніяк не адыдуць, вяртаюцца.

Сымболіка гэтых месцаў і гэтых помнікаў нібыта сьведчыць: мёртвыя сапраўды побач, яны нікуды не сыходзяць, яны застаюцца сярод жывых.

Сьмерць чалавека

Фэномэн чалавечай сьмерці, які трэба разумець ня столькі як распад адмерлых тканак, колькі як страту сьветам жывых унікальнай, непаўторнай асобы, у культурнай прасторы постсавецкай Беларусі не асэнсаваны й не засвоены. Хрысьціянскае, наагул рэлігійнае стаўленьне да сьмерці чалавека было пахаванае пад дзесяцігодзьдзямі казённага атэізму. У якасьці паўнавартаснай замены перадавыя ідэолягі прапанавалі атэістычна-матэрыялістычны сьветапогляд, дзе ўвогуле не разглядаецца пытаньне пра чалавечае ў чалавеку і сьцьвярджаецца, што кроў бязьвінна забітых — гэткая самая вадкасьць, як і іншая якая: ці то ахвяры Асьвенціму, ці то скаціна на разьніцы — усё адно згніе. Аднак такая ідэалёгія не магла кампэнсаваць ёю ж створаную сытуацыю бессэнсоўнасьці жыцьця асобнага чалавека. Праблема сьмерці мела два паралельныя вырашэньні. Першае — ліквідацыя ў чалавеку асобы, яе зьнікненьне ў таталітарнай масе, збыдленьне чалавека, то бок блякада й паслабленьне сыстэмы рэфлексіі й самасьвядомасьці; другое вырашэньне палягала ў фармаваньні спэцыфічнага, карыкатурнага й дыстыляванага камуністычнага культу памерлых, прычым культу гэтабочнага.

Нэкраноміка камунізму

Згадайма нядаўнюю гісторыю, часы казарменнага атэізму. На сьветлай-сьветлай плошчы, у сьветлым-сьветлым горадзе, сэрцы Радзімы Маскве, стаяў сьветлы-сьветлы Маўзалей. У ім ляжаў забальзамаваны сьветлы-сьветлы Правадыр, айцец-стваральнік Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу, Патрыярх У.І.Ульянаў-Ленін. Ён і зараз там ляжыць, у сэрцы Вялікай Расеі, нібыта зноўку праваслаўнай, нанава ахрышчанай, спадкаемніцы хрысьціянскай Бізантыі, толькі ляжыць там ужо ў новым статусе: бунтоўны дух, несупакоены прывід.
На трыбуне маўзалею жывыя патрыярхі партыі й дзяржавы прымалі парады, сьпінай адчуваючы прысутнасьць патрыярхаў-мерцьвякоў, тут жа побач замураваных у крамлёўскі мур.

Галоўным сымбалем веры ў тыя часы быў лёзунг, які сьцьвярджаў, што Ленін нават у забальзамаваным выглядзе жывейшы за ўсіх жывых. А Ленін быў адзіны з партыяй — КПБ і КПСС.
Дарэшты зьнішчыць у чалавеку веру ўва ўзаемазалежнасьць будзённага з трансцэндэнтным ня здолела нават савецкая ўлада. Намаганьнямі атэістаў-асьветнікаў ад мэханіцызму й вульгарнага марксізму ў Беларусі разьвіваўся дзіўны сынтэз архаічных кампанэнтаў сьветаўспрыманьня з устаноўкамі перадавой, як яна сама сябе вызначала, ідэалёгіі.
Атрымліваліся цікавыя эрзацы культу памерлых і тагабочных уяўленьняў, пры адсутнасьці самой, легалізаванай у грамадзтве казённага атэізму, сфэры тагабочнага.
Пасьля афіцыйнага скасаваньня Царства Божага і наагул усіх іншасьветаў нашыя мёртвыя зыходзілі, як у Вальгалу, у нейкую мітычную народную памяць і там нібыта жылі. Цалкам адмовіцца ад нават такога эрзацу жыцьця пасьля сьмерці не магла ніякая партыя, ніякая ідэалёгія. Чалавек, калі ўжо ён чалавек, ня можа не суадносіць сваё існаваньне з пазасьветным, трансцэндэнтным, і ўжо калі ёсьць розум па-над пачуцьцямі, дык і без ідэі звышпачуцьцёвага гома сапіенсам ніяк не абысьціся. Адсюль пайшла ў Беларусі традыцыя прычашчаць маладое пакаленьне калі не крывёй Хрыстовай, дык крывёй партызанскай.
Сучасны беларускі пэйзаж мае абавязковы элемэнт: постаць салдата ў плашч-палатцы, абэліск зь пяціканцовай зоркай-абярогам, проста надмагільны камень з надпісам. Беларусь скрозь застаўленая не аўтэнтычнымі паганскімі дамавінамі або хрысьціянскімі капліцамі, а менавіта салдацкімі абэліскамі. На першы погляд тут няма нічога экстраардынарнага, помнікі забітым на вайне ёсьць ува ўсім сьвеце, а Беларусь — поле бою другой сусьветнай, таму шматлікасьць салдацкіх абэліскаў не зьдзіўляе. Іншая справа, што ў беларускай культурнай прасторы яны набываюць своеасаблівы культурна-гістарычны кантэкст, падтэкст, калі хочаце. Ці багата ў Беларусі гэтага кшталту памятак з часоў першай сусьветнай вайны, ня кажучы ўжо пра ўсе папярэднія? Гэтыя нешматлікія мэмарыялы проста губляюцца сярод безьлічы абэліскаў другой сусьветнай.
Апошнія спачатку ўзводзіліся па-за рэлігійным кантэкстам, па-за сувязьзю з тагабочным, пасьмяротным, трансцэндэнтным.

Яны былі пакліканыя бесьперапынна актуалізаваць у народнай памяці афіцыйны варыянт гісторыі краю, то бок мелі ідэалягічна-канкрэтную функцыю. Абэліскі другой сусьветнай вайны — нібы жытло мёртвых герояў у народнай памяці, дакладней, уяўленьняў пра іх, бо самі гэтыя героі, пасьмяротна ўзнагароджаныя і ўсенародна ўшанаваныя рытуаламі ўскладаньня вянкоў і піянэрскімі салютамі, у поўнай адпаведнасьці з камуністычнай дактрынай пазбаўленыя душаў, даўно спарахнелі ў зямлі.
Жахлівая крыза трансцэндэнтнага, справакаваная сьвятым сьвятых камуністычнага вучэньня — атэізмам, для народных масаў сталася штуршком да ўсеагульнай згоды з прынцыпам „жывы сабака лепшы за мёртвага ільва“. Эрзац тагабочнага — народная памяць, а таксама эрзац культу памерлых — рытуалы, абэліскі й ганаровыя варты — павінны былі кампэнсаваць гэтую крызу. Больш таго, мёртвыя героі й ахвяры служылі добрую службу жывым правадыром. Не адышоўшы ў іншасьвет, не супакоіўшыся, яны памнажалі сабой натоўп, асноўнае апірышча рэжыму.

Нэкрамантыя гэтабочнага

Высокія ідэі людзкое салідарнасьці, ахвярнасьці, узаемадапамогі ўшанаваныя ў помніках як колішняй савецкай, так і сёньняшняй постсавецкай Беларусі на своеасаблівы камуністычны нэапаганскі кшталт. Нашыя мёртвыя, ахвяры фашызму, для нас усё яшчэ як тое паганскае наўё, чужынцы, іншаверцы, што загінулі ліхой сьмерцю й пастаўленыя вартаваць заклятыя скарбы. Толькі замест скарбаў — той самы прывід, прывід Савецкай Беларусі, ідэалягічны камуна-беларускі фантом.
Але вернемся ў Менск, на вуліцу Мельнікайтэ. Тое, што мэмарыял ахвярам Галакосту быў узьведзены акурат цяпер, а не пры камуністах, не ў перабудову, не ў часы Вячаслава Кебіча — не выпадковае супадзеньне. Сёньняшняму беларускаму рэжыму патрэбна кансалідаваць электарат, а яшчэ Эліяс Канэці, аналізуючы фэномэн кансалідацыі масы на прыкладзе фашыстоўскай Нямеччыны, адзначаў надзвычайную ролю памерлых.
Несупакоеныя ахвяры першай сусьветнай былі першай масавай

апорай Гітлера, здавалася б, прывіднай, але нэапаганская ідэалёгія Трэцяга Райху, ідэалёгія, збудаваная на перакручаных архетыпах кроўна-родавай, грамадава-племянной сьвядомасьці, ставіла памерлых у адзін шэраг з жывымі, рабіла іх рэальнай групай падтрымкі фюрэра.
Мерцьвяком надавалася сакральнае права дэлегаваць уладу харызматычнаму лідэру, што чараваў натоўп памяцьцю памерлых, якія нібыта ад свайго імя апраўдвалі й бласлаўлялі правадыра на княжаньне над жывымі. Памерлыя не ўспрымаліся масавай сьвядомасьцю як істоты зь іншага сьвету, іх несьмяротныя душы атаясамліваліся са сьмяротнымі целамі, спарахнелымі ў братніх магілах.
Мерцьвякі безыменныя, безаблічныя, дэпэрсаніфікаваныя, дакладна як на Мельнікайтэ, — вось ідэальная маса. Ад імя гэтай масы мерцьвякоў выступае аўтарытарная беларуская прапаганда кожны раз, калі пад выглядам антыфашысцкай ужываецца антызаходняя, антыэўрапейская, антыцывілізацыйная рыторыка. Вораг прыйшоў з Захаду, нашыя памерлыя, няхай сабе й габрэйскага паходжаньня, маўкліва прагнуць помсты: нішто не забытае, ніхто не забыты. Помнік ахвярам, што вярнуліся на месца расстрэлу, замацоўвае на беларускай зямлі прывід Трэцяга Райху, які на гістарычнай радзіме не забыты, але ўсё-ткі пахаваны й абясшкоджаны. Несупакоеныя памерлыя, як і ў савецкія часы, стаяць у адным шэрагу з жывымі. Нямыя мерцьвякі — вельмі зручная ідэалягічная карта нэасавецкай прапаганды, ідэальныя пэрсанажы постсавецкага міту пра Вялікую Савецкую Антыфашысцкую, а насамрэч — між радкоў чытай! — Антызаходнюю Беларусь, каб даць ім спачыць, дазволіць іх душам адысьці ў іншы сьвет. Сацыялістычны культ памерлых па-ранейшаму застаецца адным з падставовых прынцыпаў беларускага нэапаганства.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**
[image]

ANTONI ZAPAŁOTA

Antoni Zapałota

daktarant Kembryčžskaha ŭniversytetu. Drukujecca ŭpieršyniu.

„Litvanija“ ci Eŭropa?

Užo pačatki ciapierašniaha „lićvinizmu“ ŭ 1996-m šmat u kaho vyklikali supiarečlivaje ŭražańnie. Choć ad taho času „lićvinizm“ i raźviŭsia faktyčna ŭ admietnuju płyń nacyjanalnaje palityčnaje dumki, ale ahulnaje staŭleńnie da jaho mała źmianiłasia. Bo „lićvinizm“ jość, kaniečnie, calkam lahičnym praciaham „biełaruskaha adradžeńnia“ 1980–90-ch — naturalnaj ramantyčnaj reakcyjaj na peŭnyja parazy „biełaruskaj idei“ u „RB“. Ale nakolki adekvatnaj reakcyjaj?
Pro: na što prydatny „lićvinizm“?
„Lićvinizm“ moh, zdavałasia b, pretendavać na sapraŭdy kanstruktyŭnuju rolu — jak ruch za *ŭmacavańnie śviadomaści histaryčnaje pierajemnaści miž nasielnikaŭ ciapierašniaje „RB“*. Praktyčna, jon i paŭstaŭ jak adkaz na adnu hłybinnuju prablemu biełaruskaha nacyjanalnaha ruchu. Miarkuju, što maje racyju sp. Viktar Železny (no. 37 „Našaj Nivy“ 2000 hodu), jaki pisaŭ pra padstavovyja zahany prajektu biełaruskaj nacyjanalnaj kansalidacyi na hruncie etnahrafičnym. Pakolki kansalidacyja biełarusaŭ na etničnym hruncie prablematyčnaja, to „lićvinizm“, na dumku jaho prychilnikaŭ, moža stać surjoznaj bazaj hetaj kansalidacyi.

Zahannaść nacyjanalna-„etnahrafičnaha“ projektu vyjaŭlajecca najlepiej pry razhladzie dynamiki socyjademahrafičnaj sytuacyi ŭ Bielarusi, bo jana stałasia adnoj z najbujniejšych pieraškodaŭ biełaruskamu adradžeńniu apošniaje chvali. Reč u tym, što nacyjanalna-sacyjalnaja emancypacyja „etnahrafičnych biełarusaŭ“ faktyčna adbyłasia šlacham *savieckaj* madernizacyi. Takim čynam, „biełaruski prajekt“ u XX stahodździ raspadajecca na dźvie častki. Kali jaho raniejšy varyjant (1904–1944) byŭ aryjentavany na tahačasnaje

sialanskaje i rabotnickaje asiarodździe „tutejšych“, ščylna i śviadoma spałučajučy nacyjanalnuju ideju z sacyjalna-ekanamičnaj prahramaj u intaresach biadniejšych klasaŭ, to paźniej u hulniu ŭvajšli jakasna inšyja čyńniki. „Prosty lud“ dobra skiemiŭ: kab „ludźmi zvacca“, u hetaj krainie treba elementarna *говорить по-русски.* Hetak, u varunkach razhortvańnia savieckaj madernizacyi, biełaruščyna dla „prostaha ludu“ stałasia praktyčna prykmietaju nie nacyjanalnaj jednaści ŭ baraćbie z klasavymi vorahami

(„panami“), a ŭžo tolki prykmietaju sacyjalnaj adstałaści, nizkaha sacyjalnaha statusu.

U vyniku, kali ŭ krainach Centralnaj Eŭropy lozunh restaŭracyi dakamunistyčnaj histaryčnaj identyčnaści (restytucyja staroj ułasnaści ŭ tym liku) staŭsia taranam dla razbureńnia kamunistyčnaha režymu i ruchavikom „viartańnia ŭ Eŭropu“, to ŭ Biełarusi ničoha padobnaha nie adbyłosia: ahulnaja *„prastaludnaść“* biełaruskaha hramadztva zablakavała desavietyzacyju. Całkam lahična, što nacyjanalna-palityčny ruch apošniaje chvali mieŭ mała pryvabnych rysaŭ dla „prostaha ludu“ — prynamsi, ad taho momantu, jak lozunhi „raskułačvańnia“ namenklatury stracili aktualnaść. „Prosty lud“, jakomu pryščapili-taki aficyjnuju (pašpartnuju) nacyjanalnaść, pry hetym abaviazany svaim sacyjalnym statusam biespasiaredna savieckaj madernizacyi, i nia majučy daŭžejšaje histaryčnaje pamiaci, usprymaŭ novyja „mity“ nacyjanalnaj idejalohii (pra „polska-litoŭskich“ panoŭ i kniazioŭ, jakija raptam stalisia „našymi“) chiba što jak terminalahičnuju supiarečnaść. Nia dziva, što prajekt biełaruskaj nacyjanalnaj tojesnaści na padstavach falklorna-etničnych zastaŭsia małapryvabnym dla „prostych“ masaŭ u postsavieckich varunkach, bo aperuje sacyjalna niepryvabnymi, nizkaha statusu symbalami, i hetak jość małaprydatnym dla nacyjanalnaj kansalidacyi.

Adnak adychod ad viaršenstva etničnaha pryncypu ŭ struktury identyčnaści nia moža adbyvacca ŭ kirunku sastupak savietyzavana-*russkojazyčnoj* stychii (hetaj naturalnaj niebiaśpieki), pakolki ačyščeńnie ad nehatyŭnych nastupstvaŭ savietyzacyi jość nieabchodnaj umovaju adaptacyi Biełarusi da (zachodniaj) madernaści. Sproba pierafarmulavać strukturu nacyjanalnaj identyčnaści *akurat u aspekcie histaryčnaj śviadomaści* vyhladaje, na pieršy pohlad, najbolš naturalnaj reakcyjaj na kryzys „etnahrafizmu“. *„Lićvinizm“ u ideale maje pryščapić pašpartnym „biełarusam“ inšuju kulturnuju tradycyju, nośbitam jakoj u niadaŭniaj*

historyi była adukavanaja (zbolšaha polskamoŭnaja) elita krainy. Kali naščadki „tutejšaha“ „prostaha ludu“ akceptavali b, u tym liku, i „panskuju“ tradycyju, jak byccam svaju, to z tym nabyli b i peŭnuju histaryčnuju hodnaść, racyju histaryčnaha isnavańnia i prava va ŭłasnych vačoch — razam z palityčnymi i nacyjanalnymi pamknieńniami, da jakich taja tradycyja naturalna matyvuje.
Contra-I : na što „lićvinizm“ nie prydatny?
Ale spadziavańni, byccam ciapier „lićvinski“ recept, jak taki, moža stacca panacejaj dla losaŭ kraju, naŭrad ci spraŭdziacca. Papieršaje, „lićvinizm “ jak idealohija krajovaj kansalidacyi spaźniŭsia, musić, na stahodździe. Jon byŭ by vielmi darečy ŭ 1910-ch, kab tahačasnamu biełaruskamu ruchu nie adpałochvać panoŭ-kresaviakaŭ, kštałtu Vajniłoviča, adabrańniem ich majontku, sialanskaj revalucyjaj dy sialanskim sacyjalizmam, maŭlaŭ „chto nia prosty sielanin ci rabotnik, toj nie biełarus“. Padziei 1917–20 hadoŭ moža paviarnulisia b tady dla našaha kraju pa-inšamu. Ciapier ža majem całkam adroznuju sytuacyju i sacyjalny kantekst. Pa-druhoje, supiarečnaść niekalkich tradycyj moža abciažyć stvareńnie madernaj biełaruskaj nacyi. Ci na karyść ciapier było b adkopvać tyja histaryčnyja karani, pad jakimi pachavanaja iržavaja zbroja bratabojčych zvadaŭ? Nacyjanalnaja kansalidacyja na bazie supolnaj śviadomaści moža apynucca ŭ *supiarečnaści* z histaryčnaj tradycyjaj — nasupierak spadziavańniam, naprykład, niekatorych sympatykaŭ „lićvinizmu“.
Contra-II: čamu supiarečyć „lićvinizm“?
I najhałaŭniejšaja zaściaroha pierad „lićvinizmam“ palahaje ŭ tym, što *histaryčnaja* śviadomaść moža abiarnucca siońnia (a asabliva zaŭtra) hetak ža mała prydatnaj dla nacyjanalnaj kansalidacyi, jak i „falklorščyna “. Taja teza, nibyta histaryčnaja spadčyna staniecca čymści vielmi važnym dla nacyjanalnaj pryšłaści (a heta było dohmaj adradžeńnia 1980–1990-ch), nasamreč nie abaviazkova adpaviadaje sapraŭdnaści. Bo, adradžajučy Biełaruś, treba zvažać i na toje, jak i śviet vakoł jaje źmianiŭsia. Aksyjomaj ža musić być inšaje: Biełaruś maje šaniec vyrvacca ź ciomnaje bahny „Eŭrazii“ i postsavieckaj halečy tolki praz intehracyju z Eŭropaj. A kali tolki Biełaruś choča intehravacca ŭ Eŭropu, to akurat intehracyja z Eŭropaju i jość *pieršačarhovym žyćciovym intaresam* Biełarusi.

U siońniašniaj ža Eŭropie, „multykulturnaj“ i šmatrasavaj, elementy histaryčnaj i kulturnaj tradycyi adsunuty ŭžo na daloki margines

hramadzkaha žyćcia i palityčnaha dyskursu. Hulnia praciahvajecca, ale praviły źmianilisia. Zmahańnie za ŭładu i hiegiemoniju tryvaje — ale pieramiaściłasia z kryvavych paloŭ rycarskich bitvaŭ na hiperprastory finansavych rynkaŭ; kavaleryjskija švadrony zamienienyja, tak by mović, na karparacyi, a šlachieckija šabli — na „finansavyja instrumenty“. Hramadztva i palityka ŭ sučasnaj Eŭropie zasiarodžanyja pieradusim na pryncypach padvyšeńnia asabistaha dabrabytu, zachavańnia asabistych svabodaŭ i padtrymańnia najbieśpiačniejšych varunkaŭ žyćcia. Da taho ž, zachodnieeŭrapiejskija krainy nasieleny ciapier i miljonami roznakalarovaha žycharstva nieeŭrapiejskaha pachodžańnia, pryčym ich kolkaść padvyšajecca — razam z upływam na abličča ciapierašniaj Eŭropy.

Peŭna ž, kali Biełaruś była kaliści častkaju (staroje) Eŭropy, to musić być zdolna i stacca jaje častkaju iznoŭ. Tolki ž u histaryčnuju, chryścijanskuju i „ušlachietnionuju“ Eŭropu „viarnucca“ paprostu niemahčyma, bo takoj daŭno niama. Tezy ab „histaryčnaj jednaści“ z Eŭropaj mohuć i musiać zaachvočvać samich biełarusaŭ da postupu ŭ spravie eŭrapiejskaj intehracyi, ale naŭrad ci mohuć być važkimi arhumentami ŭ Eŭropie ci dla Eŭropy. Tam pahladziać pieradusim na biznesovyja mažlivaści, sumlennaść kamercyi, moc hramadzianskaj supolnaści i h.d. Toje, što chtości sprabuje iści napierad z tvaram, paviernutym nazad, možna zakidać „lićvinam“ amal hetaksama, jak toje zakidajecca našamu neasavieckamu režymu — choć jany byccam i imknucca jści ŭ roznyja baki.

Tut paŭstaje vidavočnaja prablema. Pakolki Biełaruś moža vyžyć jak admietnaja kraina, tolki intehravaŭšysia z Eŭropaj, to nam žyćciova nieabchodnaja kansalidacyja nacyjanalnaje voli na tryvałym padmurku — dziela rašučaha kroku ŭ sučasnaść. Ale kali etnahrafičny pryncyp zaśviedčyŭ svaju małuju prydatnaść dla nacyjanalnaj kansalidacyi ŭ postsavieckich varunkach, to *staŭka na historyju i „tradycyju“, naprykład, u versii „lićvinizmu“, vidavočna ŭtvaraje supiarečnaść (i čym dalej, tym bolšuju) z palityčnymi padstavami sučasnaje Eŭropy i Zachadu ŭvohule.*

Ścipłyja cnoty „lićvinizmu“

Kaniečnie, hetaja vidavočnaja supiarečnaść tryvaje tolki dakul „lićvinizm“ vykazvaje jakijaś nacyjanalna-palityčnyja ambicyi. „Lićvinizm“ zaniaŭ pazycyju vyrazna na marginesie ŭ biełaruskim nacyjanalnym ruchu, a tamu nie pavinien pretendavać na štości,

aproč roli ramantyčnaje plyni maładych biełaruskich adradžencaŭ. Najbolš karysnym „lićvinizm“ moža być dla krainy mienavita zastajučysia ŭ hetym svaim naturalnym asiarodździ — moładzieva-kulturnickim. Jon nia ŭ stanie adkazać na pytańnie, na jakim varta było b zasiarodzicca nacyjanalnamu ruchu: *jak* i *na što* možna zamianić etnahrafičnuju daminantu ŭ nacyjanalnaj idei — kali ani histaryčnaja, ani liberalna-postsavieckaja alternatyva nie prydatnyja ŭ spravie farmavańnia ŭ Biełarusi novaha eŭrapiejskaha hramadztva i dasiahnieńnia žyćciova važnych nacyjanalnych metaŭ. *Mienavita pytańnie, „što b skansalidavała ŭsie majučyja paŭstać u krainie sacyjalnyja klasy ŭ takuju nacyju“, i patrabuje praktyčnaha palityčnaha adkazu*.

Tymčasam škoda, jakaja moža spryčynicca krainie ad „lićvinizmu“, palahaje pieradusim u marnavańni času, resursaŭ i vysiłkaŭ zaanhažavanych u jaho aktyvistaŭ, a taksama ŭ błytaninie i padziełach, jakija praz heta, vierahodna, paŭstanuć. Najbolšym rasčaravańniem, jakoha mohuć dačakac rupliŭcy eŭrapejskaje „lićvinskaje tradycyi“ kraju, moža stacca momant, kali jany adnojčy pabačać, što chacia Biełaruś farmalna i dałučana da Eŭropy, ale ž naležyć jana ŭžo zusim nia im — u samym prostym sensie hetaha słova. Pabačać, što ź „lasoŭ i parkaŭ, svaich falvarkaŭ“ (jak śpiavaje Andrej Mielnikaŭ) ničoha nia viernuta, a tymčasam usim, što josć navokał na „lićvinskaj“ ziamli, u cełym i pa kavałkach daŭno ŭžo vałodaje aby-chto — tolki nie pierajemniki lićvinskaje tradycyi... Tady „kraina — naša“ zastaniecca chiba što znoŭ napisać na płocie; tady jany, musić, zaśpiavajuć nam novyja sumnyja pieśni.

Hałasuj za **ARCHE** :)
acani… 5 - fajna 4 - dobra 3 - tak sabie 2 - błaha 1 - …
br.by
[image]
[image]
Pačatak Naviny Forum Pošuk
Aŭtary Całkam Inšaje
№ 8 (13) – 2000
[image]da Źmiestu
[image]da Pačatku STARONKI
Redakcyja: **analityka@yahoo.com** Design **mk**, majstravańnie

Maksa Maskalova
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Pačatak" magazine
Apošniaje abnaŭleńnie: 13-01-2001
[image]

Сяргей Астраўцоў

СЯРГЕЙ АСТРАЎЦОЎ журналіст, празаік, жыве і працуе ў Горадні. Аўтар кнігі прозы „Цэнзарскія нажніцы“ (Горадня—Беласток, 1999).

Танк, Ленін і Ажэшка ЗЬ Міцкевічам. Аб трох гарадзкіх краявідах.

1. Беласток

Я стаяў на мосьце і глядзеў, як набліжаецца, праходзіць пада мной і зьнікае ў цемры цягнічок на Беласток. Па-за калючыя драты, у Эўропу, якая тады была схаваная для нас і недаступная. Цягнічок быў абцяты — адзін-два вагоны — і напаўпарожні. Часы трывалі нецікавыя, генсэкам быў Чарненка. Позьняя сьцюдзёная восень 1984-га. Я, як здавалася, выразна адчуваў прысмак славутага раману, хаця прачытаў яго значна пазьней. Тады, як ні дзіўна, хапала ўжо самой назвы. Маім міністэрствам праўды стала рэдакцыя з надзвычай напружанай, нэрвовай атмасфэрай. Заставалася адно ўвечары а шостай гадзіне, адразу пасьля рэдакцыйных сьценаў, пачакаць на мосьце замежнага цягніка. Ён хадзіў побач з нашым будынкам, усяго мэтраў за пятнаццаць-дваццаць. Але з майго першапавярховага вакна ня быў відзён, бо рэйкі ляжалі ў глыбокай цясьніне, пракапанай у пагорку.

Я стаяў на мосьце і не ўяўляў, каб трапіць па-за калючы дрот, з ночы ў дзень. Але дачакаўся-такі. Не адразу. Спачатку ў рукі траплялі выпадковыя паасобнікі беластоцкай „Нівы“, якую я чытаў у рэдакцыйнай шуфлядзе, каб не трапляла на чужыя вочы. Наіўная кансьпірацыя была абумоўлена сьвядомасьцю таго, што пасьля салідарніцкіх падзей газэта польскіх беларусаў трапіла ў сталіцы БССР у „спэцхран“. (У 1979-ым я ўпершыню ўбачыў яе ў чытальнай залі БДУ, быў уражаны й зачараваны моваю і вольным стылем публікацый, ейнай несавецкасьцю.) Налета памёр Чарненка, а — праўдападобна — у траўні ў нашай рэдакцыі нечакана зьявіўся Мікола Гайдук, тады намесьнік рэдактара той самай „Нівы“. Здаецца, беластачане прыехалі на машыне. Іх вельмі цікавілі розныя рэчы, якія ў пасьлявайсковастановішчнай Польшчы былі дэфіцытам. Напрыклад, млынок на каву, шуканы М.Гайдуком, зь якім мы якраз і пазнаёміліся. Млынкоў, зрэшты, не было і ў нашых крамах.

Увесну 1988-га распачалася моцная „адліга“. Беластоцкі цягнік раптам ператварыўся ў ланцуг вагонаў, перапоўненых пасажырамі. Быў атрыманы дазвол езьдзіць па запрашэньнях. На вакзале, на вуліцах і ў крамах запанавала польская гамонка. Назад цягнік вырушаў, перапоўнены „Рубінамі“ ды іншымі вялікімі каляровымі савецкімі тэлевізарамі. Палякі выграбалі ўсю электрапабытовую тэхніку, апроч хіба лядоўняў. Затым паехалі нашы. Масава. З пылазборнікамі, прасамі і дзіцячымі роварамі. Ад продажу тэлевізара на беластоцкім рынку можна было атрымаць несусьветныя грошы. Квітнелі, хто меў за калючым дротам сваякоў. Але сапраўды шалёна зарабілі тыя, хто з гандлю тэлевізарамі зрабіў бізнэс. Тады для гараджан стварылі чэргі, каб набыць які-небудзь „Гарызонт“. Адна зь невыгодаў памежнага гораду.
На пачатку таго халоднага ажыятажна-тэлевізарнага лета ў нашую рэдакцыю прыйшлі два запрашэньні зь беластоцкага, на сёньня задушанага канкурэнтамі, *Kurjera Podlaskiego*. Гэтая недзяржаўная газэта адзначала сваё 5-годзьдзе. О, прысмак свабоды! Жыцьцё ў цалкам эўрапейскім гатэлі, іншанесавецкая рэдакцыя, зусім не савецкая газэта. Разьняволеныя па-заходняму журналісты. На першай старонцы зьверху генэрал Ярузэльскі ў піначэцкіх акулярах, зьнізу — фігурыстая

нудыстка з пляжнага конкурсу прыгажосьці. Абеды ў рэстарацыі, дзе замест савецкага афіцыянта — вышкалены кельнэр. Азёрны шынок з паляўнічымі стравамі. Спэктакль тэатру А.Вянгеркі на вольным паветры — у скансэне. У летнім амфітэатры канцэрт польскіх зорак. Упершыню паездка ў Варшаву, бачаную датуль толькі з вокнаў вюнсдорфскага і бэрлінскага цягнікоў. Маршалкоўская! Нас шчодра прымалі, навіна — выдалі кішаньковыя! Дзякуй польскім калегам. Хаця, калі шчыра, *Kurjer* дзеля скандальнага попыту дапускаў абразьлівыя для мясцовых беларусаў дыскусіі. Падобныя, зрэшты, пачаліся потым і ў савецкіх газэтах.
Што яшчэ? Салодкасьць уласнага — першага разу ў жыцьці — маўленьня па-польску. Набытая на кірмашы кніжка Сакрата Яновіча ў польскім перакладзе. Знаёмства з самім пісьменьнікам, якога на адлегласьці я вельмі цаніў тады. Сам факт ягонага існаваньня па-за межамі беларускай савецкай літаратуры. Да ночы мы пілі ў ягонай кватэрцы гарбату. Я прывёз яму кнігі ад Дануты Бічэль-Загнетавай і Аляксея Карпюка. Падараная Яновічам з подпісам кніжка і выданьні з прысмакам небясьпечнасьці — эмігранцкія. Знаёмства ў рэдакцыі „Нівы“ з галоўным рэдактарам Віталём Лубай і Міхасём Хмялеўскім. Кілішак за сустрэчу ў рэдактарскім кабінэце. Госьці зь Беларусі тады для іх яшчэ былі рэдкасьцю. Доўгі напаўпусты зелянковы цягнік „Варшава—Беласток—Масква“. Доўгае чаканьне на мяжы, пакуль заменяць эўрапейскія колы на савецкія. Знарочысты грукат па даху вагона падкаваных памежніцкіх ботаў. „Калі ласка, назад за калючы дрот!“ А ў галаве вобразы Беластоку — высозная нейкая канструктывісцкая вежа касьцёла сьвятога Роха, зграбная ратуша пад дахоўкай, брук, іншыя старасьвецкія камяніцы, крамы, поўныя прысмакаў, якіх не было ў нас, кава розных гатункаў. Я вёз распушчальнай, вельмі гаркавай і смачнай, чэскага вырабу, і кітайскай гарбаты. Незвычайнай, як на нас тадышніх, абавязаных піць грузінскую, краснадарскую і азэрбайджанскую першага гатунку.

Да апошняга часу я наведваў Беласток гады ў рады, але кожнага разу адзначаў істотныя зьмены, поступ. Гэта пагатоў заўважна яшчэ, відавочна, і таму, што Горадня і Беласток амаль аднолькавыя паводле насельніцтва. Вельмі хутка з тамтэйшых

рынкаў зьніклі раскладанкі з крамнінай, якія апынуліся ў нас. Пераяжджаючы польскую мяжу, робішся адразу сьведкам росквіту бізнэсу. У кожнай вёсцы паўсюдна рэклямныя шчыты. Беласток імі ўвогуле перасычаны. Горадня з пункту гледжаньня вулічнай рэклямы — мёртвы горад, а дарога да мяжы — быццам глухменна-лясная. Апроч рынкаў, кідаюцца ў вочы велізарныя беластоцкія крамы-гуртоўні, усё новыя і новыя. Ня горад, а вялізны склад „каляніяльных“ тавараў. Беластачанам самім ніколі ня выпіць гэтулькі кавы і піва, не знасіць тых джынсаў і чаравікаў, скуранак і дублёнак. Беласток для Горадні — гандлёвая сталіца, як Вэнэцыя калісьці для ўсяе навакольнае Эўропы.

Мы застаемся побач у глыбокай правінцыі. За апошнія шэсьць гадоў мы затрыманы, вернуты ў савецкі час. Беластоцкае радыё даўно зрабілася 24-гадзінным, адчынілася рэгіянальная тэлестудыя, якая працуе цэлы дзень. У горадзе выходзяць штодня тры тоўстыя каляровыя газэты. Дзясяткі друкарняў і выдавецтваў, у якіх выдаюцца нават мастацкія альбомы найлепшай якасьці. Даўно існуе сымфанічны аркестар, які гастралюе ў Парыжах. У Беластоку жыве нямала пісьменьнікаў, у нас — адно паэты. А як мне падабаюцца напакаваныя да столі сапраўднай літаратурай, а ня „рэкамі крыві“, беластоцкія кнігарні!

Гарызантальнасьць Беластоку мяне супакойвае. Вуліца Ліпавая, Рынак Касьцюшкі. Стары горад сапраўды Стары. Без хрушчовак, настаўленых нахабна сярод камяніц. Камяніцы падкрэсьлена палепшаныя, а ня так, як у нас, дзе яны ператвораны ў шэрыя, безаблічныя, ніякія. Каб не адрозьніваліся ад мёртвай савецкай забудовы. Палац Браніцкіх — сапраўдны барочны палац — „падляскі Вэрсаль“, а ня наш Новы каралеўскі замак, перароблены звонку ў абкам, казарму. За посткамуністычны час у горадзе, бедным на помнікі, зьявіліся тры — Папу Рымскаму, Пілсудзкаму і замардаванаму спэцслужбамі ксяндзу Папялушку. У нас паставілі адну-адзіную галаву Міцкевіча. Дзякуючы беларускім палякам і варшаўскім гарадзкім уладам. Нашыя ўлады, прыняўшы рашэньне наконт помнікаў Каліноўскаму і Багдановічу, моўчкі адмовіліся яго выконваць. Паводле старажытнасьці, Магдэбургскага права, паводле былой каралеўскай значнасьці Горадня, безумоўна, пераўзыходзіць Беласток, у якім да таго ж няма ніякага Нёмана. Але звонку яна

даўно страціла сваю перавагу. Як цяперашнія беларускія грошы, зь якіх Шура Балаганаў выкінуў рыцара. Велізарны Ленін, зялёны танк на высокім пастамэнце, які сувора сустракае ўсіх, хто прыязджае з-за мяжы і які ўвесь час з павагаю фарбуюць нанова-назялёна плюс чырвоныя зоркі на баках. Ужо ў гады існаваньня РБ у горадзе стварылі цэлы савецкі бранятанкавы музэй. Беластоцкі танк, адзін-адзіны, ціхамірна стаіць у сквэры, размаляваны падлеткамі.
У роднай краіне ніхто ня мог якасна склеіць маю кнігу — 545 старонак, мае „Цэнзарскія нажніцы“. Каб яна не рассыпалася, давялося выдаць яе ў Беластоку. Цяжка вазіць праз калючыя драты, адзін паасобнік важыць ледзьве не кіляграм. Ёсьць у ёй і адно беластоцкае апавяданьне — „Пакой на дзьве асобы“, якое мае прысмак 1988 году.

2. Горадня

Упершыню Горадня паўстала ў маёй сьвядомасьці хвілёва, калі я вучыўся ў апошніх клясах прыбалтыйскай дзесяцігодкі. У школе раптам вывесілі чырвоны транспарант зь беларускім надпісам. Гэтак віталі настаўніцкую дэлегацыю гарадзенцаў. Брат аднаклясьніка паехаў вучыцца ў гарадзенскі мэдінстытут. Пазьней, толькі трапіўшы ў войска, я нечакана пасябраваў з гарадзенцам яфрэйтарам Рудневым, які быў ужо „дзедам“. Стоячы на варце, я чытаў на чырвоных цаглінах вайсковых складоў ягоныя надпісы *Grodno*. Мы зь ім слухалі „*Pink Floyd*“, які аднолькава багомілі, і часам пілі ў салдацкай чайной чорную каву з шакаладам. У астатнім нічога ідылічнага тады не было.
Сонечны летні дзень. Я стаяў каля вежаў з байніцамі Брыгіцкага касьцёла і дзівіўся: як такі горад маглі пакінуць беларусам, якія традыцыйна „нічога ня маюць“? Першае знаёмства з Горадняй. Велізарныя касьцёлы. Статуя Хрыста. Пешаходная вуліца, забудаваная старымі камяніцамі. Брук з кляймом яшчэ польскага магістрата. У кватэрцы ў двары Базыльянскага кляштара польскі фільм па тэлевізары. Узгадалася: сталічнікі любяць браць сюды камандзіроўкі, каб паглядзець у гатэлі варшаўскую тэлепраграму. Незабыўны новы прысмак. Пачуцьцё радасьці ў грудзях ад гораду.
Я заўжды марыў жыць у горадзе, у якім вялікая рака. Літаратурны музэй. Знаёмства з гаспадыняй — Данутай Бічэль-

Загнетавай. Ля ног — сабака Бонка пароды „колі“. Бюст Элізы Ажэшкі з польскага часу. У доме Ажэшкі ў пакоі з камінам піша на машынцы свае кнігі Аляксей Карпюк, якому вельмі не падабаецца, калі адцягваюць ягоную ўвагу ад друкаваньня. Крэсла Васіля Быкава ў рэдакцыі, і думкі: як ён тут вытрымліваў? Адкрыты пазьней пакой-музэй Зоф'і Налкоўскай. Бібліятэка імя акадэміка Карскага, які напісаў „Беларусаў“. І ўсё ж пісьменьнікі тут асабліва не жылі. Прыяжджаў да вайны Віткацы. Потым — Караткевіч, які запамінаў камяніцы, нават абмацваў муры, натхняўся. І які назваў горад аднойчы Кладнам. Назвай чэскага шахцёрскага, амаль учэцьвера меншага, места. Паэтка параўноўвала пісьменьніка з апосталамі, статуямі якіх быў аздоблены фасад езуіцкага касьцёла.

Мяне не пакідала зьдзіўленьне, што тут не пасяляюцца раманісты, Вальтэры Скоты. Я хадзіў паміж камяніц, спускаўся пад адзіным у краіне арачным мостам да Нёмана і зьдзіўляўся, што ў горадзе не нараджаліся празаікі. Зь першых амаль дзён я пачаў спрабаваць напісаць апавяданьне паводле гісторыі зьнішчанай Фары Вітаўта. У друкарні, у няўтульных пакойчыках „начной рэдакцыі“, паміж чытаньнем газэтных аркушоў, выдумляў на кавалках шэрай паперы сваю вэрсію. Апавяданьне канчаткова стала называцца „Фэрарскі мармур“. Позьняя сьцюдзёная восень і вельмі халодны сьнежань. Як мне тады здалося, мужчыны тут па-заходняму болей хадзілі пад капелюшамі, чымсьці па-сталічнаму — у вушанках. Яшчэ адно тадышняе ўражаньне: чырвоныя сьцягі на псэўдарускім праваслаўным саборы 7 лістапада. „Партыйна-гаспадарчы актыў“ у Сэнатарскай залі Новага замку. На браме — сьфінксы. Я вярнуўся тады ў рэдакцыю і напісаў невялікае апавяданьне, можа нават абразок, які не захаваўся.

Экзатычна чыталася на баках аўтобусаў назва канцавога прыпынку — Фолюш. Тамака мне потым пачаткова і давялося жыць.

Горад падзелены на дзьве часткі ракою. Заходняя — больш савецкая, без помнікаў, увогуле „спальная“, безаблічная. А Фолюш — старое ўрочышча за Нёманам. На рацэ Ласасянцы, якая плыве з Польшчы, разбураны млын. У мінулыя часы там стаяла сукнавальня. У 80-ыя гады Фолюш быў зграмаджаньнем вялікай колькасьці танкаў. Пазьней — месцам стварэньня 1-ай

Беларускай брыгады, якой, зрэшты, быў пакінуты савецкі парадкавы нумар. На Фолюшы ў мяне напісалася прынамсі адно апавяданьне — „Дождж“.

Іншасьць, несавецкасьць польскага тэлебачаньня. Яно ўжо тады паказвала нармальныя заходнія фільмы, а таксама агульнавядомы цяпер сэрыял „Сёгун“ і нудотную „Нявольніцу Ізаўру“, і яны былі вельмі папулярныя. Дарэчы, гарадзенцы адразу пачалі называць свае дзялкі „фазэндамі“. Памятаецца прэцэдэнт з „Апошнім танга ў Парыжы“, паказаным ноччу. На Варшаўскае ТБ паступілі абураныя лісты, што падобныя фільмы несумесныя з каталіцкасьцю палякаў. Але для мяне найбольшым задавальненьнем было глядзець „лісту пшэбояў“ — гіт-парад. „*Maanam*“ з Вольгай Яцкоўскай-„Корай“, „*Lady Pank*“ з Панасевічам і Барысевічам, „*Lombard*“ з Малгажатай Астроўскай, нарэшце, „*Kombi*“. Ах, якія зусім не замежныя прозьвішчы! Іхнія песьні мне падабаліся надзвычай. Дый хіба мне адному? Увесь горад быў сьпісаны гэтымі назвамі. Плюс некаторымі іншымі. Напрыклад, беластоцкім *Rezerwat*-ам. Праз некалькі гадоў побач з маім домам выступілі „*Lombard*“ — „*Droga pani z telewizji*“, „*Mam dosc!*“ і „*Lady Pank*“ — „*Mniej niz zero*“ і „*Zabic strach*“. Затым прыяжджаў яшчэ „*Kombi*“, які выканаў песьню, прысьвечаную быццам бы Горадні, выклікаўшы эўфарыю ў залі. „*Maanam*“ не прыехаў, але яго я люблю найболей дагэтуль. У балядах Коры сустракаюцца каты, якія мне таксама даспадобы. Кора — па-грэцку значыць „дзяўчына“, як звычайна тлумачыць яна сама, бо мае грэцкія карані.
Варта сказаць, што я ніколі стала ня жыў на ўсход ад Менску, а далей за Воршу ня езьдзіў. Я быў пазбаўлены традыцыйна моцнага ў нас уплыву расейскай літаратуры, а таксама і беларускай савецкай. Замест гэтага я набываў іншы культурна-эстэтычны досьвед праз польскае тэлебачаньне, радыё і газэты. Мне было малацікава, што робіцца ў Менску або Маскве. Мяне цікавілі варшаўскія навіны, беластоцкія. Я слухаў беларускую радыёпраграму зь Беластоку „Пад знакам Пагоні“, калі менскія газэты на Пагоню і беларускія сымбалі вылівалі свае жоўць і ваніты. Прарыў аблогі. Гастролі польскіх тэатраў. Спэктаклі на мове арыгіналу. Спачатку Славамір Мрожак. Паказ польскіх фільмаў безь перакладу ў новым занёманскім кінатэатры.

Богдана Парэмбскага, які, здаецца, потым экранізаваў у нас Караткевіча. Ягоная „*Polonia Restytuta*“ сваім часам зрабіла на мяне вельмі моцнае ўражаньне.
Рэдакцыя жыла іншым, не маім жыцьцём. У перапынку ўсе накіроўваліся ў навакольныя сталоўкі, каб па-сапраўднаму, з поўным наборам страў пад'есьці. Я ішоў туды, дзе можна было хуценька выпіць хоць якой-небудзь кавы. Астатні час бадзяўся па кнігарнях. Кніг цяпер зашмат, некаторыя мне не патрэбны. Але я не шкадую, што не купіў сабе лішніх чаравікаў альбо дэфіцытных джынсаў. Разгляданьне і купля кніг — гэта быў тады мой паратунак ад абагульненьня пад адным азначэньнем „рэдакцыйны калектыў“. Апавяданьні я таксама часта пісаў за рэдакцыйным сталом, замест нецікавых карэспандэнцый. З рэдакцыі можна было ўцячы ня толькі ў кнігарню. Часам я даходзіў да Станіславова (сёньня ў межах гораду), дзе захаваўся двухпавярховы каралеўскі палац, перад якім дзеля прыгажосьці паставілі бюсьцік нейкага Ціміразева ці то Мічурына. Амаль адразу мне трапілася кніжка Дына Буцаты. Канечне, ён працаваў у „*Corriere della Sera*“, але я імкнуўся адчуць падабенства. Асабліва калі прачытаў ягоны раман „*Il deserto dei Tartari*“. Тамтэйшая крэпасьць і мая рэдакцыя былі падобныя.
Існавалі таксама іншыя магчымасьці ўцёкаў. Ліставаньне з Дубаўцом. Ён сядзеў у такой жа рэдакцыі, але наўскасяк краіны — у Гомелі. Мы спрабавалі па абзацы пісаць супольнае апавяданьне, карыстаючыся з паслугаў пошты. А часам дамаўляліся на сустрэчу раніцай у Вільні. Ішлі ў Стары горад, праходзілі пад Вострай Брамай, пілі каву, зьядалі традыцыйныя сасіскі і ехалі на ўскраіну да Зоські Верас. Значна пазьней пачала выходзіць „Пагоня“, і мне давялося яе рэдагаваць. Але не было адметнай канцэпцыі выданьня і журналісцкіх сілаў. Восем гадоў таму ў сталіцы мы сядзелі з Дубаўцом і прыдумлялі гэтую самую канцэпцыю. Ён прапанаваў зрабіць газэту рэгіянальным аглядам „Вільня—Горадня—Беласток“, забясьпечыў здымкамі з партфэлю „Нашай Нівы“ і напачатку нават быў прадстаўніком „Пагоні“ ў Вільні. Цікавы, але кароткі час. Ён прыяжджаў у Горадню, мы пілі каву. Дамаўляліся сустрэцца „на паўдарозе“ ў нашым Парэччы, якое тады яшчэ было станцыяй „літоўскай чыгункі“, і абмеркаваць газэтныя справы на возеры. Ах, якое возера! Не атрымалася. Там цяпер

памежная зона ўвогуле.
За Нёманам я пажыў мала. Атабарыўся потым надоўга на вуліцы генэрала Дамброўскага. Маленькая цесная кватэрка. Поле, лес і Крэйдавыя горы — урочышча, Нёман. Літаратары звычайна жывуць тут, ува ўсходняй частцы гораду. І Быкаў жыў калісьці, і Карпюк. З Карпюком рэальна ў мяне адбылася толькі адна-адзіная размова. Побач з нашай самай вялікай кнігарняй, улетку. У яго ў руцэ была сетка з прадуктамі. Ён нечакана загаварыў да мяне сам, сказаў, што чытаў мае апавяданьні, што яны яго зацікавілі і што ён мне жадае плёну. А неўзабаве ён памёр. Так і застаўся бяз подпісу ягоны двухтамовік, набыты мною... Я ўсьвядоміў, што ён перадаў мне правы быць пісьменьнікам гэтага гораду.
Жыву сёньня побач з Гарадніцай, пабудаванай калісьці каралеўскім старостам Антоніем Тызэнгаўзам. Непадалёк ад месца, дзе стаяла карчма „Галеча“. На адной вулічцы з помнікам Элізе Ажэшцы, які я памылкова назваў у сваіх „Цэнзарскіх нажніцах“ бронзавым. Я нідзе гэтак доўга ня жыў, як у Горадні. Апошнія 16 гадоў я хаджу па яе вуліцах. Пра іх я напісаў „Старамесцкія апавяданьні“.

3. Менск
Калісьці мне вельмі падабаўся Мінск, які ніхто тады бадай не наважыўся б называць Менскам. Альбо не дадумаўся б. Падабаўся па-сталічнаму і па-хатняму. Як не магла б падабацца мне чужая Масква, якой трызьнілі да апошняга часу мільёны беларусаў. Менску я ўжо не цярплю даўно, ён стаў для мяне ўвасабленьнем савецкага гораду, Масквою меншага памеру. А некалі быў двума дамамі-вежамі, „вакзальнай брамай“ зь вельмі вялікай цукеркі-„Камунаркі“. Файным цыркам, дзе ў перапынках прадаваўся *sladoled*, „салодкі лёд“, як прапанавала ў 20-ых сталічная тэрміналягічная камісія. Ня ведаючы наперад, што сёньня беларускія пісьменьнікі будуць ужываць расейскае або ўкраінскае слова, часам — польскае. Чэская *zmrzlina* пакуль у беларускую мову ня трапіла. Так і не палюбілі нічога свайго. Лёды я таксама не люблю, як любіў у маленстве. Насупраць турмы, праз вуліцу, я аднойчы якраз і нарадзіўся ў нашай тады яшчэ даволі ўтульнай сталіцы І зьезду РСДРП. Днямі быў у Менску. Вечар, ліхтары гараць, рух машын. Каля Чырвонага касьцёла. Падумалася яшчэ раз: ня можа вялікі

горад, на галоўным пляцы якога стаіць вялікі каталіцкі храм, а ня псэўдамаскоўскія цыбуліны, быць не эўрапейскім, заставацца па-за Эўропай.. Але застаецца, прынамсі ўпарта вешае сабе на грудзі шыльду гораду губэрнскага. Спыняю сябе на думцы, што нецікава мне пісаць пра горад, які застаўся для мяне ззаду, у архіве. Хай сабе і родны, які падабаўся вакзальным пляцам, Домам ураду, стадыёнам, прафсаюзнымі калёнамі, цыркам, Круглай плошчай. Але, бадай, найболей — менавіта Чырвоным касьцёлам. Думаецца, што ён гэтаксама падабаўся і нашым Машэравым, інакш не захаваўся б. Сваёй гонкасьцю і зграбнасьцю падабаўся. Эстэтычным выглядам, сваёй эўрапейскасьцю. Дынаміт бо ўжо падрыхтавалі. Нашую ж Фару Вітаўта родная савецкая ўлада не пашкадавала. Як на мяне, і сёньня Чырвоны — самы зграбны паміж менскіх пабудоў.

Мяне цягнула ў Менск, куды я прыяжджаў спачатку з захаду, потым з поўначы, „Чайкай“. Вабілі праспэкты і музыка „Песьняроў“. „Дом грампласьцінкі“. Шмат агнёў увечары. Што там магло падабацца? Трубачкі з крэмам, торт „Менскі“ з грыбкамі і гарою земляных арэхаў, цана якога не зьмянялася гадоў дваццаць пяць? У маіх апавяданьнях няма такога гораду. Сустракаецца часам толькі назва „Горад-Герой“. Горад, які не выклікае практычна ніякіх эмоцый, пачуцьцяў. Моцных. Часам — абыякавасьць. Альбо нават лёгкую раздражнёнасьць. Стаміўся ад яго, палюбіў іншы. Зьмяніў. Гэтак, як зьмяняюць краіну. Хаця зь ім зьвязана шмат добрага. Напрыклад, тут была набыта машынка, каб друкаваць тэксты. Тутака пачала зьбірацца мая хатняя бібліятэка. У Серабранцы, якую я не цярпеў. Давялося пажыць непадалёк ад дому, дзе пазьней жыў Арлоў. І дзе калісьці быў модны дыска-бар „Купалінка“. Мой вайсковы прыяцель сэржант Уласенка выпісваў нам паперкі на звальненьне, і мы ўдвох зь ім ехалі праз увесь горад на Серабранку. Пілі каву, спрабавалі пісаць кінасцэнар і раз-другі танчылі ў купе з астатнімі наведнікамі. Сярод публікі, апроч нас, з пагонамі нікога болей не было. Мы зь ім штосьці пачыналі пісаць, у казарме, газэту выпусьцілі, якая не спадабалася моцна нашаму Богдану-камузводу — сарваў са сьцяны. Але чым не спадабалася, ужо ня памятаю. У войску пачаў я чытаць паважную літаратуру. Займаўся англійскай, бо думаў пра моўны інстытут. Пачаў друкавацца ў армейскай

газэтцы, пайшоў на журфак.
Павучыўся крыху, адчуў смак да антычнай літаратуры, дзякуючы Лапідусу. Неўзабаве са свайго войска амаль адначасова прыйшлі Гермянчук з Дубаўцом. Год 1981. Маўленьне па-беларуску. Кніжкі з прысмакам забароненасьці. Альбо фатакопіі. „Калосьсе“, „Лябірынты“, Калубовіч, „Люстрадзён“. Філярмонія, камэрная і арганная музыка. Радзей — тэатар. Кінатэатар „Навіны дня“, пра які ўжо забылі. „І ўсё-ткі я веру...“ і гэтак далей. Таркоўскі. Вялікае ўражаньне ад паказу заходненямецкіх фільмаў з сынхронным перакладам. „Зьняважаная годнасьць Катарыны Блюм“, „Шкляная клетка“... Канцэрты. „Арсэнал“, „Машына часу“. Праца ў заводзкай шматтыражцы на адзін заробак з Герменчуком. Публікацыі ў „ЛіМе“ і „Голасе Радзімы“. Суботнік у Траецкім. Кнігарня „Вянок“. Вялікі макет унівэрсытэцкага гарадка: „Сам таварыш Машэраў падбаў“, хаця таго ўжо не было на сьвеце. Месца, здаецца, дагэтуль не забудавана — на праспэкце Скарыны насупраць „Усходу“. Жыцьцё на Каліноўскага і Ракасоўскага. Перакапаныя маркшэйдэрамі вуліцы.
Вайсковая катэдра, вывучэньне схільнасьцяў натаўскай ваеншчыны. Падрыхтоўка да ролі гарматнага мяса. Настаўнікі тлумачылі: мотастралковага ўзводу, якім кожны з нас павінен будзе некалі камандаваць, павінна хапаць, згодна з савецкімі нормамі, на 15 ці 20 хвілін атакі. Пры канцы ўсяго — вайсковыя зборы і падрыхтаваны мною па іх выніках альманах вайсковае творчасьці „Набойні“.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 16-01-2001
[image]

Алесь Аркуш

Аскепкі вялікага малюнку

АЛЕСЬ АРКУШ журналіст і літаратар з Полацку. Арганізатар рэгіянальнага літаратурнага жыцьця, выдавец часопіса „Калосьсе". Апошняя кніга — зборнік эсэ, артыкулаў, гутарак і інтэрвію „Выпрабаваньне развоем" („Бібліятэка Калосься", 2000).

Калі Ігар Бабкоў пасьля першага майго дня ў сталіцы Францыі запытаўся: як Парыж? — я, не міргнуўшы вокам, адказаў: фігня, капіталістычны прымітыў. Полі Вэрлены ды Мадыльяні на вуліцах не сустракаліся, Гіёмы Апалінэры ды Пабліы Пікасы ў кавярнях кавы не пілі, а ля гранітнага ўзьбярэжжа Сэны ніхто не зачытваўся раманамі Камю ды Сартра. Гэта раздражняла. Якая ж пасьля гэтага Парыж культурная сталіца Эўропы! Бабкоў, відавочна, палічыў, што я „клею гарбатаго“. Я, далібог, быў шчыры.

Гэтак жа можа здарыцца, калі вы ўпершыню прыедзеце ў Полацак. Неаднойчы чуў у ягоны адрас: правінцыя, глухамань, дзірка, балота, дзіч… Нават калі вы заканспэктуеце кнігу Ўладзімера Арлова „Таямніцы полацкай гісторыі“ і вывучыце на памяць верш Рыгора Барадуліна „Полацкі мэнталітэт“, ніякай гарантыі мець ня будзеце. Ну, пабачыце Сафійку, заўважыце ў расповедзе экскурсавода прыкрыя гістарычныя хібы, дакранецеся рукой да „мацерыковых“ радоў плінфы, праслухаеце паўгадзінны арганны канцэрт, сфатаграфуецеся на тле Барысавага каменя; ну, укленчыце ля ра́кі з мошчамі сьвятой Эўфрасіньні Полацкай, складзеце ў Спаскай царкве малітву за беларускі народ, а калі пашанцуе, прыкладзецеся

вуснамі да дубліката Крыжа Эўфрасіньні, які вырабіў наш сучасьнік Мікола Кузьміч; ну, паблукаеце ўздоўж парослых хмызьняком дзьвінскіх берагоў, зноў-такі, калі пашанцуе, знойдзеце „барацінку“; ну, наведаеце сем полацкіх музэяў, у музэі беларускага кнігадрукаваньня пабачыце арыгіналы кніг Вацлава Ластоўскага, таго, які напісаў пра Полацак легендарныя „Лябірынты“ — тэкст-шыфр, тэкст-напамін, тэкст-запавет; ну, патрапіце на чарговы турнір рыцараў з клюбу „Жалезны воўк“; ну, наведаеце ўніяцкую царкву сьвятой Параскевы Полацкай, пабачыце там абраз сьвятога Язафата Кунцэвіча, які зрабіў для палачанаў Алесь Пушкін, даведаецеся, што храм у сярэдзіне 90-ых збудаваў за пару гадоў айцец Бэнэдыкт, якога неўзабаве пасьля Полацку, у трыццацігадовым веку, прызначылі генэралам манаскага ордэну студытаў; ну, наведаеце касьцёл сьвятога Андрэя Баболі і даведаецеся, што мошчы сьвятога Андрэя раней захоўваліся ў Полацку, а цяпер іх трымаюць езуіты ў Варшаве (калі я хацеў летась сустрэцца з пробашчам санктуарыя сьвятога Анджэя Баболі ў Варшаве і прадставіўся сакратарцы журналістам з Полацку, дык мяне старанна пазьбягалі ўсе тры дні, пакуль я дамагаўся аўдыенцыі ў варшаўскіх езуітаў); ну, пабачыце рэшткі бэрнардынскага касьцёла сьвятой Ганны, заглянеце за плот псыхіятрычнай лякарні, якая месьціцца ў жылых карпусах былога кляштара бэрнардынаў; ну...
І што з таго, калі вы ўсё гэта пабачыце-пачуеце-дазнаецеся? Калі вы не гатовыя зразумець Полацак, наўрад ці вас крануць турыстычныя славутасьці старажытнага гораду на Дзьвіне.

Паэт-пчаляр з Пружаншчыны Мікола Папека наведаў Полацак упершыню сёлета ў красавіку, прыехаўшы атрымаць літаратурную прэмію Таварыства Вольных Літаратараў „Гліняны Вялес“ за лепшую мастацкую кнігу году. Вядома, я, як гаспадар, мусіў паказаць шаноўнаму госьцю легендарныя мясьціны. Пасьнедаўшы, мы выправіліся пешшу да Сафійскага сабору. Ішлі ўздоўж берага Палаты да пешаходнага мастка праз рачулку, затым нетаропка, аглядаючы прыгожыя краявіды, падняліся на ўзгорак да Сафійкі. Найперш падышлі да Барысавага каменя. Валун са старажытнымі надпісамі Папеку ўразіў надзвычайна. Паэт старанна, на зрок і навобмацак,

вывучаў камень, як селянін каня на кірмашы. Саму Сафійку ён аглядаў без энтузіязму — вядома, паганец. Затое камень увесь час не выходзіў у яго з галавы. Блукаючы са мною па вулках веснавога гораду, мераючы ручаіны сваімі чаравікамі, ён доўга тлумачыў мне, што калі валуну не зрабіць дашка, хаця б якой стрэшкі, каб ратаваць ад вады, дык ён загіне. Лепш, казаў ён, зрабіць над каменем якое-кольвечы збудаваньне, што дазволіла б падтрымоўваць вакол помніка прыроды і культуры стабільны тэмпэратурны рэжым. Вада, мароз, сонца, вільгаць скарачаюць жыцьцё каменя.
А што тады казаць пра нас, сьмяротных?

Кожны з далучаных да беларушчыны хоча пабачыць у Полацку нешта сваё, добра вядомае, зразумелае і чаканае. Знайсьці ілюстрацыі да ўласнага ўяўленьня аб зыходным, аб пачатку. Нехта называе горад сталіцай Крывіі, нехта калыскай беларускага ўніяцтва, нехта, згадваючы „прывілей“ Усяслава Чарадзея, — апошнім прытулкам паганства, нехта — галоўным месцам паломніцтва для беларусаў, маючы на ўвазе месца спачыну патронкі Беларусі, сьвятой Эўфрасіньні, нехта — сталіцаю беларускага духу, легендаў, мітаў і эзатэрыкі.

Паэт Юры Гумянюк шмат разоў быў у Полацку, але ўдвух паблукаць па горадзе нам давялося толькі сёлета ў жніўні. Я вырашыў паказаць яму, шчыраму гарадзенскаму каталіку, касьцёл, які ў сярэдзіне 90-ых паўстаў у Задзьвіньні на месцы кінатэатру „Юбілейны“. Будынак кінатэатру быў перабудаваны ў храм божы. Перш чым патрапіць у сярэдзіну касьцёла, я запытаўся ў гаспадароў дазволу. Малады ксёндз Чайкоўскі папярэдзіў, што ў сьвятыні ідзе прыборка, таму аглядаць яе будзе не зусім зручна — шмат пылу. Мы ўсё адно зайшлі. Днём тут нешта рабілі будаўнікі, а цяпер жанчыны прыбіралі друз. Вечаровыя промні, што ўрываліся ў храм праз вокны з заходняга боку, пераліваліся ў стаўпах пылу. Мы ўважліва агледзелі чатыры фрэскі, што нядаўна скончыў маляваць Уладзімер Кандрусевіч, сын вядомага кампазытара. Я сам бачыў гэтыя працы ўпершыню. Па шчырасьці, яны ня вельмі мяне ўразілі. Засучасныя, нібыта проста вялікія карціны на рэлігійную тэматыку. У іх адсутнічае нейкае сымбалічнае

абагульненьне, нейкая хрэстаматыйная мэтафарычнасьць, якую заўжды заўважаеш у старажытных фрэсках. Праўда, я магу й памыляцца. Магчыма, празь нейкі час гэтыя фрэскі будуць сярод галоўных славутасьцяў Полацку. Чаму не? Інакш не было б разьвіцьця. Людзі нечага б дасягнулі, а далей — сьцяна. Але немагчымага не бывае. Усё магчыма. Галоўнае — імкнуцца, верыць і ўпарта працаваць.
Затым, для кантрасту, я паказаў Гуменюку рэшткі бэрнардынскага касьцёла, што ў поўным занядбаньні ўсё яшчэ глядзяць на сьвет божы ля плоту псыхіятрычнай лякарні. Гумянюк прапанаваў сфатаграфаваць яго на тле тых руінаў, але раптам з розных кутоў выскачылі тры дварнякі і так агрэсыўна пачалі на нас брахаць, што мы хутка рэтыраваліся.
За вячэраю Юры дзяліўся ўражаньнямі. Больш за ўсё яго зьдзівіла тое, што ў Полацку ня носяць модных мужчынскіх туфляў з тупымі насамі. „У Горадні моладзь толькі ў такіх і ходзіць“, — патлумачыў паэт-постмадэрніст, аўтар незабыўнага верша „Я камуністам шлю вітаньне“.
Гумянюк уяўляе Полацак іншым: з матэлямі, шыкоўнымі кавярнямі, прыгожымі, вясёлымі жыхарамі, нэонавай рэклямаю, мадэрновымі будынкамі са шкла і бэтону. „Там процьма людзей, самаходаў і супэрсучасны дызайн (…) А тут — беларускі камбайн.“ Неадпаведнасьць, так бы мовіць, уяўленьню-жаданьню.

Усе мае ўражаньні ад Полацку — як аскепкі нейкага вялікага малюнку, можна разглядзець толькі фрагмэнты, кавалачкі, якіх шмат-шмат — дзясяткі, сотні, тысячы, — бывае, самы дробны і нязначны трывала кружляе ў мазгох. А нешта гістарычнае прыходзіцца зь цяжкасьцю прыгадваць-узнаўляць.
Тры гады таму на Дзяды позна ўвечары, калі людзі павярталіся з працы, я езьдзіў з уніятамі да крыжа ў Бельчыцы. Гэты вялікі мэталёвы крыж уніяты ўсталявалі на месцы масавых забойстваў палачан у часы сталінскага тэрору. У кожнай беларускай мясьціны ёсьць свае Курапаты. Было халодна, ішоў дробны дождж. Сьвечкі ўвесь час задзьмухваў моцны вецер. Традыцыйна, напрыканцы набажэнства, супольна прачыталі малітву за беларускі народ. У Бельчыцы нас прывёз на ўніяцкім аўтобусіку Мікола Шарах, старшыня полацкай грэка-каталіцкай

суполкі. Мне закарцела адведаць нейкую канкрэтную магілу. Да каго? Пачаў узгадваць. Ё-маё, нават магіл не засталося ў спадчыну. Адзінае, што згадаў, — Янка Журба, пахаваны на Ксавэраўскіх могілках. Едзем на Ксавэрыю. Міхась Баўтовіч пры сьвятле месяца хутка адшукаў патрэбную магілу. Запалілі й паставілі ля пліты з імем сьвечку. Прачыталі малітву. Сьвечка, на дзіва, ня гасла — здаецца, ужо не гарыць, але празь нейкі міг агеньчык зноў бярэцца на поўную сілу... Гэты позьні вечар на могілках помніцца выразна.
Іван Івашын выбраў сабе пакутны псэўданім і, як таго патрабуе клясычны беларускі лёс, зьведаў шмат журботных хвілінаў, асабліва пры бальшавікох. Апошнія свае гады ён дажываў у Полацку сьляпым і ў страшэннай галечы. У Саюзе пісьменьнікаў пра Журбу згадалі напярэдадні яго 80-годзьдзя. Вырашылі павіншаваць дзядзьку Янку. Прадстаўнічая пісьменьніцкая дэлегацыя прыляцела самалётам у Полацак (падзеі адбываліся ў сакавіку 1961 году). Урачыстасьць, аднак, прыйшлося адмяніць. Журба за колькі дзён да юбілею моцна абпаліў сабе твар керагазам, ляжаў у больніцы. Пісьменьнікі гэтым жа рэйсам адляцелі назад у сталіцу.

Уладзімер Арлоў у кнізе „Таямніцы полацкай гісторыі“ некалькі старонак адвёў пад расповед пра лёс полацкага ўніяцкага мітрапаліта Фларыяна Грабніцкага. Менавіта дзякуючы яго клопату ў 1750 годзе быў адбудаваны Сафійскі сабор (пасьля таго як храм у 1710 годзе ўзарвалі расейцы), праўда, адбудаваны ён быў у іншым выглядзе — у стылі віленскага барока. Але толькі за аднаўленьне галоўнай полацкай бажніцы палачане мусілі б шанаваць імя Грабніцкага. Памяць жа аб ім у Полацку вельмі хутка зьнікла, адразу ж па ліквідацыі ў Беларусі Уніі. Прычым у ХХ стагодзьдзі лёс двойчы вяртаў магілу Грабніцкага палачанам. Пра першы выпадак падрабязна напісана ў арлоўскай кнізе. У 1913 годзе прах мітрапаліта быў знойдзены ў сьцяне царквы сьвятой Сафіі. Усё, што было каштоўнага ў пахаваньні высокай духоўнай асобы, камісія, створаная з нагоды гэтага выпадку на чале з гісторыкам Аляксеем Сапуновым, забрала, а прах вярнула на ранейшае месца. Другі раз на парэшткі Грабніцкага натрапілі ў 1972 годзе — будаўнікі мацавалі ў храме батарэі ацяпленьня.

(Пра гэтую гісторыю Арлоў чамусьці не напісаў у „Таямніцах“.) Прах мітрапаліта зноў патурбавалі. Гэтым разам Грабніцкага ніхто не зьбіраўся вяртаць у сьцяну царквы, якую ён жа й пабудаваў. Чалавека проста выкінулі з уласнага дому. Тое, што ўяўляла хоць нейкую каштоўнасьць, напрыклад, рэшткі мантыі і частку праху (напрыклад, фалянгі ў пальчатках), забралі ў фонд краязнаўчага музэю, а вялікія косткі закапалі ў зямлю. Хто закапаў і дзе, я даведацца ня здолеў. Можа хто і ведае, пэўна ж — ведае, але не прызнаецца. Я ж дачуўся пра іншае: сёньняшнія полацкія ўніяты, гадоў пяць таму, забралі з фондаў Полацкага музэю-запаведніка ўсё тое, што засталося ад праху мітрапаліта Грабніцкага. Як паўнаўладныя спадкаемцы. Цяпер рэліквія захоўваецца ў царкве сьвятой Параскевы Полацкай. Уніяты сьцьвярджаюць, што прыйдзе час, і мітрапаліт вернецца ў Сафійскі храм.
Паспрабуйце ўявіць які-небудзь больш-менш значны польскі касьцёл без мэмарыяльных плітаў і магілаў вядомых палякаў. Уявіць цяжка. Да чаго падобны Сафійскі сабор бяз гэтых лёсаў-рысак на скрыжалях айчыннай гісторыі? Абрабаваны храм!

Часта перачытваю разьдзел „Полацак“ з кнігі Яна Баршчэўскага „Шляхціц Завальня“, якую пераклаў з польскай Мікола Хаўстовіч. Пачатак памятаю, як верш: „Мінаю пушчы і вось на шырокай раўніне бачу горад Полацак. Званы сьв. Стафана, на замкавай гары — царква сьв. Сафіі, якія, стоячы ў тумане, здаецца, імкнуцца да воблакаў; іх постаці-веліканы пануюць над горадам і над усёй ваколіцай…“ Рэдагуючы рукапіс, выдавец кнігі Рамуальд Падбярэскі ня вытрымаў і дапісаў: „Калі выпраўляў карэктуру гэтага аркуша, міжволі апанавалі мяне пачуцьці. Думкі мае, акрыленыя ўспамінамі, імчаць да празрыстых вод Палаты. Памятаю грандыёзныя купалы гораду, які магу назваць родным; сьціплую дахоўку сьвятога для мяне будынка (езуіцкага калегіюму. — **А.А.**), яго доўгія калідоры і прыцемак сьвечак у вялікім касьцёле…“
Каб так палюбіць Полацак, не абавязкова быць сэнтымэнтальным.

Маё ўлюбёнае месца для шпацыраў — поплаў ля Палаты, якая абгінае ніжні і верхні замкі. Мне здаецца, што я беспамылкова

магу пазнаць, дзе раней стаялі млыны на рэчцы, дзе былі масткі ў горад. Тут неверагодна маляўнічыя краявіды, зь нейкай боскай ціхай прыгажосьцю. Можна залезьці ў раку, каб адчуць босымі нагамі яе спрыт і энэргію. Вада ў Палаце бяжыць хутка, нават цяжка трымаць раўнавагу. Нахіляешся і дастаеш з вады цагліну — клясычная плінфа, з такіх цаглінаў будавалі ў Полацку ў X–XIII стст. Шкада выкідаць — панясу дамоў, падару каму-небудзь з гасьцей. (Вітаўту Чаропку было дазволена на маім гаўбцы выбраць любую — спыніўся на самай вялікай, ледзь улезла ў партфэль. Задаволены, павёз цагліну ў Менск — часьцінку сапраўднага Полацку.)

На мінулым тыдні ў госьці завіталі Пятро Васючэнка зь сямейнікамі — Пятро прыехаў на гадавіны па бацьку. Яго жонка, археоляг Ніна Здановіч, бадай, лепшы спэцыяліст па беларускай кераміцы і кафлі, неаднойчы дасьледавала Полацак. Паказаў ёй свае знаходкі. Сярод рознага „мэталалому“ чаго яна толькі не ідэнтыфікавала. Але найбольш мяне ўразіла „апазнаньне“ маёй апошняй знаходкі — Ніна ўзяла ў рукі чарговую жалезіну і кажа: „А вось гэта звычайная шпора, прычым старая, як мінімум стагодзьдзе дванаццатае-трынаццатае“. Прызнацца, калі я яе знайшоў, амаль ля самага майго пад’езду, побач са школьным футбольным полем, я падумаў, што гэта нейкі кочат. Але ўсё адно забраў дахаты. Гэтую жалезку да мяне, напэўна, бачылі дзясяткі людзей.
Гэтак жа няпроста ўбачыць Полацак.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 16-01-2001
[image]

Юры Андруховіч

Малая інтымная урбаністыка

ЮРЫ АНДРУХОВІЧ лідэр новае ўкраінскае літаратуры, аўтар трох паэтычных зборнікаў і трох раманаў, укладальнік некалькіх анталёгій сучаснае ўкраінскае літаратуры. Аглядальнік аддзелу культуры газэты „День“. Жыве ў Івана-Франкоўску. Апошняя кніга — зборнік эсэ „Дэзарыентацыя на мясцовасьці“ (Лілея-НВ, 2000). Эсэ друкуецца з ласкавага

1.

Любая сучасная мапа засьведчыць, што Львоў знаходзіцца на поўнач і крыху на захад ад Івана-Франкоўску, дзе я жыву. Кіеў, у сваю чаргу, — на поўнач і ў значнай меры на ўсход. Але адным з вынікаў другой сусьветнай вайны сталася тое, што для падарожных франкоўцаў абодва месты ляжаць нібыта на адной лініі. Прычына гэтаму — зруйнаваны (ужо й ня ведаю кім — немцамі ці расейцамі) чыгуначны мост цераз Днестар. Таму, насуперак геаграфіі, пасажырскі цягнік №203 Івана-Франкоўск—Кіеў спачатку адхіляецца на паўночны захад ад месца канцавога прызначэньня. У Львоў ён прыбывае надвячоркам, пасьля першых трох гадзінаў рэйсу. Амаль усе выходзяць на пэрон, яшчэ адносна сьвежыя й неагрэсіўныя. Тыя, хто пачаў адразу пасьля Франкоўску, дакупляюць алькаголь і вакзальныя харчы. Іншыя таксама запаўняюць паўзу чым-небудзь карысным — прымаюць або аддаюць перадачы, ладзяць сабе кароткачасовыя спатканьні, дыхаюць невагонным паветрам. Да Кіева шчэ дванаццаць гадзінаў шляху, што само па сабе ня так

ужо і блага.

Па гэтай лініі, Франкоўск—Львоў—Кіеў, я рэгулярна курсую ці не зь сямнаццаці год. Не сумняюся, што ў яе межах я зрабіў разоў аб'ехаў Зямлю па экватары. Але гэтая лінія адсюль ляжыць ня толькі ў прасторы.

дазволу рэдакцыі ўкраінскага часопіса „Критика“ і аўтара.

Мае яна таксама й часавае вымярэньне. Львоў быў першым у сьвеце местам, куды я аднойчы падаўся з дому. Быў пачатак ліпеня, каля пятай раніцы, я ледзьве дачакаўся на мокрай ад расы прывакзальнай траве цягніка — ня кіеўскага, а з Рахава. Ён яшчэ нядаўна ехаў праз горы, пра што сьведчылі ня толькі заінелыя дахі вагонаў, але й вялікая колькасьць карпацкіх цыганоў ува ўсіх без выключэньня тамбурах.

Малюнак сьвету складаўся ў дасканалую цэласьць. Ледзьве жывы ад старасьці цягнік з гор, магнэтычная блізкасьць Цэнтру Эўропы, Галіччына за вокнамі, чатырохгадзіннае расхістаньне *мандражу* ў самім сабе, урэшце — прыбыцьцё: усё, з трамваямі, брукоўкай, псэўдагатычнай Альжбэтай ды шэрагам псэўдагатычных камяніцаў на Гарадзецкай, сьведчыла пра дасягненьне мэты (Эўропа! культура! воля! кайф!).

Гэтага хапіла надоўга — на пяць год і болей. Менавіта таму я часам знаходжу падставы называць сваё юнацтва „львоўскім“. Я разумею, наколькі гэта адказна. Сотні тысячаў людзей пражываюць свой час і месца, нават не заўважаючы, што гэта, па-першае, юнацтва, а па-другое, што яно львоўскае. Галоўнае, я ня здольны даходліва растлумачыць староньняму, у чым ягоныя асаблівасьці, чым яно такое адметнае. Згадваюцца толькі бэзавы кіпень, пляшка чарніла на Высокім Замку, панарама старых дахаў і муроў, а таксама музыка, напрыклад, „Джэтра Тал“, хаця пры чым тут яна?

Усё гэта вельмі непераканальна, усё гэтае „львоўскае юнацтва“, я згодны. Аднак гэта, прынамсі, *штосьці* — у параўнаньні з „кіеўскай маладосьцю“. Бо апошняя — проста здань, якую я няясна бачыў скрозь колькігадовы сон, дый так і ня здолеў зразумець, ці то яна намагалася прывабіць мяне, ці то запалохаць, ці то проста бяз пэўнае мэты дыхала ў твар перагарам — а можа, як выказаўся б хтосьці з больш радыкальных за мяне „майстроў слова“, — сьмерцю духоўнай. Таму няма сэнсу надалей спыняцца на гэтым.

2.

А што ж усё-ткі з тым львоўскім юнацтвам?

Перш за ўсё яно мела горкі прысмак. Гэтае пачуццё завецца расчараваньнем. Вельмі добрае пачуццё, страшэнна плённае й глыбока творчае, як сьцьвярджаюць вядомыя мне аўтары „выхавальных раманаў“. Расчараваньне ўзьнікае на той невядомай мяжы, дзе адбываецца сутыкненьне ўяўнага з рэальным. А паколькі гэтая мяжа й насамрэч нябачная, то і расчараваньне часам можа непрыкметна ператварыцца ў захапленьне, і наадварот.

Уяўнае места Львоў ляжала на маляўнічых зялёных пагорках, цалкам зьберагаючы архітэктоніку й архітэктуру места яшчэ, мабыць, сярэднявечнага. З расчыненых вокнаў там нон-стоп лілася клявэсынная музыка або прынамсі добры сымфа-рок, а дзяўчаты з доўгімі валасамі й вянкамі на галовах чакалі мяне ў траве паблізу фантанаў. Ва ўяўным Львове размаўлялі толькі па-ўкраінску, хіба што старыя ведзьмакі й чараўніцы дазвалялі сабе якую-небудзь лаціну ці грэцкую. Там кожны ведаў на памяць вершы Антоныча, вандроўныя мэнэстрэлі штовечар давалі канцэрты проста на вуліцы. Пад местам была разгалінаваная сыстэма капальняў і лёхаў, там захоўваліся невычэрпныя запасы віна, золата, тканінаў і старадрукаў. Увогуле гэта было места бясконцай таямніцы, і таямніцай пахлі яго жанчыны, расьліны, дажджы. Я ведаў, што львоўская рэчка схаваная пад зямлю, але ў ёй вадзіліся сапраўдныя атлянтычныя вугры, паколькі фактычна места ляжала ў Атлянтычнай зоне сьвету, цалкам магчыма, што й на марскім узьбярэжжы.

Рэальны Львоў адсоткаў на дзевяноста зь нечым складаўся з жахлівых перадмесьцяў і новабудоўляў. Нагрувашчаньне прамысловых тэрыторыяў, хаос фабрычна-станцыйных закануркаў, аднастайныя спальныя раёны, збудаваныя ў сямідзясятых і пазьней, жалезабэтон, панэлі, смурод і скрыгат зубоўны. Фатальная бездапаможнасьць гарадзкіх уладаў у справах вады, каналізацыі, транспарту. З адчыненых вокнаў калі й далятала нейкая музыка, дык толькі савецкая эстрада, расейскай мовы ў горадзе аказалася страшэнна многа. Але яшчэ горшым было тое, што носьбіты ўкраінскай амаль бяз вынятку ўяўлялі сабой тупое й пасіўнае сяло. Студэнты ўнівэрсытэту ўсім сваім выглядам, узроўнем разьвіцьця й

спосабам жыцьця нагадвалі хутчэй выхаванцаў якога-небудзь імбэцыльнага пэтэвэ. А так званая нацыянальная інтэлігэнцыя дэманстравала цуды вернападданства й сэрвілізму, усю сваю ўкраінскасьць сублімуючы ў раскормленыя морды й вышываныя кашулі. Усё гэта разам стварала найпаскуднейшую з усіх вядомых мне гіпастазіяў саўка — саваукр.
Таму мне не заставалася нічога іншага, акрамя веры ў нейкі паралельны Львоў. Час ад часу гэтае места пасылала мне сыгналы пра сваё існаваньне. Гэта мог быць цень нейкага нетутэйшага й несучаснага пэрсанажа з пакінутай птушынай краіны ў прапахлых адкідамі галерэях старога места. Магла быць зьвестка пра чарговы палітычны працэс, левую мастацкую выставу, рок-опэру „Стэпан Бандэра“ або сустрэчы дзяцей-кветак у Сьвятым Садзе. Прагляд фільму Таркоўскага, шпацыры па Лычакоўскім цьвінтары, паўночнае зьбяганьне ў цемрадзь са схілаў Высокага Замку — усё гэта магло спрацаваць на карысьць іншага Львова. У хвіліны найцяжэйшых ювэнільных катастрофаў мне дастаткова было прыйсьці сярод ночы на Рынак з пачатай пляшкай, а то й безь яе.
Самае цікавае, што як толькі маё львоўскае юнацтва скончылася, я патрапіў-ткі ў самы вір гэтага таемнага Львова, у густую, прасякнутую віном, бяссоньнем, каханьнем і вільгацьцю атмасфэру. Я змог пераканацца, што ўсе мае здагадкі былі недарэмныя. І хаця „*Вуйки*“ ўжо ня гралі, Калінец ужо не пісаў, а Чубай ужо ня жыў, я адчуў-ткі пэўную прыналежнасьць да львоўскіх містэрыяў.
Якраз тады я змушаны быў вярнуцца ў родны горад, размазваючы па ўсіх сваіх нататніках гэтую жыцьцёвую паразку і рыхтуючыся да максымальна магчымага супрацьстаяньня бязглуздай рэшце жыцьця.
Дрэнна, што амаль нічога з таго, што ўяўлялася, не збылося. Добра, што ўсё склалася менавіта так.

3.

Добра, што я жыву ня ў Кіеве. Добра, што гэта была толькі здань маладосьці. Таму я яго й ня ведаю. Магчыма, я толькі штосьці здагадваюся пра яго. Але для мяне гэтае места пачынаецца а палове на сёмую раніцы, калі я выходжу з вагона і чую — у твар і ў сьпіну — заклікі, ад якіх нічога добрага чакаць не даводзіцца: „*Мушчіна, таксі недорага!*“

Найгалаўнейшай асаблівасьцю Кіева шмат якія мае знаёмыя лічаць неўкраінскасьць места. Вядзецца перш за ўсё пра моўную сытуацыю, якая, пачынаючы зь дзевяноста першага ці нават зь дзевяностага году, усё ж, на мой погляд, знаходзіцца ў стане пэрманэнтнага маятнікавага ваганьня ў абодва — украінскі й расейскі — бакі. Але ня толькі пра яе.
Кіеў наагул знаходзіцца ў зоне нейкіх іншых „неўкраінскіх“ мэнтальна-псыхалягічных уплываў. Нават стоадсоткавае ўкраінства з больш ці менш аддаленых мястэчак і сёлаў, што ўвесь час паджыўляла Кіеў, ня здолела яго зьмяніць. Наадварот — Кіеў зьмяняў тое ўкраінства. Найбольш адчувальная праява гэтага — поўная мэханістычнасьць кіеўскага гарадзкога існаваньня. У адрозьненьне ад усіх іншых эўрапейскіх сталіцаў, у Кіеве няма „сьвята, якое заўжды з табой“ — насуперак фармальнай насычанасьці гарадзкога існаваньня разнастайнымі народнымі гуляньнямі. Маштабны рух бястварых чалавечых плыняў, узаемная насьцярожанасьць, ізаляванасьць, падрыхтаванасьць да барацьбы, агрэсіі, адсутнасьць імправізацыі, весялосьці духу і гульні ў людзкіх стасунках — усё гэта дазваляе вызначыць насельніцтва Кіева як вялізарную хаатычную зборку чужых і непатрэбных адно аднаму людзей. Не, у Кіеве й блізка няма той нясьцерпнай лёгкасьці быцьця, якой так багата ў Парыжы, Празе, Бялградзе ці нават у Нью-Ёрку. Быцьцё важкаватае, жыцьцё мешкаватае, калі дазволіце мне тут зьвярнуцца да нескладанага рыфмаваньня. Час ад часу прарывам на паверхню глыбока схаванага людзкага выступае хіба што футбол, аднак гэты чыньнік настолькі неістотны й зьменлівы, што ня мае ніякай рэальнай вагі.
Мой сябра Юры Пазаяк, здаецца, можа са мною не пагадзіцца. Яму вядомы іншы Кіеў, нейкія цалкам экзатычныя анклявы, унутраная прыхаваная местачковасьць са сваімі рэальнымі рытмамі, кодэксамі самаўпарадкаваньня і мовай, перш за ўсё Яўбаз. Я веру ня столькі яму, колькі ў тое, што яму трэба верыць. Інакш нікому з нас ня вытрымаць сам-насам з гэтым — не, не Малохам — мотлахам.
Для мяне Кіеў — гэта выспы ў акіяне, шчэптачкі людзей, што тут жывуць, раскіданыя па рэдакцыях, студыях, памяшканьнях і кавярнях — тыя, што гадамі й дзесяцігодзьдзямі супрацьстаяць кіеўскай мэханістычнасьці й застаюцца жывымі людзьмі. Паміж

імі вялізныя адлегласьці, пераадолець якія можа толькі мэтрапалітэн. Фактычна мае маршруты — гэта рух ад адной схованкі да другой, такім чынам, Кіеў — гэта насамрэч зь дзясятак мініятурных фартэцыяў. Выхад на паверхню вельмі непажаданы і надзвычай небясьпечны. Ён дапускаецца толькі дзеля папаўненьня запасаў алькаголю. Навокал блукаюць монстры зь перакрыўленымі мордамі і плямкаюць штосьці малазразумелае на сваёй паўмове.

З усіх роляў, якія мы змушаныя граць у сваім жыцьці, мне больш за ўсё падабаецца роля апавядальніка. А з гэтага вынікае, што мова — менавіта мова, а не пісьменства, менавіта вуснае маўленьне — мае для мяне надзвычайную значнасьць. Ня менш люблю я і слухаць іншых: як хто гаворыць на гэтым сьвеце і што ён *грузіць*. У сваіх шматдзённых вечарова-начных адысэях па *сьцякляшках* ды кнайпах я гатовы выслухаць усіх — пажмяканых жыцьцём алкашоў, абшарпаных спартоўцаў і бізнэсоўцаў, артыстаў і артыстак, вясёлых бандытаў, сэнтымэнтальных прастытутак, сабачых сыноў, сучых дачок, увесь гэты люд, які часам памылкова называюць народам. Я, Патрыярх Бу-Ба-Бу, бяз гэтага не магу. Гэта нармальна, так заўсёды бывае ў Франкоўску ці ў Львове, у Кракаве, Празе, Бэрліне такое таксама здаралася. Але ў Кіеве гэта амаль немагчыма: мае анёлы-сябры выторгваюць мяне з кожнага выпадковага знаёмства — за кожнай размовай, кожным выхадам на паверхню хаваецца небясьпека, гэта жахлівая рызыка, гэта сканчаецца, як мінімум, праламанай галавой (я ўжо бачу свае выбітыя зубы на кіеўскім асфальце). Наўкола нас нядобры акіян, кажуць мае сябры.

Таму ў Кіеве пісьменьнікі сябруюць толькі зь пісьменьнікамі. Або, як ім здаецца, *з Богам размаўляюць*. Бо што застаецца?

4.

Добра, што я жыву ня ў Львове. За гады маёй адсутнасьці праблемы водазабесьпячэньня ў ім так, здаецца, і ня вырашылі. Хаця наагул жыцьцё ў Львове зрабілася за апошні час адчувальна прыямнейшым: нават у нашых хранічна неспрыяльных для кожнай прыватнай ініцыятывы абставінах яна, ініцыятыва, здолела што-нішто зьмяніць у гарадзкім побыце й ляндшафце. Але добра, што я жыву ня ў Львове, бо прыемнасьць ня мае для мяне такога ўжо вялікага значэньня.

З пачатку дзевяностых Львоў лічыўся местам, якое дэградуе. Пра гэта сьведчыў нават выгляд: паступовае разбурэньне вуліц і будынкаў, абваленыя гаўбцы й ляпніна, цемрадзь, вільгаць і холад, заваленыя брудам і сьмецьцем падворкі. Львоў літаральна канаў, ператварыўшыся ў суцэльны вакзал, гэткую базу для далейшае перавалкі праз заходнюю мяжу Ўкраіны сьціжмаў эсэнгэўскага насельніцтва ў трусовых шапках і спартовых аднастроях.

У той самы час са Львова зьехала (зьяжджае, зрэшты, і дасёньня) багата „людзей дзевяноста другога цягніка“. (Ёсьць такая катэгорыя напаўкіеўцаў-напаўльвавянаў.) Большая іх частка зрабіла выбар — прынамсі часовы — на карысьць Кіева. Львоў проста на вачах страчваў людзей маладых, здольных, пластычных, разумных. Самі яны абвінавацілі ў такім сваім выбары *ідыёцкія мясцовыя ўлады,* хаця мэркантыльныя перадумовы такой міграцыі ўвогуле былі зразумелыя й бачныя няўзброеным вокам. У Кіеве іх чакалі нашмат вышэйшыя аклады й бліскучыя кар’еры (асоба з вышэйшай адукацыяй і вольным валоданьнем дзяржаўнай мовай магла ўвечары заснуць пэрспэктыўным журналістам, а прачнуцца ўранку якім-небудзь віцэ-прэм’ерам, або, прынамсі, ягоным сакратаром, што, па сутнасьці, адно й тое ж). Некаторыя зь іх нясьмела матывавалі пераезд і неабходнасьцю „хоць неяк украінізаваць Кіеў“, але з такіх часьцей за ўсё сьмяяліся — і мелі, дарэчы, рацыю.

Увогуле, акрэсьлілася своеасаблівае замкнёнае кола — Львоў дэградуе, бо адтуль уцякаюць найлепшыя людзі, а найлепшыя людзі ўцякаюць, бо Львоў дэградуе.

Насамрэч, як засьведчылі наступныя гады, Львоў аніяк не дэградуе. Ён і не прагрэсуе ў пэўным сэнсе, гэта таксама праўда. Львоў кансэрватыўны паводле сваёй прыроды, вось у чым справа. У Львове заўсёды застаецца прыблізна аднолькавая колькасьць свалаты, вар’ятаў, патрыётаў, грамадзянаў, мяшчанаў, багемы, тумкалаў, маскалёў — словам, усіх катэгорыяў насельніцтва. То бок яны зьберагаюцца ў прыблізна сталых прапорцыях. Гэта дазваляе Львову заўсёды быць самім сабой, нават у часова разладжаным стане.

5.

„У Львове кажуць, нібыта паэт К. страшэнна абразіўся на цябе“,

— паведаміў мне як заўжды прыкрую навіну адзін экзэгет. „Бо ў Львове ўвогуле кажуць“, — адказаў на гэта я. У Львове кажуць, нібыта дачка доктара Ц. паехала нараджаць у Амэрыку. У Львове кажуць, нібыта зубны доктар Ш. вырывае ў мерцьвякоў залатыя каронкі. У Львове кажуць, нібыта Я. сьпіць з Б., а Х. з П. У Львове кажуць, нібыта Ч. падабаюцца хлопчыкі. У Львове кажуць, нібыта на вэрнісажы Ю. былі канапкі з дустам. У Львове кажуць, нібыта ў Р. вылазяць апошнія валасы — напэўна, завёў каханку. У Львове кажуць, нібыта К...цкія на мінулым тыдні не зьяўляліся ў царкве. У Львове кажуць, нібыта Гэты купіў кватэру, Той — рызэншнаўцэра, а Гэная — увогуле жыдоўка. У Львове кажуць.

Для таго, каб зразумець значнасьць чыньніка „кажуць“ для Львова, трэба памножыць ягоны эфэкт на палітычную й экзыстэнцыйную несвабоду ўсіх папярэдніх эпохаў, асабліва апошняй. На атмасфэру даносаў, фальсыфікацыяў, вылоўліваньня душаў. Так, менавіта ў Львове ўпершыню сказалі, нібыта Дз. пакаяўся, Дж. адрокся, а І.Х. укрыжавалі. Дзякуючы гэтаму места выжыла й зьберагло сябе ў найцяжэйшыя часы. Львоўскія чуткі й пагалоскі — гэта такі спосаб узаемнай падтрымкі. Бо сапраўдныя львавяне — гэта вялікая сям’я, *la familia*, мафія, дзе ўсе падтрымліваюць адно аднаго сваім несупынным пляткарствам, цікаўнасьцю, зайздрасьцю, нянавісьцю, што мяжуе зь любоўю, навязьлівай увагай. Ён шалёна жывучы, гэты Львоў, нездарма ж ён зь сямейства кашэчых.

Львоў назірае за табой, або хутчэй глядзіць на цябе, як вядомая ніцшэўская прорва. Ад яго не схаваеш нічога — гэта цудоўны дэтэктар, гэта амаль дэтэктыў, з-пад чыёй увагі ня выпадзе ў сфэры татальна прыхаванага ні нацыянальная здрада, ні самая звычайная распуста, ні нават найменшае махлярства падчас гульні ў брыдж. Толькі вось яшчэ што: Львоў усё прабачае. Бо ў вялікай сям’і рознае здараецца. Таму насамрэч гэта ніякая ня прорва, а такая сабе грамадзкая яма, супольная нізіна, перапоўнены выпарэньнямі чалавечага цяпла гістарычны адстойнік.

А што ў Кіеве? Абыякавасьць? Ніхто нічога не жадае ведаць? Унутранае шамаценьне маленькіх асяродзьдзяў усярэдзіне іх мініятурных фартэцыяў?

6.

Я не люблю Кіева, пісаў я каля двух год таму. Тады ў мяне былі на гэта свае асабістыя падставы — гэты горад па-зьвярынаму забіў майго сябра. Папраўдзе, такая гісторыя магла здарыцца і ў якім іншым месьце, у іншай краіне, магчыма, і на іншай плянэце. Але разам з тым гэта было настолькі па-кіеўску, гэтае забойства, гэтая бязглузьдзіца, гэтая сьмерць зь нічога!

Так, менавіта зь нічога. У Кіеве заўсёды адчуваеш гэтае Нішто — яно беспамылкова вылучае з чалавечай чарады ўсіх іншых, непадобных, прыглядаецца да іхняй жэстыкуляцыі, прыслухоўваецца да мовы, вышуквае душэўныя зрухі й найменшыя зьмены настрою. Вядзецца не абавязкова пра зьнішчэньне гэтых іншых — перш за ўсё, напэўна (калі мне дадзена разумець гэтыя рэчы), пра іх абясшкоджаньне ці, лепш сказаць, утаймаваньне. Яно бярэ іх пад нагляд і ўжо не выпускае з поля зроку — да апошняга іхняга подыху. І калі казаць пра прорву, дык гэта яна.

Тым ранкам я толькі прыехаў у Кіеў і ўсюды мяне чакалі справы, пільнавалі дамоўленасьці, я лётаў, высалапіўшы язык, ужо з восьмай, каб пасьпець з абяцанкамі-цацанкамі хаця б напалову. Прыблізна а дзявятай мяне засьпела жахлівая вестка, далей я ішоў ужо па інэрцыі, бо, па вялікім і адзіным рахунку, пасьля такіх вестак уся штодзённая мітусьня адразу страчвае сэнс. Але я пераадольваў неверагодныя кіеўскія адлегласьці — магчыма, гэта быў спосаб самаабароны або ілюзія ўцёкаў. Так ці іначай — я зьяўляўся з-пад зямлі ў розных месцах, дастаткова ўзаемна аддаленых. І ўсюды я бачыў адно й тое ж: гандаль мясам з вулічных латкоў. Гэта быў нейкі дзень мяса ва ўсім Кіеве — каля станцыяў мэтро, імправізаваных кірмашоў, на сходах, у сквэрах і нават у дварах нейкія людзі прадавалі мяса з абабітых белай бляхай, падобных да каталак сталоў, секлі кавалкі, трушчылі косткі, над імі луналі восы, мухі й таполевы пух, быў чэрвень, была ліпкасьць і духата, сьмяротны кіеўскі пыл вісеў у паветры й асядаў на яткі, на мёртвыя тушы, на твары гандляроў і пакупнікоў, але ўсе яны працягвалі нетаропка й мэтадычна рабіць сваё — секлі, важылі, прынюхваліся і прыцэньваліся.

Мне здаецца, гэта быў гумар. Такім чынам Нішто проста жартавала. Гэта была такая кінастужка з нагоды сьмерці майго сябра. Нішто дасягнула сваёй мэты, калі прыблізна праз

тыдзень пасьля гэтага ў мяне нібыта сама па сабе напісалася фраза: „Я не люблю Кіева“.

7.

Аднак я мушу туды езьдзіць — гэта непазьбежна, гэта, як я ўжо пісаў, істотная частка майго жыцьця, дарога ад Франкоўску да Кіева з абавязковым прыпынкам у Львове.

Тым разам усё было прыблізна гэтаксама, хаця нечаканае пахаладаньне адчулася ўжо на львоўскім пэроне, і з-за гэтага я ня змог выпаліць спакойную цыгарэту ў таварыстве нейкіх малазнаёмых землякоў з суседняга вагону. У цягніку я амаль што адразу паклаўся спаць, бо ведаў, што мяне падымуць ужо а пятай — перад Кіевам яшчэ трэ будзе прыбраць у вагоне. Правадніца й насамрэч не дазволіла мне вылежвацца, раўнуўшы на вуха жахлівае словаспалучэньне *„мушчіна, пад'ём!“*. Фасфарычныя лічбы на маім гадзіньніку сьведчылі пра тое, што зараз безь пятнаццаці пяць. Сьцяўшы зубы й кленучы гэты найгоршы зь сьветаў, я вылез з-пад шыняля на холад. Цяжэй за ўсё было адмыць тамбур зь безьліччу бычкоў, што папрымярзалі да сьлізкай, у крывавых згустках, падлогі. Я згадаў, што дзесьці пасьля першай з тамбура даляталі гукі нейкай бойкі. Не пашчасьціла, думаў я сабе. На сральнік пайшло вёдраў з восем ледзяной вады. Пры гэтым мне заміналі іншыя пасажыры, нейкія цёткі ў пуховых хустах і крыклівыя вэтэраны з ордэнскімі планкамі. Калідор я панічна дамываў, ужо калі цягнік запавольваў хаду на станцыі Кіеў-Цэнтральны. У Кіеве было цёмна, але я інстынктыўна адчуў, куды трэба рухацца, каб патрапіць у памяшканьне вакзалу. Па дарозе мяне спынялі таксісты, яны чапляліся за локці й за крысьсе дажджавіка, пстрыкаючы запальнічкамі мне ў твар. Дарэчы, гэта маглі быць і не таксісты. Прабіўшыся скрозь іхнія шэрагі, я патрапіў-ткі ў залю чаканьня, але там было столькі сьмярдзючых бамжоў, калекаў, цыганятаў і вар'ятаў, што я змушаны быў разьвярнуцца яшчэ з парога, як толькі згледзеў бандыцкага выгляду міліцыянта, які недвузначна рушыў мне насустрач.

Я памятаў, што напярадзе надзвычай насычаны дзень у Кіеве: жывы этэр на тэлебачаньні, паседжаньне рэдакцыйнай рады, да якога я не пасьпеў перагледзець найважнейшыя паперы, вырашальная для мяне размова з галяндзкім аташэ па-

ангельску ці па-нямецку, каардынацыйны камітэт з усімі яго ўнутранымі інтрыгамі, мой аўтарскі вечар у Доме настаўніка і ўсякае такое іншае. Таму я павінен быў хаця б крыху давесьці сябе да ладу пасьля таго немагчымага цягніка. Гэта можна было зрабіць толькі ў грамадзкай прыбіральні, аднак вялізарная літара М, на заклік якой я кінуўся, аказалася ўваходам у мэтрапалітэн. Чарга па жэтоны рухалася настолькі павольна, што я пасьпеў заўважыць, як у ёй трацяць прытомнасьць цяжарныя жанчыны, як сноўдаюць кішэньнікі (іх было зь дзясятак, і адзін зь іх па-змоўніцку паказаў мне нож, калі нашыя позіркі выпадкова сустрэліся), нарэшце, як разьюшаная касірка праз ваконца касы торкнула алоўкам проста ў вока нейкаму прычэпліваму кліенту. Той закрыў рукамі твар, паміж пальцаў выцякала яго вока. Аднекуль ягоны твар здаўся мне знаёмы. Бадай што мы ехалі ў адным цягніку. Ужо на эскалятары я зразумеў, што пасьпяшаўся — якраз у гэтыя ранішнія гадзіны ў кіеўскім мэтро адбываюцца аблавы. І насамрэч — унізе эскалятар кантралявалі некалькі бамбізаў у бушлатах. Колькі гаротнікаў яны ўжо схапілі ў войска. Я пачаў пасьпешліва згадваць, у якія гады знаходзіўся на дзейнай службе, каб хоць што-небудзь ім сказаць. Зрэшты, гэта, як мне распавядалі, ня дужа дапамагае. Заставаўся адзін выхад — разьвярнуцца й бегчы па эскалятары наверх, супраць руху ягоных сходаў. У нейкіх фільмах я такое бачыў, таму вырашыў, што гэта рэальна.

Нерэальным было іншае: прадзерціся скрозь гэтую гурму, скрозь людзей зь іхнімі целамі й адзежай, скрозь мыліцы, куксы, фіксы, растапыраныя пальцы, разяўленыя ляпы, скрозь мяшкі, поўныя ліпкага мяса, скрозь цьвёрдае халоднае паветра. У тое імгненьне я вырашыў, што больш ніколі, ніколі не паеду ў Кіеў, і адначасова зьявілася жахлівае ўсьведамленьне таго, што ўжо занадта позна для такога кшталту абяцанак.

„Пасажыры, уставайце, праз гадзіну Кіеў“, — ня дужа злосна сказала правадніца. Я вярнуўся ва ўласнае цела, нібыта ў сваё купэ. Было ўжо цалкам сьветла, гадзіньнік паказваў палову на шостую.

Найбольшы кайф ад страшных сноў — калі прачынаешся. Ты ведаеш пра гэта, Кіеў.

З украінскай пераклаў Андрэй Скурко паводле часопіса „Критика“ *4/2000 г.*

з ласкавае згоды аўтара і выданьня.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**
[image]

РЫЧАРД ПАЙПС
прафесар гісторыі Гарвардзкага ўнівэрсытэту, дасьледуе гісторыю і культуру Расеі.

Рычард Пайпс

Што Расіі ўзяць у XXI стагодзьдзе і што пакінуць у мінулым?

Выступ у Маскоўскай школе палітычных дасьледаваньняў

Унас, замежнікаў, ёсьць свае перавагі — мы, магчыма, трошкі інакш бачым падзеі, якія адбываюцца ў Расіі, бачым і тое, чаго самі расійцы не заўважаюць. Я вывучаю Расію з 1946 году, і я ўвесь час сачыў за разьвіцьцём камуністычнага рэжыму з пункту гледжаньня гісторыка. І я ня веру тэорыі Салжаніцына, які мяркуе, што савецкая гісторыя пачалася ў сямнаццатым годзе. Паміж царскім і савецкім рэжымамі існуе шмат супольнага. Расія — гэта кансэрватыўная краіна, некаторыя рэчы зьмяняюцца тут вельмі хутка, а нейкія не зьмяняюцца зусім. Я спадзяюся, што мае крытычныя заўвагі будуць

успрынятыя не як нападаў, а як карысная крытыка, якую можна будзе з пажыткам выкарыстаць.
Найгоршае і найбольш небясьпечнае для Расіі — гэта пастаяннае акцэнтаваньне ўвагі на тым, што Расія — вялікая дзяржава. Дзеяньні Расіі, грунтаваныя на гэтай выснове, адцягваюць яе ад сапраўды важных праблемаў, якія патрабуюць вырашэньня. Ідэя вялікадзяржаўнасьці штурхае Расію на канфрантацыю з краінамі, зь якімі ёй неабходна супрацоўнічаць, перадусім з заходнімі.
Безумоўна, пачуцьцё вялікадзяржаўнасьці грунтуецца на шэрагу фактараў, сярод якіх і велізарная тэрыторыя, і асаблівае геапалітычнае становішча. Не ў апошнюю чаргу — гэта вайсковая магутнасьць. Насамрэч ніводзін з гэтых фактараў ня робіць краіну вялікай дзяржавай. Велізарная тэрыторыя, асабліва ў сучасных умовах, мала што значыць. Большая частка расійскай тэрыторыі не населеная людзьмі, і няма ніякай магчымасьці гэтую тэрыторыю засяліць. Гляньце, найбагацейшыя краіны ня тыя, што маюць найбольшую тэрыторыю, наадварот — гэта малыя краіны: Швайцарыя, Галяндыя. Вялікая дзяржава — гэта дзяржава, чыё насельніцтва здольнае выкарыстоўваць рэсурсы і веды для дабра грамадзтва. Калі 50 гадоў таму была створана дзяржава Ізраіль, арабы лічылі, што яны змогуць зьнішчыць гэтую малую краіну, бо ў іх нашмат большая тэрыторыя, нашмат больш насельніцтва. Але Ізраіль аказаўся краінай моцнага этнічнага характару, адданасьці сыянізму і разьвіцьцю навукі, і ён перамагаў арабскія арміі. Вайсковая ж магутнасьць, такая разьвітая ў Расіі, грунтуецца на беднай эканамічнай аснове. Яна вельмі дорага каштавала грамадзтву; Расія ахвяроўвала дзеля яе тым, што сапраўды мае важнае значэньне — эканамічнай і культурнай інфраструктурай. На вайсковую магутнасьць выдаткоўвалі грошы, якія варта было выдаткаваць на асьвету, ахову здароўя і г.д. За часоў Пятра Вялікага амаль 90% нацыянальнага бюджэту Расіі йшло на ўтрыманьне ўзброеных сілаў. У Савецкім Саюзе пры канцы савецкага пэрыяду 25–30% складаў ВПК, гэтыя грошы выдаткоўваліся на вайсковыя патрэбы. Рэжым ня вытрымаў такога вялізнага цяжару, што прывяло да яго падзеньня.

Расія традыцыйна аддавала велізарную ўвагу сваёй вайсковай

магутнасьці, асабліва пасьля таго, як атрымала ядравую зброю, пры дапамозе якой магла трымаць увесь сьвет у страху. Сёньня расійскую ядравую зброю практычна немагчыма выкарыстаць у баі, і гэтая вайсковая магутнасьць мала што значыць. Мала што значыць сёньня і колькасная чалавечая вайсковая сіла. Расія змагла выйграць другую сусьветную вайну таму, што не вагаючыся ахвяроўвала людзьмі. Колькі людзей загубіла Расія ў вайне зь Нямеччынай — гэта ж нешта нялюдзкае! Але расійскаму ўраду было ўсё роўна.

Насамрэч Расія сёньня — не вялікая дзяржава. Ёсьць факты, якія гэта ілюструюць. Паводле некаторых падлікаў, валавы нацыянальны даход Расіі ў 1999 годзе складзе каля 100 мільярдаў даляраў. Магчыма, гэта недаацэнка. Але нават калі гэтая лічба складае 200 ці 250 мільярдаў — гэта вельмі мала. Параўнайце, капіталізацыя адной зь вялікіх карпарацыяў ЗША — карпарацыі *ОРМА* — складае 226 мільярдаў. Абарачэньне маскоўскай фондавай біржы да жнівеньскага абвалу складала 105 мільёнаў даляраў. Гэта можна параўнаць з трохквілінным абарачэньнем нью-ёрскай біржы. Усё гэта надзвычай дзіўна для вялікай краіны. Пры такой беднасьці Расія ня можа быць вялікай дзяржавай, яна можа толькі рабіць выгляд, што яна вялікая дзяржава. Расія вельмі залежыць ад замежных інвэстыцыяў і пазык. А пасьля дэфолту 98-га году замежны капітал ня хутка сюды прыйдзе; на Захадзе лічаць, што Расія сапраўды вельмі бедная краіна, няўдалая для інвэстыцыяў, што ў яе слабая фінансавая сыстэма.

Расія можа зарабіць статус вялікай дзяржавы толькі тады, калі яна ўпарадкуе ўласны дом. Расія павінна адмовіцца ад сваіх імпэрскіх амбіцыяў, яна ўжо больш не імпэрыя, хаця мэнталітэт Пятра Першага тут усё яшчэ прысутны.

У Расійскай імпэрыі ёсьць унікальныя рысы, і яна адрозьніваецца ад вялікіх імпэрыяў Захаду. Калі ў XVI стагодзьдзі пачалася заходняя імпэрская экспансія, калі быў адкрыты Новы Сьвет, калі ў Індыйскі акіян скіраваліся экспэдыцыі, у эўрапейскіх краінаў ужо было сфармаванае разуменьне сваіх нацыянальных інтарэсаў. Брытанія ўжо была Брытаніяй, Галяндыя — Галяндыяй, Партугалія — Партугаліяй... Калёніі аддзяляліся ад мэтраполіі акіянамі... У Расіі ж з геаграфічных прычынаў разьвіцьцё імпэрыі, разьвіцьцё нацыянальнай дзяржавы адбывалася інакш. Іван IV заваяваў

Казань, Астрахань, усталяваўся лад шматнацыянальнай дзяржавы, і пры гэтым расійскія калёніі межавалі з Расіяй. У адрозьненьне ад Захаду, дзе існавала ўсьведамленьне, чым ёсьць мэтраполія, а чым калёнія, у Расіі такога разуменьня не існавала. Мэтраполія і калёніі — гэта было нешта зьмяшанае. Дарэчы, у 50–60-я гады ад расійцаў можна было пачуць меркаваньні, што Расія зусім не імпэрыя, што яны жывуць на гістарычнай тэрыторыі, населенай рознымі нацыянальнасьцямі. Гэты “зьмяшаны” мэнталітэт існуе і дагэтуль.

І яшчэ — пра расійскі нацыяналізм. Безумоўна, там, дзе людзі выбіраюць дэмакратыю, узьнікае размова пра нацыянальную самасьвядомасьць, пра нацыянальную дзяржаву. Але ў нацыяналізьме ёсьць два варыянты: ён можа быць эксклюзіўным і можа быць інклюзіўным. Эксклюзіўны азначае, што мы, чальцы гэтай этнічнай групы, выключаем усіх астатніх са свайго кола і пазіраем на іх зьверху ўніз. Гэта такая разнавіднасьць нацыяналізму, якая прыводзіць да ксэнафобіі, да шавінізму. А яднальны, інклюзіўны нацыяналізм (яго можна назваць яшчэ патрыятызмам) — гэта гордасьць за сваю грамаду, за тое, што вы працуеце на дабро гэтай грамады. Я мяркую, што расійскі нацыяналізм — пераважна эксклюзіўны, выключальны. Тут выключаюць усіх чужых, і гэта прыводзіць да ксэнафобіі, з прыкладамі якой мы ўвесь час сутыкаемся. Тут і наступствы таго, што пракідалася пры Сталіну, калі расійская нацыянальная гордасьць трансфармавалася ў ксэнафобію. Рэч у тым, што гэта не патрыятызм. І я ня ведаю, як з падобным можна справіцца — хіба толькі супольнымі намаганьнямі інтэлігенцыі, інтэлектуалаў. Бо так званая расійская гордасьць грунтуецца на нянавісьці да іншых. Неабходна адмаўляцца ад гэтай спадчыны камунізму, падцінаць яе глыбознае карэньне. Гляньце, хто б ні прыйшоў да ўлады ў Расіі — усё тыя ж царысцкія сымбалі: дзьвюхгаловы арол, сьцяг... Шмат гарадоў, вуліцаў былі перайменаваныя, але шмат чаго і засталося. Ленінскі праспэкт, Кастрычніцкая плошча з помнікам... Пецярбургу вярнулі ранейшую назву, Ленінградзкая вобласьць засталася. Пакуль яшчэ жывыя сымбалі старога рэжыму, людзі ня могуць мець выразных уяўленьняў, і яны не дасягнуць нічога пазытыўнага.
Камунізм быў разбуральным пэрыядам; стагодзьдзі, затрачаныя

на стварэньне грамадзянскай супольнасьці, пайшлі, так бы мовіць, на глум. Усе грамадзкія сувязі былі ператвораныя ў вэртыкальныя. Дарэчы, гэта тлумачыць, чаму распалася сама камуністычная партыя... У 1917-м годзе, вы памятаеце, цар адрокся і краіна распалася. Гэта немагчыма для дэмакратычнай краіны, бо там існуюць моцныя гарызантальныя сувязі, зьмена ўраду не прыводзіць да распаду краіны, і не даводзіцца пачынаць усё з нуля.
Я мяркую, што найважнейшае заданьне для Расіі — пабудова юрыдычнай сыстэмы, судовай сыстэмы. Нармальная судовая сыстэма сёньня ў Расіі не працуе. Калі нехта тут у вас пазычае грошы і падпісвае адпаведную паперу, але даўгі не вяртае, то вы ня можаце зьвярнуцца ў суд, як гэта робяць нават у азіяцкіх краінах, а йдзяце да мафіёзных структураў. Урад таксама ня дзеіць згодна зь літарай закону. Няма прававой аховы інвэстыцыяў. Ствараецца такі клімат, у якім ня можа быць сацыяльнага адзінства, мала даверу паміж грамадзянамі і ўрадам і вельмі невялікі ўзровень даверу паміж грамадзянамі. На практыцы выходзіць, што кожны сам за сябе. Але адначасна існуе спадзяваньне, што ўрад будзе бараніць інтарэсы народу. Аднак на гэта ў Расіі спадзявацца нельга!

У сёньняшняй Расіі сярод актыўных палітыкаў няма ніякага кансэнсусу, згоды няма нават у тым, каб Расія захавалася і працьвітала. Існуе велізарная колькасьць партыяў, і яны пераважна абслугоўваюць эгаістычныя памкненьні сваіх лідэраў. Такія партыі — не канкурэнты, яны ворагі адна адной. На Захадзе ж партыі канкуруюць, а не варагуюць міжсобку. Дазвольце мне выказаць спачуваньне, што Расія яшчэ не пераадолела гэтыя заганы. Я разумею, што выслухоўваць гэта ад замежніка не заўсёды прыемна. Але мяне цікавіць ня столькі мінуўшчына і цяпершчына, колькі будучыня. Пра будучыню, на жаль, сёньня ў Расіі дбаюць мала. Тут, як і раней, любяць наракаць на іншых.
Памятаю, я быў шакаваны, калі прачытаў, што дзьве траціны расійцаў вераць, нібыта Злучаныя Штаты давалі эканамічную дапамогу, каб загубіць Расію. Гэтая ідэя ня мае ніякага дачыненьня да праўды. У Злучаных Штатаў, як і ў кожнай краіны, ёсьць свае інтарэсы. Але існуе велізарная розьніца паміж доўгатэрміновымі і кароткатэрміновымі інтарэсамі. Расія

пад уплывам свайго гістарычнага досьведу ўсё яшчэ працягвае думаць пяцігодкамі, кароткімі пэрыядамі. Мы, дзякуючы нашай гісторыі, думаем нашмат большымі пэрыядамі. Калі скончылася другая сусьветная, мы пачалі дапамагаць Эўропе паводле пляну Маршала. І мы стварылі ў Эўропе сваіх канкурэнтаў. І мы ня хочам губіць Расію, мы ня хочам эксплюатаваць Расію. Няхай, у тым ліку і ў выніку нашай дапамогі, яна стане нашым канкурэнтам. Але Расія, на жаль, усё яшчэ перабывае пад уплывам ілюзіяў вялікай дзяржавы. Адзіны вораг Расіі — гэта самі расійцы. Я вельмі спадзяюся, што расійцы гэта зразумеюць, і тады яны пачнуць рухацца ў кірунку, неабходным для працьвітаньня Расіі. І ня будуць лаяць іншых, што яны нічога не зрабілі, і, магчыма, стануць аддаваць перавагу ня пляшцы гарэлкі, а разумным дзеяньням.

Паводле

Index on Censorship. — *9 / 1999*.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**
[image]

Людміла Рублеўская Паэзія і грэх

Леанід Галубовіч. Апошнія вершы Леаніда Галубовіча. — *Полацак, Бібліятэка часопіса „Калосьсе“, 2000.*

ЛЮДМІЛА РУБЛЕЎСКАЯ літаратурны крытык, працуе ў тыднёвіку „Літаратура і мастацтва". Аўтарка кнігі „Балаган" („Бібліятэка „Калосься"", 2000) і артыкулу „Дапісаныя да мілення" ў першым нумары „ARCHE-Скарыны".

Традыцыйнае беларускае літаратуразнаўства, праўдзівы спадкаемца савецкага, па-ранейшаму выбудоўвае панараму літаратурных эпох і пакаленняў, што прыходзяць адно аднаму на змену, перадаючы, быццам пераходны чырвоны сцяг, патрыятычныя пачуцці і сувязь з фальклорам. Кожны пісьменнік, паводле гэтага падыходу, мусіць быць ідэнтыфікаваны з пэўным пісьменніцкім пакаленнем. Але ў кожным так званым „пакаленні літаратараў“ ёсць постаці, якія з гэтага пакалення як бы „выломваюцца“, парушаючы навуковую пабудову. Да такіх „няправільных“ літаратараў

належыць Леанід Галубовіч. Паводле веку быць бы яму ў шэрагу знакамітых „шасцідзясятнікаў“ з іхнімі юначымі вершамі пра Леніна ды камсамол, пазнейшымі чыноўніцкімі пасадамі ды прэміяльнымі прывілеямі і сённяшнім адраджэнскім супрацьбюракратычным апломбам...
Для літаратуры, у якой па-ранейшаму захоўваецца вяршэнства прынцыпу герантакратыі, дасягненне пяцідзесяцігадовага веку мае важнае практычнае значэнне і дазваляе стаць афіцыйным літаратурным аўтарытэтам. Няёмка прызнавацца, але дасюль у крытыцы, у сучасных падручніках і дапаможніках саракагадовых (і крыху старэйшых) творцаў называюць маладымі. Але калі табе спаўняецца пяцьдзесят — справа іншая. У „ЛіМе“ будзе надрукаваны „юбілейны“ артыкул, выдавецтва выдасць кнігу выбраных твораў юбіляра (калі ты, ясная рэч, не „апазіцыянер“), у Доме літаратара (які сёння належыць Адміністрацыі прэзідэнта) адбудзецца творчая вечарына з абавязковым банкетам. Часам да знамянальнай даты на ссівелую пісьменніцкую галаву злятаюць першыя кроплі прэміяльнага дажджу... Карацей, самае „літаратурнае жыццё“ пачынаецца. Вядома, яно не супадае з творчым, і нават не паралельнае яму.
Леанід Галубовіч свой пяцідзесяцігадовы юбілей адзначыў у родным Клецку, запрасіўшы некалькіх знаёмых літаратараў са сталіцы. У якасці юбілейнага выдання — кніга тыпу „брашура“ накладам 150 паасобнікаў пад назвай „апошнія вершы леаніда галубовіча“. У якасці прэміі — „нашаніўскі“ досціп Наталлі Бабінай з нагоды папярэдняй кніжкі Галубовіча, „Зацемкі з левай кішэні“, што выйшла ў выдавецтве „Эўрофорум“ не нашмат большым накладам.

Дакладна паводле верша з першага зборніка Галубовіча „Таемнасць агню“:

Прыедзе брат, і той, глядзі,
Мне пальцам торкае у грудзі:
— Ты па рэдакцыях хадзі,
У горад едзь... Праб'ешся ў людзі...
Яшчэ мой розум не зачах...
Ці мне за славаю ганяцца?
Адкуль мне ў людзі прабівацца?

Я на людскіх заўжды вачах.
У горад! Хлебам не кармі...
Леанід Галубовіч ніколі не крочыў у нагу са сваім літаратурным пакаленнем. Яго немагчыма ўявіць сарамлівым пачаткоўцам з камсамольскай рамантыкай у празрыстых радках. Вось ён на фатаздымку ўдзельнікаў семінару маладых літаратараў у Каралішчавічах 1981 году: пахмуры тып у піжонскім белым гольфе, з пушкінскімі бакенбардамі і скептычным позіркам. „Рэзаў“ услых усё, што хацеў, мог прылюдна сказаць „г... твае вершы“ любому літаксакалу з „палічкай кніг“, чорнай „Волгай“ і кватэрай у „раёне андатравых шапак“. Каб зразумець сённяшняга Леаніда Галубовіча, трэба ведаць таго, ранейшага, электрыка з вёскі Вароніна, які рэгулярна друкаваў у „ЛіМе“ крытычныя агляды літаратурных навінак, нажываючы ворагаў і шакуючы публіку, звыклую да сервільнай крытыкі. Якога крывадушна шкадавалі і лічылі „прапашчым“, адпраўлялі на прымусовае лячэнне ад алкагалізму... Але й пасылалі ў Маскву на нараду маладых пісьменнікаў, каб „прыручыць“ яго буяны талент...
Першая кніжка Леаніда Галубовіча „Таемнасць агню“ выйшла ў 1984 годзе, калі аўтару было 34 гады. Сярод вершаў зборніка ёсць тыя, што могуць быць прылічаныя да найлепшай лірыкі дзесяцігоддзя. Ёсць і даніна „пануючай ідэалогіі“ — без ідэалагічна прававерных вершаў кніжка выйсці тады не магла. Галубовіч „адкупляецца“ ад пільных ідэолагаў некалькімі рыфмаванкамі наконт апошняй вайны і міру ўва ўсім свеце. Аснова першага зборніка, безумоўна — рамантыка вясковага жыцця, рэфлексіі з нагоды сваяцкіх адносінаў, пабытовых падзей і родных краявідаў... Але, пакідаючы некалькі рысак ад запланаванай сацрэалізмам бутафорскай вёскі са штампаванымі гаротнымі бабулямі, салдацкімі ўдовамі, дзядамі — мудрымі ветэранамі, шчаслівым басаногім маленствам і дружнай працай на калгасных палетках, Галубовіч паказвае нам сваю Вёску — космас, сусвет, заснаваны на архетыпах. Прыгонную савецкую вёску, якая адначасна ўвасабляе свет нацыянальны, свет канкрэтных беларусаў.
Калі табе за трыццаць — ты ўжо мусіш быць сфармаваным творцам. У вершах „Таемнасці агню“ сфармуляваныя ўсе тыя праблемы, трагічнай невырашальнасцю якіх будзе ўражвацца

паэт у сваіх наступных паэтычных зборніках —„Споведзі бяссоннай душы“, потым сімпатычным томіку ў „Бібліятэцы паэта“, куды дапушчаліся толькі саракагадовыя юбіляры. Пасля ў „Заложніку цемры“ ды згаданых „апошніх вершах“. Яшчэ была кніга перакладаў на расійскую мову „*Аист без гнезда*“, але яе, напэўна, можна не лічыць: „не знайшла свайго чытача“.

І тут насоўваецца парадокс — тэмы паэзіі традыцыйныя, форма таксама, але Леанід Галубовіч успрымаецца як паэтычны нонканфарміст, а ягоныя вершы — як інтэлектуальная паэзія. Такая сабе традыцыйная японская інтэлектуальная паэзія простых, побытавых рэчаў — стары будан, радыс, крэветкі... Пакаленне, да якога фармальна належыць Галубовіч, называюць філалагічным. У гэтым закладзена канстатацыя таго, што большай яго частцы давялося прайсці праз філалагічны факультэт БДУ. Часам крытыкі нават спрабуюць высветліць, з кім на філфаку вучыўся Галубовіч. Засмучу цікаўных — Галубовіч ніколі не вучыўся на філфаку. Затое скончыў слуцкае ГПТВ-97. Пасля шматгадовай працы вясковым электрыкам, алкагольнай залежнасці, ужо амаль саракагадовы, быў адпраўлены мілажальным кіраўніцтвам Саюзу пісьменнікаў на Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскву — гэткі лікбез для таленавітых, але недастаткова адукаваных сяброў літаратарскага саюзу. У прадмове да „Таемнасці агню“ Вера Палтаран, цікавая (трохі падзабытая, на жаль), сумленная даследчыца літаратуры (памятаеце ў Ведзьмака Лысагорскага: „Ва ўсіх дамы, ва ўсіх палеткі, і толькі ў беднай Палтаран стаяў хляўчук, сядзелі кветкі, ляжаў няўраны дзірван“) пісала ў найлепшых традыцыях тагачаснае крытыкі: „Леаніду Галубовічу многа дадзена. У яго таленце адчуваецца жыццёвая сіла, глыбіня, але — і нейкая крохкасць. Як ён пакіруе сам сабою, як будзе расці, развівацца — пакажа час. Але ўжо цяпер адчуваецца: яго моцнай жыццёвай аснове патрэбна агульнаадукацыйная падзарадка, бо дзе-нідзе ён пачынае паўтарацца, кружыць вакол сябе самога , дзе-нідзе яго думцы не стае „цягі“ і яна прабуксоўвае ў вычарпаным пласце, — адным словам, перад паэтам паўстае нялёгкая задача дасканалення свайго таленту“.
Вось Літінстытут і дадаў паэту „цягі“. Гэтая ўстанова, дзякуй Богу, не рабіла паэтаў філолагамі. Затое дазваляла набрацца

„шкодных“ ідэяў. Аднакурснікам Леаніда Галубовіча на ВЛК быў чачэнскі паэт Яндарбіеў, які пасля стаўся часовым прэзыдэнтам Ічкерыі.
У 1989 годзе па літаратарскіх колах прайшла чутка: Галубовіч вярнуўся з Масквы… Не п’е! І нават ажаніўся. І нават дачка ёсць.
Маладая сям’я саракагадовага Галубовіча зняла пакойчык каля Кальварыйскіх могілак, і новаспечаны галава сям’і заняўся пошукам працы. Узялі яго, хоць рэпутацыю ён меў не найлепшую, у самусенькі цэнтр ідэалагічнага выхавання працоўных масаў, рэдакцыю літаратурна-драматычных праграм БТ. Пасля сканчаецца перабудова, на тэлевізіі становіцца задушна, і Леанід Галубовіч трапляе ў асяродак, які найбольш пасаваў яго асобе — у рэдакцыю „літаратурна-культуралагічнага часопіса „Крыніца“. Менавіта там, у „Крыніцы“, Галубовіч і фармулюе, усё больш упэўнена і, нарэшце, безапеляцыйна: „Трэба кідаць пісаць вершы“…

Адрачэнне ад вершаў
Пэўна, не было ў 2000 годзе кнігі з больш інтрыгоўнай назвай, чым гэтая. Жывы паэт, прычым яшчэ не старога веку, выдае зборнік, на вокладцы якога белым па жалобна-чорным значыцца: „апошнія вершы леаніда галубовіча“. Прычым „апошнія“ не ў сэнсе „апошнія па часе“, а ў значэнні „пасля якіх новых больш не будзе“.
Найпершая версія — гэта з-за таго, чым апраўдваюць любое паскудства ў біяграфіі пісьменніка: неспрыяльныя абставіны. Вядома ж, неспрыяльныя… „Крыніца“, пасля таго як ейны галоўны рэдактар Уладзімір Някляеў, нарабіўшы рэдакцыйных даўгоў, з’ехаў за мяжу, ні жыве ні памірае… Спробы „дабіцца справядлівасці“ ўнутры рэдакцыі скончыліся афіцыйным расследаваннем, якое было выкарыстана як падстава для расправы з выданнем. Стараннем ураду выданне спынілася. А ёсць сям’я, якая просіць есці… І поўная безнадзейнасць з выданнем кніжак! „Зацемкі“ выкінулі з планаў „Мастацкай літаратуры“ за зацемку пра КДБ, рукапіс вершаў Галубовіч забраў сам…
Рашэнне Леаніда Галубовіча перастаць пісаць вершы — гэта

здзейсненае памкненне ўсіх тых, хто ад крыўды і безнадзейнасці прамаўляе: „Каму цяпер патрэбныя вершы? Ці жыве цяпер беларускі народ і беларуская літаратура?“ Непрамы закід і скарга, адрасаваная абстрактнаму народу і абстрактнай літаратуры. Нікім не здзейсненае. Апроч Галубовіча.
Спакуса — расцаніць учынак Галубовіча як пратэст… Ну, хаця б супраць палітычнай лініі кіраўніцтва краіны. Але дарэмна абсалютызаваць канкрэтныя абставіны, якія падштурхнулі паэта да гэткай заявы. Рашэнне не было раптоўным. Яно выспявала даўно.
Зацятае самаадмаўленне прысутнічала ў Леаніда Галубовіча яшчэ да прыходу Лукашэнкі да ўлады, — і ў часы застою, і ў часы перабудовы, і ў часы кароткага адраджэння… Настойліва вяртаўся матыў „вольнасці ад паэзіі“. У зборніку „Заложнік цемры“, што выйшаў праз дзесяць гадоў пасля першага , чытаем: „Я апошні паэт заВЕРШАНЫ“… І далей: „А я — самагубца, і гэтым сказана ўсё“…

Два гады не складаў вершаў…
Тры гады не пісаў вершаў…
І, магчыма, ніколі іх не ствараў…
…
Якая свабода не дбаць пра вершы!..
Два гады не складаў вершаў…
“Заложнік цемры“
Падчас адной з прыватных размоваў у „ЛіМе“ Леанід Галубовіч сам патлумачыў сваё адрачэнне ад паэзіі як жаданне давесці самому сабе, што ён — не графаман. Мог бы працягваць пісаць, але *можа* і не пісаць.

Адрачэнне паэта ад паэтычнай творчасці… Уражвае, уражвае!.. І не верыцца ў яе праўдзівасць — нават набраная буйным шрыфтам на вокладцы, такая дэкларацыя можа застацца дэкларацыяй. Вунь Леанід Дранько-Майсюк некалі абвесціў, што паэтам можна быць толькі да сарака гадоў, а пасля гэта ўжо не паэзія, а так, рамяство, рэха былога натхнення… Тым не менш спакойна перажыў саракагадовую мяжу і піша далей. І дзякуй Богу. Адам Глобус напісаў, што пасля Галакосту немагчыма быць паэтам. А паэты пішуць і пішуць. Адзін наш

стары паэт ужо колькі год здае ў рэдакцыі свае падборкі з каментаром: „Гэта мае апошнія вершы...“. Вядома, друкуюць у першую чаргу. А раптам сапраўды апошнія?
Гісторыя літаратуры ведае прыклады, калі паэт змаўкаў. Уладзімір Дубоўка — пасля сталінскіх рэпрэсій. Арцюр Рэмбо ўсе свае творы напісаў да васемнаццаці гадоў, а далей да трыццаці сямі дажываў як шараговы няўдачлівы гандляр. Літаратуразнаўцы дасюль корпаюцца ў псіхалогіі, аналізуюць гістарычныя абставіны... Мне найбольш падабаецца лаканічная версія — „сказаў усё, што мог“. У тры гады пражыў цэлы век. У „Чвэртцы году ў пекле“ дасягнуў вяршыні ў паслядоўным развянчанні рэлігіі, філасофіі і прозы. Спаліў згаданую паэму — і ўсё... Далей — пустэча. Малярмэ назваў гэта „Адзіным, непаўторным выпадкам у гісторыі чалавечага духу“.
Леанід Галубовіч, што б ён там ні сцвярджаў, зусім змоўкнуць не можа. Творчы патэнцыял яго па-ранейшаму буйны і шукае сабе выйсця праз іншыя жанры. Толькі лянівы сярод літаратуразнаўцаў не пісаў яшчэ пра „Зацемкі з левай кішэні“, ставячы іх ў адзін шэраг то з мініяцюрамі Брыля, то з занатоўкамі Глобуса.
Паэзія „апошніх вершаў“ пабудаваная на самаадмаўленні. Мала ў каго з паэтаў прысутнічае такая драматычнасць успрыняцця свету, як у Галубовіча. Можа, таму, што мала паэтаў, гэтак раскрытых у сваёй паэзіі, ува ўсіх сваіх вартасцях і слабасцях, пераканаеннях і забабонах. Звычайна паэт так баіцца падацца смешным, недасведчаным, баязлівым, што кожнае слоўца, кожны вобраз прапускае праз унутранага цэнзара, беражліва ствараючы „імідж“ (якога, насамрэч, амаль ніхто і не мае). Завядзёнка гэтая агульная, і такіх, як Галубовіч, таксама закранае, хаця б часткова. Памятаеце, як у „Сталкеру“ Таркоўскага персанаж, якога завуць Пісьменнік, параўноўвае працэс пісання літаратурных твораў з выцісканнем вугроў перад люстэркам — „ганебны, балючы, сорамны занятак“. А публіка яшчэ патрабуе, каб гэта рабілася прылюдна... Складаецца ўражанне, што Леанід Галубовіч таксама лічыць калі не самую паэзію, дык „занятак паэзіяй“ чымсьці грахоўным.
Вось і вымаўлена слова, якое дае ключ да загадкі Леаніда Галубовіча, — гэта балючае, усёабдымнае ўсведамленне сваёй асабістай грахоўнасці і грахоўнасці паэзіі. Многія творцы

асэнсоўваюць уласную грахоўнасць. Пры гэтым яны расцэньваюць творчасць як ачышчэнне ад граху, нават як нейкую сакральную місію. Зборнік „апошнія вершы…“ пабудаваны як споведзь. У ім можна вылучыць асобныя „грахі“, у якіх каецца паэт.
У хрысціянскай рэлігіі ёсць паняцце „разумовай пыхі“: чалавек перабольшвае значэнне навуковага досведу і ўласных ведаў. І ў выніку даказвае, скажам, што кіт аніяк не мог праглынуць Ёну, бо гэтаму перашкаджае кітовы вус.

Разумовая пыха ўласцівая ўсім людзям інтэлектуальнай працы. Леанід Галубовіч усведамляе яе як грэх, як спакусу элітарнасці, абранасці. Ён супастаўляе лёс „простага чалавека“, найперш селяніна, з лёсам паэта, гараджаніна, „чалавека цывілізацыі“, і гэтае параўнанне ідзе не на карысць апошняга. Паэта не пакідае пачуццё віны перад вясковымі бацькамі, перад аднагодкамі, якія робяць „карысную працу“, і любым чалавекам, які пазбаўлены разумовай пыхі.

На магіле свайго бацькі
Замаліў бы грэх парнаскі…
Паводле народнага. „апошнія вершы…“
Любы „вясковы Колька“ падаецца аўтару больш „сапраўдным“, чым той, хто займаецца „пустой“ інтэлектуальнай справай.

Я думаў, паэзія — верх
наіву святога,
а слова, ўпадаючы ў грэх,
ёсць мерай пустога…
Я думаў, паэзія — ўсё… „апошнія вершы…“
У гэтай пазіцыі — рэшткі „апрашчальнай“ тэндэнцыі, што захоўваецца ў беларускай літаратуры ад пачатку стагоддзя, узнікшы пад уплывам народніцкай ідэалогіі. „Я не паэта, о крый мяне Божа“. Літаратар-адраджэнец традыцыйна баіцца выявіць сваю адукаванасць, тым самым прыналежнасць да „класу прыгнятальнікаў“, бо адукаванасць асацыюецца з прыналежнасцю да расійскай ці польскай „арыстакратычнай“ культуры.
Леанід Галубовіч, як і яго папярэднікі ў „апрашчэнні“, адчувае сябе непатрэбным у сваім „невыразным чыне“ паэта.

Злажыць песню ледзь умею,
Ад тых думкаў аж мадзею... —
скардзіцца Казімір Сваяк у зборніку 1924 году. Леанід Галубовіч амаль слова ў слова паўтарае гэтую скаргу наконт „крэмзання“„вершыкаў“, якія толькі псуюць паэтавы нервы, нічога новага не прыўносяць у свет і дасканаласці не дасягаюць.

Грэх слова — у тым, што яно — **не дзеянне**. Што паэт

Не шукаў сабе
вольнай па
свеце,
А ўсё крэмзаў
на мове Эзопа,
Сум хаваючы ў
звонкім санеце.

Што мне вашы „еўропы“ і „штаты“...
„апошнія вершы...“
Дзе павінна быць месца паэта ў часе змагання за будучае свайго народа? На барыкадах? За трыбунай? У мітынговых шэрагах? Ці за пісьмовым сталом?

Беларускія пісьменнікі — генетычна „спуджаныя“. Яны ведаюць, што для ўлады яны — падазроныя проста таму, што нацыянальныя паэты. І таму каланіяльная ўлада заўсёды будзе ставіцца да літаратара з каланізаванага народу як да падследнага — злачынцы, што замахваецца на святы парадак паноўнага дыскурсу. Імкнучыся прымусіць яго жыць з пачуццём вінаватасці.

Беларуская літаратура, абцяжараная нявырашанасцю нацыянальнага пытання, ад пачатку выкарыстоўвала літаратара ў функцыі публіцыста і асветніка. І ставіла яго тым самым у сітуацыю несвядома вінаватага.

Галубовіч — не трыбун і не трыбунны паэт, хаця ў „апошніх вершах“ ёсць некалькі дэкларацыйных твораў. Але з верша ў верш у яго паўтараецца матыў самаасуджэння за бяздзейнасць, за жыццё „за жалеззем балконных кратаў“. Да гэтага дадаецца класічная туга вясковага з паходжання паэта, вымушанага жыць у горадзе, па вясковай радзіме і сялянскай працы. Леанід Галубовіч выказвае яе без фальшывай сентыментальнасці. Ён усведамляе, што вёска — гэта не фальклорны рай. Гэта

калгасная прыгонная вёска, дзе незнішчальны рабскі менталітэт і татальны алкагалізм.
Ставячы продкам кашчуннае кляймо „рабы“, Леанід Галубовіч робіць гэта зусім не пафасна, не як доказ супрацьлеглага, заклік да паўстання. Проста канстатуе факт. Ён мае права гэта рабіць, бо сам — „раб, сын рабыні“. Бо любіць сваё калгасна-прыгоннае Вароніна і тутэйшых людзей, як Адысей любіў сваю камяністую Ітаку. Як Сакрат Яновіч любіць свае спольшчаныя Крынкі, дзе стварае цэнтр беларускай культуры „Віла Сакратэс“... Як яшчэ адзін беларускі паэт з Беласточчыны, Алесь Барскі, называе свае Бандары Афінамі.
Прывязанасць да „роднага куточка“, „бацькоўскай хаткі“, апяванне фальклорнай вёскі, якое Васіль Быкаў неяк назваў „рэптыльнай тэмай“ беларускай літаратуры, захавалася ў паэзіі канца XX стагоддзя. Але менавіта яно надае паэзіі Леаніда Галубовіча цеплыню афарбоўкі.
Для Галубовіча-паэта мастацтва грэшнае, бо яно не да канца жыццёвае, а паэт імкнецца да сапраўднасці, спраўджанасці, апраўданасці свайго жыцця. Але паэта не пакідае надзея, што вершы здольныя быць *большай рэальнасцю*, чым рэальнае жыццё. Ілюзія, якую падзялялі многія паэты.

Трэба тварыць уяўнасць
З хаосу лятучых кроз.
Каб узвесці ў сапраўднасць
Свой чалавечы лёс.
Бессэнсоўныя ўцёкі ад рэалізму.
„апошнія вершы...“

Але, з другога боку, імкненне падмяніць сабой прыроду, стаць упоравень з самім Творцам — найвялікшы грэх мастацтва. Галубовіч-чалавек лічыць сябе толькі выканаўцам Найвышэйшай Волі. Ізноў паэзія аказваецца грахом.
Яшчэ адзін матыў, характэрны для вершаў Леаніда Галубовіча, — параўнанне сваёй асобы з нейкім ідэальным архетыповым вобразам паэта — бунтаўніка, асацыяльнага, незалежнага ад грамадства чалавека. Леанід Галубовіч нібыта пакутуе ад свайго ўласнага адноснага „дабрабыту“, пэўнай сацыяльнай стабільнасці, упісанасці ў ланцужок „дом-сям’я-праца“. Яму

здаецца, што ягонае законапаслухмянае жыццё не дае яму ўстаць у шэраг „сапраўдных паэтаў“, што ён не варты паэзіі, шлях да якой пракладаецца толькі асабістымі пакутамі. Падчас працы ў „Крыніцы“ Леанід Галубовіч адкрыў для чытачоў цудоўнага паэта і пісьменніка з Вярховічаў Міколу Купрэева. Трыццаць з лішнім гадоў таму Купрэеў выдаў зборнік, які ўражваў незалежнасцю ад ідэалагічных клішэ. Пасля — трыццаць год маўчання... Калі Леанід Галубовіч зацікавіўся лёсам Міколы Купрэева, той ужо не меў ні дому, ні працы, ні сям'і, ні здароўя і жыў у санаторыі для сухотнікаў. Галубовіч захапіўся асобай гэтага паэта, які мог правесці дзень, назіраючы за жыццём мурашніка. Ці праездзіць на электрычцы, назіраючы за мурашнікам чалавечым. У многім дзякуючы Леаніду Галубовічу лёс Міколы Купрэева змяніўся. „Крыніца“ апублікавала яго вершы. Пасля Мікола Купрэеў выявіўся на старонках гэтага часопіса як таленавіты празаік. Выйшаў паэтычны зборнік Купрэева „Правінцыйныя фантазіі“. Гэтую кнігу вылучылі на атрыманне дзяржаўнай прэміі. Хаця літаратурная прэса прарочыла кнізе ўзнагароду, яе аўтару, нядаўняму бадзягу і безумоўнаму нонканфармісту, які не круціўся ў саюзпісьменніцкіх кулуарах і ніколі не меў ніякіх пасадаў, яе не далі. Канчаўся 1996 год, якраз пасля рэферэндумаў, на якіх „пабядзілі“ мову, Пагоню і падзел уладаў, і ўлады баяліся даць прэмію вольнаму літаратару, які б, не дай Бог, яшчэ адрокся яе на знак пратэсту або ўвогуле плюнуў падчас цырымоніі ў твар кіраўніку дзяржавы, які гэтыя прэміі, паводле традыцыі, уручае. (Прэмію ўрэшце аддалі рэдактару „Маладосці“ Генрыху Далідовічу за раман „Заходнікі“, і Далідовіч на ўручэнні абмежаваўся просьбаю да Лукашэнкі „берагчы родную мову“. — „Пішыце на ёй, і яна зберажэцца“, — пахмура адказаў яму А.Лукашэнка.)
Казус з прэміяй Леанід Галубовіч успрыняў больш балюча, чым сам Мікола Купрэеў. У асобе Купрэева Леанід Галубовіч бачыць як бы свайго двайніка, варыянт уласнага лёсу, які мог бы скласціся гэтак жа ці нават яшчэ горш. Гэтым жа тлумачыцца цікавасць Галубовіча да другой падобнай постаці беларускай літаратуры — Анатоля Сыса, гэтак жа неўладкаванага ў жыцці паэта-скандаліста. Сярод „апошніх вершаў“ ёсць прысвячэнні абодвум згаданым паэтам. Паэт-бадзяга, на думку Леаніда Галубовіча, мае велізарнае багацце — волю, як унутраную, так

і вонкавую: „спіць пад сланечнікам п’яны Гаген, вуха Ван Гога слухае Баха...“. Але рэальны беларускі паэт не можа самаізалявацца ні ад побыту, ні ад палітычнай сітуацыі ў краіне. З яго душы рэдка спадае „быту млосць“, на якую наракае Галубовіч. Побыт патрабуе здабываць хаця б крыху грошай, палітычная сітуацыя вымагае выбіраць між грашыма і сумленнем.

Леанід Галубовіч шкадуе пра страчаную некалі магчымасць стаць добраахвотным выгнаннікам адусюль, „прапашчым“... Але ж і быць прапашчым чалавекам — нядобра. Вось і яшчэ адзін канфлікт. Грэх — быць „добрапарадачным“ *паэтам*, але быць „прапашчым“ *чалавекам* — таксама грэх.

У Доме літаратара ёсць бар,
У бары сядзіць Сыс,
У Сысу сядзіць чорт.
А я сяджу насупраць
У крэсле з абіўкай нашага сораму...
„Не дай Божа, каб біяграфіі паэтаў
былі цікавейшыя за іх вершы...“
У Доме літаратара ёсць бар...
“Заложнік цемры.“

Каханне творчага чалавека мае дваістую прыроду. Можна банальна абазваць гэта нябёсным і зямным каханнем. Але змешваць першае і другое ніводзін творца не жадае. І Дантэ з ягонай Бэатрычэ, і Пэтрарка з ягонай Лаурай маглі мець цалкам рэальныя цялесныя стасункі. Іх несустрэчы з каханымі часта дыктаваліся падсвядомасцю. Паэту патрэбная бесцялесная муза, недасяжная Чароўная Дама. Што не перашкаджае яму ў разгар няшчаснай жарсці бавіцца з цалкам матэрыяльнымі жанчынамі, жаніцца і мець дзеці.
Вядома, у вершах Леаніда Галубовіча прысутнічае і бесцялесная муза, абстрактны вобраз жанчыны. Але не ён цэнтральны для ягонай любоўнай лірыкі. У рэальнасці Галубовіч доўга не мог уладкаваць асабістае жыццё. Толькі пачаўшы вучобу на вышэйшых літаратурных курсах, ажаніўся з першакурсніцай-паэткай. Паэтка была з Беларусі, але пісала па-расійску. Умовай шлюбу Леанід Галубовіч паставіў, каб жонка перастала пісаць вершы, бо ўсё роўна вялікай паэткі з яе не

выйдзе. Хопіць у хаце і аднаго паэта. Ну, а калі ёй надта хочацца друкавацца — дык Галубовіч некалі таксама пісаў на расійскай мове, захавалася поўна сшыткаў з тымі паэтычнымі спробамі. Няхай яна іх бярэ і ад свайго імя друкуе. Сваёй біяграфіі Леанід Галубовіч не хавае.
Праз трынаццаць гадоў Вера Лойка, жонка Галубовіча, якая сумленна перастала „крэмзаць вершыкі“, са згоды мужа дэбютавала ў друку з апавяданнямі. Апавяданні добрыя.
У сваёй паэзіі Леанід Галубовіч робіць выбар на карысць кахання зямнога. Піша пра фізічную сувязь з канкрэтнай жанчынай, у якой угадваецца жонка. Гэта не каханне палюбоўнікаў, не выбух пачуццёвасці. Флірт, легкадумнасць, лёгкасць адносінаў у напружаным, падпарадкаваным разумоваму пачатку свеце Леаніда Галубовіча немагчымыя. Але адчуванне грахоўнасці пачуцця да жанчыны застаецца. Пераадоленне гэтага адчування і складае для яго самую існасць паэзіі. Жанчына для Галубовіча — нешта неспазнавальнае, таямнічае, застрашлівае і прыцягальнае. Ён углядаецца ў яе пільна, часам нават з нейкай падсвядомай грэблівасцю, апісвае натуралістычна — „гурбачкі грудзей“, „малаточак скроні ля прыколкі“, калені, „быццам двое кацянят“, між якімі „цень расколінкі міргне...“ Каханне — прорва, у якую прымушае кідацца жывёльная жарсць, каханне — стыхія.

Я ўвайду ў прыцягальны твой неруш —
Цёмна-страшна-глухое нутро, —
Нібы ў нетры лясныя, дзе зверу
Невядома ні зло, ні дабро...
Я ўвайду ў прыцягальны твой неруш...
“апошнія вершы...“

Натуралістычнымі падрабязнасцямі ён нібыта сцверджвае перад светам — гэта належыць мне, я маю права разглядаць і апісваць, гэта — мая жанчына.
Сцверджанасць сябе праз плоцевае, уласніцкае каханне мае вялікае значэнне для Леаніда Галубовіча. Відаць, гэта вынік доўгай неўладкаванасці, калі страчвалася надзея займець сямейны агмень.

Жыву жанчынай безгалосай.
Адно паветра з ёю п'ю.
Яна маім цяжарна лёсам.
Яе жыццё — сваім — люблю.
Ёй. „Споведзь бяссоннай душы".

Мастацтва мае сакральнае паходжанне — у яго аснове рытуал, магічны чын. Аднак чым больш мастацтва рабілася індывідуалізаваным, чым больш значэння ў ім набывала асоба аўтара, тым складаней было вызначыць у тканцы твору месца творцы — і Творцы. Тэорый мноства — ад ідэі боганатхнёнасці паэзіі, калі паэт прызнаецца толькі інструментам, больш ці менш прыдатным для ўвасаблення дадзеных згары вобразаў, да абсалютызацыі ролі чалавека-творцы.

Галубовіч не стылізуе іх пад ханжаска-клерыкальны стыль, папулярны сёння ў пэўных колах. Затое традыцыйнае для беларускай душы богашукальніцтва прымушае яго зноў і зноў вывяраць свае жыццёвыя шляхі, займацца самабічаваннем. На трынаццатым годзе шлюбу Галубовіч абвянчаўся з жонкай у касцёле — жыццёвая патрэба.

Грахоўнасць Галубовіча-чалавека абцяжарваецца грахоўнасцю яго мастацтва. Уласныя вершы здаюцца Галубовічу матэрыяльнымі — такім жа парахном, як і ўсё матэрыяльнае, зямное, эфемернае. Каб надаць СЛОВУ вечнае жыццё, трэба, каб у ім прысутнічаў Бог.

Калі страчваецца альбо не знойдзеная сувязь з Богам, чалавек думае пра смерць. Што наканавана душы пасля таго, як яна вырвецца з цялеснай абалонкі?

Шэкспіраўскі чарвяк з'еў Юлія Цэзара. Чарвяк Леаніда Галубовіча „ляжыць, галодны мною...". Праўда, Галубовіч не замыкаецца на маштабах чарвяка і чалавека, ён малюе апакаліптычную карціну „неба, што ўцягвае зямлю ў свой зорны страўнік". Паэт, як „трынаццаты апостал", дарэмна шукае сцяжыну „да Госпада свайго". Пераконвае сябе — „Бог са мной "... І канчае зборнік радкамі:

І вось тады, калі хіснешся
У цёмны бок ці ў светлы бок —
І толькі з небам застанешся,
Якраз і з'явіцца твой Бог...
Калі ўжо змогся клікаць Бога...

„апошнія вершы...“
Вершы, вынесеныя паэтам у асобны „богашукальніцкі“, ён жа заключны, раздзел кнігі, пазбаўленыя скептыцызму ці ўласцівай іншым вершам грубаватай цялеснасці. Часам яны нават сентыментальна-расчуленыя. Часам — напружаныя, трывожныя. Ужо тое, што вершы-рэфлексіі на містычную тэму вынесеныя ў заключны раздзел кнігі, сведчыць пра невыпадковасць іх з'яўлення. Можна адрачыся ад паэзіі, але дыялог з Богам, аднойчы распачаты, не можа быць спынены. Старадаўнія японскія паэты, калі дасягалі вяршыні славы, сыходзілі са сталага месца жыхарства, пакідаючы ўсю маёмасць, і пачыналі пісаць пад новым імем. Такім чынам правяралася сапраўднасць паэзіі і сапраўднасць паклікання.

Усе — апошні верш і першы —
Знямеюць...
Сціхне іх гурма...
Бо ні ўва мне самім, ні ў вершы
Ўсё ж дасканаласці няма.
...А каб напісанае сцерці
І ўсё нанова напісаць —
То трэба, перш за ўсё, памерці
І — немаўлём з магілы ўстаць...
Развітанне з кніжкай.
„Заложнік цемры“.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**

[image]

[image]
ARCHE Skaryna № 8 (13) – 2000
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]–[image]2000
[image] [image] [image] [

болей не чапаць — каб не псаваць гэтага першага ўражаньня. Бо як толькі возьмешся прыглядацца да артыкулаў з калівам увагі, ажно вока пачынае рэзаць ад шматлікіх недапрацовак, недакладнасьцяў і проста памылак (пра культуру мовы ўвогуле ня згадваю). Вока спатыкаецца яшчэ перад тым, як дойдзеш да артыкулаў: дастаткова кінуць позірк на бібліяграфічнае апісаньне ды анатацыю на адвароце тытульнага ліста, каб ужо расхацелася чытаць далей. Апісаньне не адпавядае прынятым у Беларусі нормам: 1) і на тытульным лісьце, і на вокладцы брак прозьвішча аўтара-ўкладальніка, а выданьне апісана „пад аўтарам“, і нават без кантовых дужак; 2) падзагаловак, які выдрукаваны на тытульным лісьце дастаткова вялікімі літарамі, каб ня быць незаўважаным, папросту зыгнараваны; 3) абсяг зьвестак пра рэдактуру не аддзелены касой рыскай і таму стварае ўражаньне падзагалоўка; 4) назвы замежных месцаў выданьня, якія ў апісаньні не павінны скарачацца, тут скарочаныя, і замест „Мюнхен“ мы бачым толькі „Мюн.“ — паспрабуй здагадайся, пра што гамонка — Мюнхен, Мюнстар ці, можа, Мюндэн, што ў Гановэры? Няблага — на 4 радкох ажно 4 недакладнасьці?! Пры тым, што выданьне мела адмысловага „рэдактара-бібліёграфа“! (Гл. усё той жа адварот тытульнага ліста.) Але йшчэ ня ўсё — анатацыя. Цытую: „Беларускі хрысьціянскі рух налічвае не адно стагодзьдзе“. Цікава, якую зьяву папярэдніх стагодзьдзяў (г.зн., XIX, XVIII, а мо нават XVII з XVI?) можна характарызаваць як „беларускі хрысьціянскі рух“? І ці ўзаемазамяняльныя гэта паняцьці: „беларускія рэлігійныя дзеячы“ і „беларускі хрысьціянскі рух“? Тэрмін „рэлігійны“ ахоплівае значна больш шырокі кантэкст, чым „хрысьціянскі“; дый увогуле, пры такой назьве ў кнізе мусяць быць зьмешчаныя пэрсаналіі рабінаў ды імамаў зь Беларусі, чаго, аднак, не назіраецца. Цікава таксама, чаму выданьне, якое мае ўсе рысы навукова-даведачнага (а да таго ж і ў тэксьце далейшай *Прадмовы* некалькі разоў названае даведнікам — гл. напрыклад, с.IX), адрасавана толькі „для шырокага кола чытачоў“ і на апошняй, „выдавецкай“, старонцы названа навукова-папулярным? Можа, якраз у прадбачаньні жорсткай крытыкі што да навуковасьці працы? Але, зрэшты, і навукова-папулярнае выданьне павінна абапірацца на факты і не скажаць рэчаіснасьці.

Хтосьці, магчыма, будзе наракаць, што я закідаю аўтару правіны бібліёграфа. О.К… Пяройдзем да аўтарскіх матэрыялаў. Тут памылак і недакладнасьцяў ня меней (пры некаторых пэрсаналіях, да слова, я налічваў іх часам больш за дзясятак на артыкул). Прабягуся, аднак, хуценька па самых відавочных, бо калі пералічваць і абгрунтоўваць усе, дык можа атрымацца том, таўсьцейшы за рэцэнзаваны.

Ужо на першай старонцы *Прадмовы* чытаем: „Іншыя, да прыкладу, артадаксальная каталіцкая групоўка У.Рыжага-Рыскага на эміграцыі, бачылі выйсьце ў стварэньні беларускай артадаксальнай каталіцкай Царквы-Субожні, незалежнай ад Ватыкану, а праз гэта — і ад уплыву польскага каталіцызму“ (с.VII выданьня). Я вымушаны тут закінуць аўтару ня толькі брак абазнанасьці ў элемэнтарных панятках, зьвязаных з хрысьціянскімі інстытуцыямі, але і недастаткова крытычны падыход да вывучанага матэрыялу. „Субожня“ Рыжага-Рыскага — гэта адна вялікая афёра, пакліканая задаволіць ягоныя ўласныя амбіцыі. Бачачы экумэнічныя і ўнійныя тэндэнцыі, што пашыраюцца ў сучасным сьвеце, ён вырашыў выкарыстаць іх у сваіх інтарэсах, ды яшчэ ў мэтах большае прыцягальнасьці для беларусаў-эмігрантаў падшыў гэтую ідэю патрыятычнымі лёзунгамі. Назва ягонае „царквы“ — гэта награмаджэньне словаў, якія нічога ня значаць. Калі мы кажам: „Каталіцкая Царква“, мы маем на ўвазе канкрэтны фэномэн, рэлігійную арганізацыю ўва ўсёй поўні ейнага фізычнага і містычнага быцьця; з усёй ейнай гіерархіяй, традыцыяй і дагматыкай (у т.л. першынством Рыму). Тое самае датычыць і Царквы Праваслаўнай, назву якой Рыжы-Рыскі таксама ў сваёй мяшанцы выкарыстоўваў, перарабляючы яе на заходні манер: „артадаксальная“. Ня маючы дачыненьня да гіерархіі ніводнай з названых цэркваў, ён сам абвясьціў сябе арцыбіскупам. Трэба заўважыць, што, нягледзячы на рознагалосьсе ў шэрагу пытаньняў, абедзьве названыя царквы прызнаюць адна за адной Апостальскую Пераемнасьць, якая выражаецца ў тым, што сапраўднымі лічацца толькі тыя сьвятарскія сьвячэньні, якія ўдзяліў законна пастаўлены біскуп. Сьвятарскіх сьвячэньняў Рыжаму-Рыскаму ўдзяліў пратэстанцкі пастар(!), які ня меў для гэтага аніякіх паўнамоцтваў; пра арцыбіскупскае высьвячэньне ж увогуле лепей прамаўчаць, як, зрэшты, і пра „дактрыну“, у якой намяшана ўсё, што толькі магчыма: ад тэзаў, запазычаных

у кальвіністаў ды польскіх старакатолікаў, і аж да элемэнтаў паганства. Да слова, ніжэй, ужо ў артыкуле пра Рыжага-Рыскага, сустракаюцца „пэрлы“ ня меншае „каштоўнасьці“. Цытую: „Са студзеня 1960 г. усклаў на сябе абавязкі апостальскага візытатара для беларусаў-каталікоў“. Тэрмін „апостальскі візытатар“ ужываецца на азначэньне нерэзыдэнцыйнага каталіцкага гіерарха, якому Апостальская Сталіца — то бо Рым — надала права кіраваньня памеснай Царквой. Як жа прыватная асоба можа сама ўскласьці на сябе гэтыя абавязкі? А тым болей асоба, якая ня мае правадзейных высьвячэньняў? Асоба, якая да таго ж увогуле не знаходзіцца ў еднасьці з Рымам?
Гэтаму артыкулу яшчэ шмат чаго можна закінуць, але не выдаецца слушным выдаткоўваць на вышэйменаваную асобу столькі часу ды месца. Заўважу толькі, што калі аўтар упарта хоча лічыць Рыжага-Рыскага „рэлігійным дзеячом“ — гэта ягонае аўтарскае права, але ён нясе адказнасьць за пададзеную інфармацыю і абавязаны ацэньваць яе сумленна і крытычна.

Вяртаючыся зноў да *Прадмовы*, зазначу, што яна насоўвае і шэраг іншых заўвагаў. Па-першае, пры аглядзе гістарыяграфіі пытаньня аўтар гаворыць пра постсавецкі пэрыяд фактычна толькі тое, што „ажывілася рэлігійна-выдавецкая дзейнасьць, разьвіваецца пэрыядычны друк“ (с.VIII). Між тым за апошняе дзесяцігодзьдзе зьявілася даволі шмат публікацыяў, у рознай ступені зьвязаных з тэмаю, у пэрыядычных і непэрыядычных выданьнях. Здаецца, было б усё ж варта, хай бы і вельмі коратка, пазначыць, ці ведае іх аўтар ды ці зьвяртаўся да іх, а калі не, дык чаму. Зрэшты, на том выданьня „*Памяць*“, прысьвечаны Валожынскаму раёну, ён спасылаецца — але толькі ў прыартыкульных крыніцах ды ў сьпісе пры канцы кнігі. Аднак пра тое, што некалькі артыкулаў па тэме было зьмешчана, напрыклад, у томе „*Памяці*“, прысьвечаным Браслаўскаму раёну, няма аніводнай згадкі.
Па-другое, гаворачы пра падрыхтоўку працы, аўтар зазначае, што „шырока выкарыстоўваўся вопыт аналягічных навукова-канфэсійных выданьняў (чаму ня „досьвед“? і што значыць выраз „навукова-канфэсійныя выданьні“?), якія выйшлі за апошнія 30 гадоў у Германіі…, Польшчы…, Латвіі…“. Аднак выкарыстаньне гэтага досьведу ня надта заўважна, а на дадатак

аўтар урэшце прызнаецца, што „пры напісаньні біяграфічных артыкулаў… кіраваўся мэтадычнымі прынцыпамі… даведніка „Беларускія пісьменьнікі. Бібліяграфічны слоўнік“ (с.VII–IX). Дык у чым жа гэты „вопыт“? Зрэшты, мэтадалёгія ў даведніку „*Беларускія пісьменьнікі*“ сапраўды распрацавана вельмі добра, дык тым болей незразумела, чаму аўтар не скарыстаў зь яе ў большай ступені і ня вылучыў асобна пасьля біяграмы апроч „крыніцаў“ таксама і творы апісванай асобы ды літаратуру пра яе — гэта значна ўзбагаціла б даведнік і спрасьціла карыстаньне ім. Або можна было, паводле „*Encyklopedii Katolickiej*“, на досьвед якой аўтар сярод іншых замежных даведнікаў спасылаецца (і якой, дарэчы, на момант выданьня рэцэнзаванае працы выйшла ўжо ня 2 тамы, а 6), даць асобным параграфам разгляд творчасьці асобы. Вельмі кепска, што аўтар таксама ня ведае іншых польскіх энцыкляпэдычных выданьняў (сярод іх, напрыклад, выдадзеная некалькі гадоў таму ў Кракаве „*Encyklopedia wiedzy o jezuitach*“), якія маглі б вельмі прыдацца як у сэнсе мэтадалягічным, так і фактаграфічным. Што да прыартыкульных „крыніцаў“, дык аўтар, на жаль, нават не адрозьнівае крыніцаў ад літаратуры, а мяшае ўсё ў адну кучу — такі падыход ставіць пад сумнеў ягоны прафэсіяналізм.

Па-трэцяе, шмат пытаньняў выклікаюць катэгорыі адбору пэрсаналіяў і разьбежнасьць паміж дэкляраванымі крытэрамі і прадстаўленымі пэрсаналіямі. Так, на с.IX напісана: „Пры адборы пэрсаналій да біяграфічнага разьдзела аўтар улічваў наступнае:
1) ступень заангажаванасьці асобы ў беларускі хрысьціянскі рух;
2) зьмест і характар яе нацыянальна-рэлігійнай дзейнасьці;
3) удзел у рэлігійных і культурна-грамадзкіх арганізацыях, партыях і акцыях;
4) рэдагаваньне і выданьне [па-беларуску на азначэньне гэтага працэсу ўжываецца слова „выдаваньне“] рэлігійнай пэрыёдыкі і кніг царкоўнага зьместу [*à propos*: што маецца на ўвазе пад выразам „царкоўны зьмест“?];
5) супрацоўніцтва з рэлігійным і сьвецкім пэрыядычным друкам, выдавецкімі таварыствамі і суполкамі;
6) міжканфэсійныя кантакты;

7) у выпадку духоўных асобаў — удзел у беларусізацыі рэлігійнага жыцьця вернікаў-беларусаў праваслаўнага, пратэстанцкага і каталіцкага веравызнаньняў [вельмі цікава, да якога з тых вызнаньняў аўтар аднёс згаданую „Субожню“ Рыжага-Рыскага?], пасьлядоўнае выкарыстаньне беларускай мовы ў богаслужэньнях і набажэнствах [якая, дарэчы, тэрміналягічная розьніца паміж дзьвюма апошнімі назвамі? Бо паміж „імшой“ і „літургіяй“ яна навідавоку, а вось паміж „багаслужэньнем“ і „набажэнствам“ хоць забі — ня бачу!].
Дык вось, чамусьці ў біяграфічнай частцы няма сьвятара, дзейнасьць якога адпавядала, бадай, усім гэтым крытэрам, — нябожчыка а. Яна Матусевіча. Апошнія гады ён жыў у Менску, так што сабраць матэрыялы пра яго не было б вялікай праблемай. Аднак ён не згаданы. У той ці іншай ступені датычыць гэта і такіх, напрыклад, пратэстанцкіх дзеячаў, як Э.Сабіла або Ю.Рапэцкі, якія ў дадзены даведнік не ўвайшлі „з тэхнічных прычынаў“ (с.XI), а таксама некаторых іншых. У той жа час да беларускіх дзеячаў, біяграмы каторых у даведніку прадстаўленыя, залічаюцца часам вельмі сумнеўныя постаці, як, напрыклад, біскуп Зыгмунт Лазінскі — паляк па паходжаньні і па самасьвядомасьці, які праводзіў у кіраваных ім дыяцэзіях выразную *антыбеларускую* палітыку! Будучы біскупам Менскім, ён зьбіраўся забараніць выкананьне душпастырскіх абавязкаў кс. Гадлеўскаму за сказаную ўва Ўжанцы падчас адпраўленьня там імшы казань па-беларуску. У выніку гэтага а. Гадлеўскі мусіў пераводзіцца ў Віленскую дыяцэзію ў падначаленьне да больш лібэральнага біскупа-летувіса А.Матулевіча. Ужо як біскуп Пінскі кс. Лазінскі забараняў клерыкам-беларусам Пінскае сэмінарыі чытаць „*Хрысьціянскую Думку*“, якую дасылаў туды зь Вільні кс. Адам Станкевіч. На 2-м унійным спатканьні ў Пінску ў 1931 г. той жа бск. Лазінскі галасаваў супраць прыняцьця рэзалюцыі, каб да кожнага народу (у тым ліку і да беларусаў!) сьвятары зьвярталіся ў мове гэтага народу. Ці можна пасьля ўсяго пералічанага ўважаць кс. З.Лазінскага за беларускага дзеяча? Я вельмі сумняюся…
Першы біяграфічны артыкул прысьвечаны *а. Фабіяну Абрантовічу* (с.3–4). Ужо дэфініцыйная частка змушае мяне пачаць „чапляцца да словаў“. Ці слушна ставіць у адзін шэраг і пералічваць праз коску настолькі розныя катэгарыяльна рэчы:

„… архімандрыт, місіянэр, манах-марыянін, доктар філязофіі, магістар тэалёгіі, рэлігійны і культурна-грамадзкі дзеяч…“ (с.3). Усё зьмяшана: пасада, род заняткаў, навуковая ступень, характарыстыка дзейнасьці; і як вынік — дзіўная трасянка назваў і разбудаваны да немагчымасьці чытаньня сказ. Ды каб толькі тое! „Каталіцкі сьвятар усходняга абраду…“ — якога канкрэтна? Бо ў сьвеце існуе больш за 20 усходніх абрадаў, і добрая палова з цэркваў, дзе яны ўжываюцца, знаходзіцца ў еднасьці з Рымам. Зрэшты, для Беларусі гэта можа б і сышло, бо ў нас усё ж усходнія каталікі адно бізантыйскага абраду, але калі на тытульным аркушы пазначана як месца выхаду нашае кнігі „Менск-Мюнхен“, дык трэба ўжо падыходзіць да справы з эўрапейскімі меркамі, бо ў эўрапейскай літаратуры на гэткія рэчы заўсёды зьвяртаецца ўвага. Але нават і тое, што ён быў сьвятаром усходняга абраду, таксама ня цалкам адпавядае сапраўднасьці, бо ён большую частку свайго жыцьця належаў да абраду лацінскага, а ўсходні прыняў толькі з прычыны накіраваньня ў Харбін на місію да расейцаў (першую сваю бізантыйскую літургію ён адслужыў за чатыры месяцы перад ад'ездам).

Але іду далей: „…доктар філязофіі, магістар тэалёгіі…“ — вядома ж, немагчыма атрымаць доктарскую ступень, ня маючы магістрату, а як ён сьвятар, дык ужо напэўна рабіў магістрат з тэалёгіі — нашто тады паўтарацца? Альбо, калі ўжо так карціць папералічваць болей тытулаў, дык трэба было тады ўзгадаць і тое, што ён атрымаў і ступень кандыдата багаслоўя ў Санкт-Пецярбурскай Каталіцкай Акадэміі. „…тэарэтык… беларускага вуніяцтва“. У якой канкрэтна працы ён будаваў тэорыю беларускага ўніяцтва? Я, напрыклад, такое працы ня ведаю і, больш таго, перакананы, што а. Абрантовіч напэўна тэарэтыкам беларускага ўніяцтва ня быў. І, дарэчы, што канкрэтна ён зрабіў для грэка-каталіцкае царквы ў Беларусі? Ну і нарэшце, а. Фабіян Абрантовіч быў арыштаваны не „савецкімі органамі бясьпекі“, а немцамі — пры спробе нелегальнага пераходу мяжы — і толькі пасьля быў выдадзены бальшавікам. *А. Канстанцін Маскалік* (с.115). Пры ўсёй маёй павазе да а. Кастуся не магу згадзіцца, у прыватнасьці, з тым, што ён названы ў дэфініцыйнай частцы публіцыстам. Уся ягоная дзейнасьць на *Radio Vaticana* заключалася ў дыктарскай працы

ды зрэдчасу ў перакладаньні афіцыйных матэрыялаў з італьянскай мовы на беларускую. Рыхтуючы газэту „Źnič“, ён; выконваў толькі тэхнічныя працы і не напісаў аніводнага артыкулу — дык пра якую публіцыстычную дзейнасьць гамонка? Багата ў біяграме і іншых „ляпаў“. У 1945 г. ён скончыў школу падафіцэраў, што не адзначана. Ён не „пачаў вучобу ў мясцовым [г.зн., рымскім?!] калегіюме“ ў 1947 г., а паступіў у Грэгарыянскі ўнівэрсытэт (*Gregorianum*) і жыў падчас вучобы ў *Collegium Russicum* — студэнцкім інтэрнаце для клерыкаў, рыхтаваных з разьлікам на працу ў Расеі (да слова, памылка з калегіюмамі для рымскіх клерыкаў праходзіць чырвонай ніткай празь вялікую колькасьць біяграмаў). Ён не „падтрымліваў цесныя кантакты зь вядомым сьвятаром П.Татарыновічам“, а працаваў пад ягоным непасрэдным кіраўніцтвам на *Radio Vaticana*. Урэшце, біяграма заканчваецца сказам пра ягоную дзейнасьць на гэтым Радыё, але не згадана, што ён там працаваў толькі да сярэдзіны 80-х; пра далейшае ж ягонае жыцьцё і працу ў Каталіцкіх Місіях у Лёндане ды Парыжы таксама няма ні слова.

Кс. Уладзіслаў Чарняўскі (с.213). Гэтым разам памылак крыху меней, але затое якія! „Пасьвячэны ў сьвятары 24.9.1953(?)“, але „напрыканцы кастрычніка 1944 г. адправіў першую сьвятую мшу ў Крэве“! І далей: „Адпраўляў набажэнствы і адначасова вучыўся ў духоўнай каталіцкай сэмінарыі“. Як ён мог выконваць абавязкі сьвятара ў Каталіцкай Царкве, ня маючы высьвячэньняў, для мяне застаецца тайніцай. І тут аўтара не апраўдвае тое, што пасьля даты сьвячэньняў стаіць маленькі пытальнік — пытальнікі ставяцца, калі аўтар ня мае магчымасьці ўдакладніць інфармацыю. Тут жа ў самім артыкуле напісана, што а. Уладзіслаў „выконвае сьвятарскія абавязкі ў Беларусі ў мястэчку Вішнева Валожынскага раёна“. Можна было б зьезьдзіць — не далёкі жа сьвет! — ці хаця б напісаць. Найболей уражвае тое, што не сказана галоўнага пра беларускую дзейнасьць кс. Чарняўскага — што, напрыклад, яшчэ ў 1968 годзе а. Уладзіслаў напісаў адкрыты ліст да польскага япіскапату ў абарону беларускасьці Каталіцкае Царквы ў Беларусі, або што ён перакладчык Старога Тэстамэнту на беларускую мову (значная частка ягонага перакладу, як даходзяць чуткі, ужо „вісіць“ у Інтэрнэце, а „*Кніга Роду*“ апублікавана нават друкам).

З увагі на аб'ём часопіса я разгледзеў тутака толькі тры артыкулы. Але я сьвядома выбіраў іх з пачатку, сярэдзіны і канца біяграфічнага разьдзелу, каб паказаць, што ўся даведачная частка прасякнутая фактаграфічнымі і тэрміналягічнымі памылкамі наскрозь.
Мушу таксама „прайсьціся з частым грэбнем" па кампазыцыйных характарыстыках выданьня. Кнізе яўна бракавала добрага рэдактара, які б давёў яе да ладу. Структура, напрыклад, для мяне абсалютна незразумелая. Ці сапраўды варта было зьмешваць матэрыялы, якія настолькі розьняцца па сваім характары — энцыкляпэдычныя біяграмы, публіцыстыку, дакумэнты? Ствараецца ўражаньне, што гэта зроблена толькі з увагі на аб'ём — так бы мовіць, „дзеля таўшчыні тому". Напэўна, было б лепей зрабіць з гэтага ўсяго дзьве асобныя кнігі — хай сабе і значна танчэйшыя, ці прынамсі (што, зрэшты, мне таксама ня надта падабаецца) два тамы аднаго выданьня. У адной кнізе трэ было б даць пэрсаналіі з дадаткам статыстычных і дакумэнтальных матэрыялаў, у другім жа — той перадрук публікацыяў з эмігранцкае і заходнебеларускае пэрыёдыкі, што запаўняе сабой увесь другі разьдзел. Першая кніга тады была б выразна навукова-даведачнай, другая ж — хутчэй папулярнай.
Да таго ж, што да трэцяга разьдзелу выданьня, дык ён перапоўнены аднатыпнымі факсыміле выпісаў з мэтрыкаў, пасьведчаньняў і г.д. Тут ужо трэба было або абмежавацца ўзорнай ілюстрацыяй аднаго дакумэнту пэўнага тыпу, або публікаваць дакумэнты, датычныя ўсіх сьвятароў (што, зрэшты, павінна было б выліцца ў шматтомнае выданьне, але, прынамсі, зрабіла б дакумэнты даступнымі для навуковай працы). Той жа варыянт, які мы маем зараз, на жаль, ізноў выклікае думку аб жаданьні аўтара „і рыбку злавіць, і ног не замачыць".
Дзіўныя рэчы адбываюцца з прыартыкульнымі фатаграфіямі асобаў. Аўтар парупіўся знайсьці здымкі памерлых дзеячаў, але партрэты шэрагу тых, што яшчэ жывуць і чые фатакарткі здабыць зараз — невялікая праца, чамусьці ў кнізе адсутнічаюць, як, напр., а. С.Жалезьняковіча (с.71), а. Р.Сасны (с.175), кс. Ул.Чарняўскага (с.213). Прычым гэта не праява аўтарскай пазыцыі — не падаваць партрэтаў жывых асобаў —

бо шмат зь іх (напр., кс. Завальнюка — с.77, М.Матрунчыка — с.118 і інш.) усё-ткі апублікавана. Няўжо б тыя, „беспартрэтныя“, адмовілі б пераслаць якую-небудзь фатаграфію, калі б аўтар зь імі скантактаваўся? Дый, зноўкі, і жывуць яны недалёка — хто ў Польшчы, хто ў Беларусі — няцяжка зьезьдзіць, бо не Амэрыка ўсё ж. Іншая прэтэнзія да партрэтаў — крытэр адбору. Здаецца, было б слушней даваць здымкі ў тым веку, у якім чалавек болей зрабіў, або ў якім ягоны твар найболей пазнавальны. Тут жа побач зь біяграмамі шэрагу асобаў пададзены іхныя фатаграфіі ў „сэмінарыйным веку“, што неяк не стасуецца з доўгім пералікам імі зробленага. Растлумачыць гэта недаступнасьцю пазьнейшых здымкаў таксама ня надта выпадае, асабліва ў выпадку, напр., такіх асобаў, як кс. Казімер Кулак (с.94) або а. Аляксандар Надсан (с.129).

Відавочна, што аўтар выдаткаваў (так і карціць напісаць „змарнаваў“, але гэта, бадай, было б замоцна сказана) колькі год карпатлівай працы, каб сабраць і сыстэматызаваць такі вялікі па аб’ёме фактаграфічны матэрыял, разабрацца ў літаратуры прадмету, сабраць дакумэнты. Шкода, аднак, што ён не паклаў яшчэ пару год, каб усё гэта належным чынам апрацаваць ды звэрыфікаваць, як гэта выпадае зрабіць дбайнаму дасьледчыку. Бо ў выніку даведнік атрымаўся ня надта прыдатны нават „для шырокага кола чытачоў“, ня кажучы ўжо пра навукоўцаў ды выкладчыкаў, якія перадусім маюць патрэбу ў такім выданьні. Увогуле, падсумаваць усё вышэй сказанае мне хацелася б словамі, якімі ахарактарызаваў пару стагодзьдзяў таму вядомую працу Каратаева расейскі навуковец — І.А.Бычкоў. Ён піша, што аўтар бібліяграфіі старадрукаў „довольно много поработалъ при его (*Описанія славяно-русскихъ книгъ*) составленіи; но, къ сожалѣнію, трудъ этотъ выполненъ не съ тою добросовѣстностью и тщательностію, какія необходимы въ подобнаго рода работахъ; въ немъ встречается много такихъ ошибокъ и недостатковъ, которые лишаютъ его значенія вѣрного руководителя въ историко-литературныхъ занятіяхъ“ (Цыт. паводле: Владимировъ П.В. Доктор Франциск Скорина. (Спб), 1888. с.XXVI.). Шкода таксама, што дактары навук Ул.Конан і А.Мальдзіс, імёны якіх, як сяброў Навукова-Рэдакцыйнае Рады, значацца ў кнізе, у адрозьненьне ад свайго расейскага калегі,

не паставіліся належным чынам да сваіх абавязкаў (можа, прывычка быць „вясельнымі генэраламі“ прывучае думаць пра свой навуковы аўтарытэт як пра нешта незварушнае і непрамінучае?).
Напрыканцы артыкулу мушу прызнаць, што нягледзячы на ўсе хібы каратаеўскага „Описанія“, да ягонае бібліяграфіі дасьледчыкі зьвяртаюцца дагэтуль. Мабыць, так жа будзе і з рэцэнзаванай кнігай, балазе, пакуль нічога больш сур’ёзна і прафэсійна падрыхтаванага мы ня маем. Але хацелася б, вядома, каб хутчэй ужо яно зьявілася…

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**
[image]

Надзея Садзікава

Паталёгіі рэалізму

…Рэальнасьць для сучаснага чалавека — матэрык, усё менш і менш наведваны і, дарэчы, заслужана нелюбімы.
Мілан Кундэра,
раман „Бясьсьмяротнасьць“

Чытач патрабуе. Пісьменьнік абавязаны даць.
Чытач прагне крыві, эротыкі, гісторый пра карупцыю і вычварэнцаў, узьнёслых словаў і мардабою. Пісьменьнік адказвае адпаведнымі творамі, якія ўсё далей і далей адсоўваюцца ад рэальнага жыцьця.
Надыходзіць момант, калі ў паветры павісае пытаньне: у якой ступені наагул патрэбны рэалізм?

1.
Не адышлі яшчэ ў мінулае спрэчкі паміж двума гігантамі і валадарамі чалавечага розуму на літаратурных абшарах — рэалізмам і мадэрнізмам, а ўжо зьявіліся новыя героі. Самыя патрабавальныя крытыкі вымушаны зазначыць відавочную хісткасьць межаў і эстэтычных прыкмет розных стыляў і накірункаў у мастацтве. Нават такі мадэрнісцкі мастацкі прыём, як „плынь сьвядомасьці“, ужо больш не выключна

ўласьцівы мадэрнізму. Памнажэньне новых формаў і перайманьне карыснага з мастацкага арсэналу розных накірункаў у 50–70 гады XX стагодзьдзя прывяло да страты рэалізмам былой чысьціні сродкаў мастацкага выражэньня. Чыньнікаў гэтага працэсу было шмат, у тым ліку й тое, што пісьменьнікі сьвету страчвалі здольнасьць старымі сродкамі адлюстроўваць „глыбіні заканамернасьцяў бягучай рэчаіснасьці“. Супрацьстаяньне і падзел мастацтва на накірункі пачаў зьнікаць.

Золак XXI стагодзьдзя адзначаны надыходам новай „новай хвалі“. Чытэльная (папулярная) *сучасная* літаратура стала іншай.

І асноўны сэнс гэтай новай рэальнасьці пралягае не на звыклых паралелях пошуку формаў, ён паўстае з паралелі, якая адсякае галаву чытаючага суб’екта ад яго тулава, ад его страўніка, ад яго ног, ад зямлі…

Аб тым, што рэчаіснасьць цалкам адлюстраваць немагчыма, вядома ўжо даўно, і ня толькі пісьменьнікам. Паспрабуй апісаць ня самае складанае — наведваньне якога бутыку і купляньне простай майкі па цане, роўнай цане пятнаццаці маек у звычайнай краме. І адразу зразумееш — ня так усё проста ў нашым жыцьці. А калі прыгледзецца больш уважліва, дык зразумееш, што *a priori* зразумелых рэчаў засталося ня так і многа. У філязофскім сэнсе можна зазначыць, што аб’ектыўна рэальнай („правільнай“) рэальнасьці да агіднага мала.

У адной краіне, у адным і тым жа горадзе і доме, у той самы час людзі ўспрымаюць навакольную дзейснасьць ня проста парознаму, а супрацьлегла. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова апынуцца ў „не сваёй“ рэфэрэнтнай групе. Адразу ўзьнікае шмат нечаканых пытаньняў.

„Не жыву, а мучуся“, — даверліва паведамляе немаладой жанчыне сівы дзядзька. А побач маладзён: „Думаю, як бы ўкрасьці, бо так не пражыць“. Наступны кажа: „Узяў шклопакетаў на сем штук баксаў“. А сусед яму: „Жонка толькі сына ў школу — і адразу ў Інтэрнэт“. А бабуля насупраць: „Гэта ж усё надвор’е гэтае праклятае. А ЯМУ ж так цяжка, так цяжка. Я ўчора як у тэлевізары бачыла, дык плакала. А апазыцыя зноў будзе зра аплёўваць“.

Найбольш адчувальны да зьменаў у паветры крымінальны

элемэнт дакладна акрэсьліў месца рэчаіснасьці ў жыцьці. Рэальна зараз можна толькі „трапіць на бабкі“. Усё астатняе — суб’ектыўна, а значыць, нерэальна.
Па сутнасьці, спосаб успрыманьня рэчаіснасьці — гэта і ёсьць тое, што аб’ядноўвае сучасных людзей у суполкі, групоўкі й зьвязы.

2.
А што ж на ўзроўні літаратуры? Тутака ўсё яшчэ больш заблытана. Палюбоўна разышліся толькі пэрыядычныя выданьні. Спрошчана кажучы, будаўнікам першых пяцігодак — „Народную Газету“, вясковай інтэлігенцыі — „Звязду“, нацыяналістам — „Нашу Свабоду“. Падзяліць мастацкую літаратуру, кіруючыся прынцыпам: кожнаму сваю рэчаіснасьць — аказалася немагчымым. Абазначыўся парадокс. Незалежна ад матэрыяльнага статусу, наяўнасьці ў сям’і рэпрэсаваных грамадзян і герояў сацыялістычнай працы, а таксама „чыста рэальных“ элемэнтаў кола найбольш папулярнай літаратуры апынулася ўва ўсіх сацыяльных праслойках прыкладна адным і тым жа. Жанчыны з задавальненьнем чытаюць А.Марыніну, С.Шэлдана, Б.Картленд. Мужчыны з асалодай паглынаюць кнігу за кнігай пра „Сьляпога“ і „Шалёнага“. Студэнты адгароджваюцца ад сьвету фантастыкай альбо яе больш вытанчанай адменай — клясыкай. Тонкая праслойка інтэлігенцыі (таксама рознага матэрыяльнага статусу) захапляецца „містыкай“, псыхалёгіяй альбо чымсьці кшталту „Жыцьця самурая“ і „Хазарскага слоўніка“.
Калі прыгледзецца да пададзенага вышэй спрошчанага пераліку папулярнай літаратуры, няўзброеным вокам відаць, што творы гэтыя ўсе звышнерэалістычныя — сапраўды „віртуальныя“. *Відавочная ж іх папулярнасьць сьведчыць толькі пра тое, што сучасны чалавек імкнецца пагрузіцца ў „другую“ рэальнасьць, і чым глыбей, тым лепей.*

3.
Пасьпяховае стварэньне „свайго сьвету“ на старонках

літаратурнага твору ўва ўсе часы было атрыбутам „якаснай“ літаратуры. Але чытач успрымаў „свой сьвет“ як такі, што існуе ці існаваў дзесьці некалі ці магчымы пры некаторых абставінах. Гісторыі пра зьнесеную ветрам цывілізацыю М.Мітчэл, пра скошаны, як каласы пад сярпом, сьвет „рыцараў і загадкавых дам“ У.Караткевіча, пра ўзьняты зь нябыту востраў Крым В.Аксёнава — літаратура такога кшталту.

У адрозьненьне ад іх творы, на якія цяпер назіраецца сапраўдны чытацкі бум, не пакідаюць у чытача пэўнасьці ў існаваньні такіх герояў і такіх абставін. І калі жанчыны і заліваюцца сьлязьмі ад „мыльнякоў“, калі яны і захапляюцца спн.Каменскай з дэтэктыўнага сэрыялу Марынінай, усё роўна не пакідае ўражаньне, што робяць яны ўсё гэта неяк ненатуральна і нейкая частка падсьвядомасьці вельмі цьвяроза тлумачыць вышэйшым мазгавым цэнтрам: „Так, гэта казка, але яна патрэбная табе. Ну, яшчэ крышачку праглынем і пойдзем жыць у рэальнасьці далей“.

Майстры слова, што спрадвеку будавалі „свой сьвет“ у літаратуры, карыстаючыся ня толькі дакладнымі вобразамі матэрыяльных рэчаў, але ў вялікай ступені — цікавымі абагульненьнямі, парадаксальнымі высновамі, нечаканай і непаўторнай інтэрпрэтацыяй падзей, насяляюць сучасную „віртуальную“ літаратуру нерэальнымі пэрсанажамі, якія дзейнічаюць у нерэальных абставінах і зьдзяйсьняюць немагчымыя ўчынкі. На гэтым прынцыпе пабудаваны амаль што ўсе „жаночыя“ любоўныя раманы і сучасныя дэтэктывы. Людзі рознага сацыяльнага статусу і ў розных краінах уцякаюць у віртуальныя абшары ня толькі Інтэрнэту, але і літаратуры, TV і какаінавых кушчаў. Сацыяльныя вытокі попыту на „іншую рэальнасьць“ (галеча, эканамічны заняпад) відавочныя, і мы ня будзем засяроджвацца на іх, бо гэта кожны дзень робяць радыё й TV. Але існуюць і іншыя. Сацыёлягі адзначаюць, што чалавек няўхільна „сыходзіць з рэальнасьці“ — і з гэтым зьвязаная празьмерная залежнасьць ад тэлевізіі. Людзі як бы „шостым пачуцьцём“ вызначаюць хісткасьць „рэальнай“ рэчаіснасьці і даволі балюча рэагуюць на яе. Экранная жа рэальнасьць здаецца ім больш зразумелай і больш пасьлядоўнай.

Але і тут у „попыце“ адбываюцца зьмены. Людзям усё больш *патрэбны творы ня проста максымальна „віртуалізаваныя“, але*

тыя, што абмяркоўвалі б з чытачом ці гледачом сваю ўласную і жыцьця наагул „віртуальнасьць“.
Аб тым, што „страта пачуцьця рэальнасьці“ — сацыяльны фэномэн і людзі жадаюць, каб зь імі пра гэта размаўлялі, сьведчаць, напрыклад, шумныя камэрцыйныя посьпехі стужкі „Матрыца“ братоў Энды і Лары Вачоўскіх, праекту „Догма“ Ларса фон Трыера і іншых дацкіх рэжысэраў, апошнія раманы Віктара Пялевіна, раман Мішэля Ульбэка „Элемэнтарныя часьцінкі“, стужка „Шчасьце“ амэрыканскага рэжысэра Тода Солондца.
Стужка „Матрыца“, „віртуалізаваны“ доказ нерэальнасьці звыклага для чалавека сьвету, складае супрацьлегласьць „Догме “, у якой праз адмаўленьне актораў ад грыму і прафэсійных кінакамэраў ідзе пошук ці доказ існуючай рэальнасьці.
Стужка „Шчасьце“, паказаная на леташнім Маскоўскім кінафэстывалі, прыцягнула ўвагу ня толькі сваёй тэмай („адчуваньне тупіка, гідкасьці навакольнага асяродзьдзя“), але і тым, што амаль паўтарыла сюжэтныя ходы раману Мішэля Ульбэка „Элемэнтарныя часьцінкі“. І гэта пры тым, што стваральнікі ня ведалі пра існаваньне адзін аднаго.
Раман Мішэля Ульбэка „Элемэнтарныя часьцінкі“ выйшаў у 1998 годзе ў Францыі і меў ня проста камэрцыйны і інтэлектуальны посьпех, а выклікаў сапраўдны бум. Замежная крытыка пісала аб рамане „Элемэнтарныя часьцінкі“, што „ягоны посьпех заснаваны не на літаратурнай навізьне. Гэта даволі традыцыйная проза, але яна *пра „гэта“ — страту пачуцьця рэальнасьці.* Пра тое, што кожны адчуваў сам у сабе, адчуваў і лічыў сябе ненармальным і непаўнавартасным… адзіным, хто не ўсьміхаецца ўва ўсім парыскім натоўпе. Прачытаў і зразумеў, што ён не самотны…“

4.
Разглядаючы пытаньне, як і чаму зьмяняецца сучасны чалавек, як ён шукае прытулку ў навакольным жыцьці, нельга не зазначыць, што ня толькі шэраг прычынаў, якія ўмоўна можна назваць „сусьветным прагрэсам“, нішчаць старую мэнтальнасьць, але й зьмены ў мэнтальнасьці людзей, у сваю

чаргу, разбураюць „стары“ парадак сьвету і падштурхоўваюць навуковы ці сусьветна-сацыяльны прагрэс. *Таму на „віртуальных“ абшарах рэальнасьці TV і літаратуры цяпер адбываюцца вельмі сур'ёзныя працэсы. Менавіта на іх ствараецца „рэальнае жыцьцё“.* Наша з вамі жыцьцё. Іншымі словамі, *узрослая ў апошні час значнасьць і прыцягальнасьць „віртуальнага сьвету“ прывяла да таго, што ён моцна ўплывае на рэальнасьць, якая пачынае ня толькі здавацца, але й існаваць такой, якой яе бачыць большасьць*.
У якасьці прыкладу ўзгадваюцца словы аднаго расейскага псыхоляга (таксама „новай хвалі“) аб тым, што расейскі рубель будзе *заставацца* „драўляным“ і ня вылузаецца з інфляцыі да таго часу, пакуль большасьць насельніцтва будзе *лічыць* яго „драўляным“.
Фэномэн новай паралельнай рэальнасьці, якую ствараюць інфармацыйныя струмені Інтэрнэту и TV, і ўзьнікненьне з гэтай прычыны складанасьцяў з „адчуваньнем рэальнасьці“ (або „пачуцьцём жыцьця“) у сучаснага чалавека ўсё часьцей называюць як прычыну росту нематываванай жорсткасьці, наркаманіі, алькагалізму й іншых знаёмых праблемаў. Знаёмых і нам, беларусам, хоць наша краіна быццам бы і рухаецца „сваім“ кірункам. *На самой справе, кірунак у інфармацыйна-інтэграваным сьвеце ўва ўсіх адзін, і памыляцца наконт гэтага ня варта.*

5.
Можа так здарыцца, што пісьменьнік, імкнучыся толькі да самарэалізацыі празь літаратурны твор, міжволі аказваецца „цаглінай і шрубкаю“ вялізнага і страшнага будынку „віртуальнай“ рэчаіснасьці.
Красамоўным прыкладам і зрэзам літаратурнага жыцьця стаў нумар часопіса „ARCHE“ „Паталёгіі грамадзтва“. У нумары прадстаўлены два мэмуарна-дакумэнтальныя творы і некалькі мастацкіх апавяданьняў пісьменьнікаў розных пакаленьняў. Да таго ж, сама тэма паталёгіі надзвычай удзячная для таго, хто ўзяўся разьмяжоўваць сапраўднае і штучнае, рэальнае і „віртуальнае“.
„Бронікі, альбо Навэля пра каня“ Вячаслава Адамчыка — удалы

прыклад знаёмай і трывалай рэалістычнай прозы, па-мастацку выверанай і грунтоўнай. Але ў рэчышчы нашай размовы прыцягвае ўвагу іншае. Раптам сярод апавяданьня ўзьнікае пытаньне: „Дзе гэта ўсё здараецца? Хто гэтыя людзі?“ Рэалістычная проза пачынае пакідаць уражаньне лістоў ці хронік з Марсу. Чаму гэта адбываецца? Відавочна, таму, што пачуцьці адмаўляюцца зноў адгукацца і рэагаваць пэўным чынам на жорсткасьці вайны. Ейныя „паталёгіі“ здаюцца ўжо не такімі паталягічнымі, як сучаснае жыцьцё, а жахі — ужо не такімі жахлівымі. Клясычны рэалізм — гатунак фантастыкі. Сівы неадукаваны беларус у „шарачковых портках з латкамі на каленях“, вобраз якога столькі разоў адбіваўся ў нашай сьвядомасьці і *павінен* быў выклікаць *адпаведныя* эмоцыі… Хто ён зараз? Ён — Бэтмэн нашага мастацтва, асоба, здаецца, менш рэалістычная за якога-небудзь Дамавіка Ненатольнага. Стваральнік Дамавіка *Адам Глёбус* прадстаўлены ў рубрыцы „Аўтапартрэты“ навэляй *„Выдавец“*. Упэўнена можна сьцьвярджаць, што гэтая навэля мае найпростае дачыненьне да сучаснай „віртуалізаванай літаратуры“, што, без сумневу, вельмі радасна. Як ні дзіўна, усе пададзеныя аўтарам пэрсанажы, пры іх спрэчным існаваньні насамрэч, пакідаюць пачуцьцё сапраўднай рэальнасьці. Усе гэтыя „дамавікі“ — сэксуальна незадаволеныя і прагныя грошай паўдуркі-аўтары, сквапны злыдзень-выдавец — гэта асобы, якія існуюць і не існуюць адначасна. Яны — нашы добрыя знаёмыя, мутанты, узьніклыя як вынік спалучэньня ўціску грамадзтва і ўзьлёту прыватнай сьвядомасьці. Яны — сон розуму і знакавыя пэрсанажы нашага часу.

А зараз зьвернемся да іншых аўтапартрэтаў. Дакумэнтальна-мастацкае апавяданьне *„Вясельле на хутары“ Алеся Кавальчука і „Чарнавікі“ Славаміра Адамовіча* аб’ядноўвае тое, што яны створаныя на падставе рэальных падзей. Аўтары не зьмянялі ні імёнаў, ні прозьвішчаў герояў. Яны будавалі „свой сьвет“ з фактаў сапраўднага жыцьця.

Атрымаўся парадокс. „Праўда жыцьця“ зь „Вясельля на хутары“ зрабілася падманам і не ператварылася ў літаратуру. А падман, альбо міт, у мэмуарах сп. Адамовіча не зрабіўся „праўдай жыцьця“.

Як здарылася, што „Вясельле на хутары“ з дакумэнтальнымі партрэтамі знаёмых і, магчыма, цалкам праўдзівымі дыялёгамі

не пакідае пачуцьця „пазнаваньня“ і „сапраўднасьці“? Зразумела, мастацкія недахопы, нуднае чытаньне і г.д. Але што гэта значыць?

Вось героі бясконца п’юць гарэлку, шалёна радуюцца, што знайшлі пачак „Космасу“. А вось гаспадар хутару выграбае з падпечча дзесяць вёдраў птушынага гаўна… Ці было гэта на самой справе? Цалкам верагодна, што было.

Вось кампанія, анансаваная як літаратурная й нацыянальная эліта, ніводнага слова ня кажучы пра літаратуру, абмяркоўвае польскія кірмашы, дзяльбу кватэраў у Саюзе пісьменьнікаў, сэксуальныя вычварэньні блакітных у прыбіральнях Камароўскага рынку. Было? Цалкам верагодна, што было. Але па-ранейшаму хочацца сказаць: усё адно не падобна! А значыць, і не было. Па-першае, сьвядомасьць адмаўляецца ідэнтыфікаваць гэтае кола асобаў з элітай. А па-другое, міжволі насоўваецца думка, што пісьменьнік не зацікавіў і не пераканаў аўдыторыі таму, што ніякімі сродкамі не стварыў чытачу *новай, асабістай рэальнасьці*. А рэальнасьць гэтая тчэцца ня толькі з пляшак, утульных матрасаў і старых „пазікаў“, але і з абагульненьняў і высноваў.

Чытач патрабуе. Пісьменьнік абавязаны даць. Павінны быць узьнёслыя словы, жарты, рыцары нацыянальнага адраджэньня і каханкі, каханкі… „Іх ёсьць у мяне“ — адказаў Славамір Адамовіч. „Чарнавікі“ — працяг даволі ўдалай спробы стварэньня вобразу плейбоя, гэтым разам на падставе пададзенай у „адпаведным сьвятле“ анталёгіі ўласнага інтымнага жыцьця. Зьмяшчэньне твору на старонках часопіса, прысьвечанага паталёгіям, тлумачыцца, відавочна, тым, што аўтар зь нейкай прычыны не абцяжарваў сябе пошукамі псэўданімаў для апісаных ім жанчын. Голая праўда мусіла дадаць твору вагі. Але нельга ўтрымацца і не заўважыць, што „паўната вобразу“, тым ня менш, была трошкі сапсаваная. Сапраўднай „віртуалізацыі“ пашкодзіла псэўдадакумэнталізаванасьць. Цытаваньне зь лістоў каханак фразаў кшталту „*ты не имеешь права играть в этой стране роль эмоционального стимула*“ характэрнае, хутчэй, для няўпэўненых у сабе мужчын. Плейбоі ж, наадварот, павінны ведаць, што *ўсе* каханкі і *заўсёды* ў пэўны пэрыяд адносін пішуць тое, што хочуць прачытаць на другім баку. Але што яны пішуць потым… Урэшце, плейбоі не павінны пакідаць у

жаночай часткі аўдыторыі ўражаньня, што „пасьля пятага заходу“ жанчына ўсё ж засталася незадаволенаю. Міт павінен быць мітам. Толькі тады ён — „праўда жыцьця“.
Паняцьці „веру — ня веру“ ў дачыненьні да мастацкага твору апошнім часам пахіснуліся. Чытач, як і ў любую эпоху пераменаў у масавай сьвядомасьці, пачынае ня верыць у тое, у што яму спрадвеку верылася, і, наадварот, прагне і з задавальненьнем спажывае тое, што ляжыць недзе паміж рознымі рэальнасьцямі жыцьця, паміж ягонай і аўтарскай фантазіяй, паміж небам і зямлёй. З дапамогай сродкаў масавай інфармацыі і літаратуры чытач прымярае да сябе розныя бакі рэчаіснасьці, як розныя апраткі. Ен думае, кім яму быць: Бэтмэнам ці Дамавіком, Братам-2 ці Кінг-Конгам-3.
І калі раптам дапусьціць, што асноўнымі прасторавымі і матэрыяльнымі катэгорыямі сучаснай беларускай літаратуры будуць заставацца вёдры птушынага гаўна, а часавымі — пахмельныя раніцы беларускай інтэлігенцыі, застаецца ня выключанай магчымасьць бясконцага адбіваньня гэтых архетыпаў на нашым сапраўдным жыцьці. Пэрспэктыва, згадзіцеся, жахлівая.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 8 (13) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**
[image]

Віктар Гарабец

Вайна — вядомая й невядомая

Манаграфія беларускага гісторыка Генадзя Сагановіча пабачыла сьвет у выдавецтве „Навука і тэхніка“ як выданьне навукова-папулярнае. Аднак, як сьведчыць практыка, падзел працаў на „навуковыя“ і „навукова-папулярныя“ ў гістарычнай навуцы досыць умоўны і часьцяком не паказвае на меншую ці большую навуковую вартасьць, а вызначаецца нечым іншым, напрыклад, сьціпласьцю аўтараў альбо — наадварот — яе адсутнасьцю. У дадзеным выпадку, відаць, акурат сьціпласьць прымусіла сп. Сагановіча назваць „навукова-папулярнай“ сваю манаграфію, якая мае ўсе неабходныя элемэнты навуковай працы. А можа, аўтар пакінуў сабе магчымасьць вярнуцца да тэмы, каб дапрацаваць яе з выкарыстаньнем арыгінальных архіўных матэрыялаў: манаграфія грунтуецца толькі на зьвестках, пададзеных у апублікаваных гістарычных крыніцах. Аб’ектам дасьледаваньня сп.Сагановіча сталіся падзеі расейска-польскай вайны 1654–1667 гадоў, што разгортваліся на беларускіх землях. Аднак, нягледзячы на рэгіянальную скіраванасьць працы, яна, несумненна, зацікавіць і ўкраінскага чытача, прынамсі зь некалькіх прычын. Па-першае, гэтая вайна

была справакаваная падзеямі ўва Ўкраіне, па-другое, украінскія казацкія войскі бралі ў ёй актыўны ўдзел, і, па-трэцяе, ход баявых дзеянняў у Беларусі істотна ўплываў на ўкраінскія справы. Акрамя таго, падрыхтаванаму чытачу, які ўжо меў магчымасць азнаёміцца з дадзенай праблемай у інтэрпрэтацыях прадстаўнікоў розных школ і напрамкаў, у гістарыяграфіях украінскай, польскай ды расейскай, будзе цікава зірнуць на яе „беларускімі вачыма“, вачыма тых, хто воляй лёсу стаўся, так бы мовіць, „аб’ектам“ прыкладаньня мілітарных намаганьняў перапоўненых пасіянарным запалам суседзяў.

Трэба адзначыць, што ў савецкія часы беларуская гістарыяграфія ў асноўнай сваёй масе тыражавала пастуляты афіцыйнай гістарычнай навукі, прычым часта рабіла гэта ў надзвычай гіпэртрафаваным, а таму — даволі гратэскавым выглядзе. Чаго, напрыклад, вартая канцэпцыя Л.Абэцэдарскага, які разглядаў расейскую экспансію на беларускія землі скрозь прызму *спрадвечнага імкненьня беларускага народу да ўзьяднаньня з братнім расейскім народам*, а актыўнасьць казакоў на Беларусі матываваў памкненьнямі ўкраінскай старшыны ўсталяваць на тэрыторыі Паўднёва-Ўсходняй Беларусі *фэўдальна-прыгоньніцкія парадкі*. Толькі з пачаткам 90-х гадоў, дзякуючы намаганьням М.Ткачова, В.Мялешкі, Г.Сагановіча і іншых, пазначылася выразная тэндэнцыя да перагляду ўсталяваных стэрэатыпаў.

Таму ня дзіўна, што ў рэцэнзаванай працы сп.Сагановіч падыходзіць да асьвятленьня вайны не з параднага боку — як да спосабу рэалізацыі „спрадвечнай мары“ беларусаў, якія нібыта бачылі ў падпарадкаваньні цару *адзіна магчымы рэальны шлях свайго вызваленьня ад нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту*, а з пункту гледжаньня цалкам прыроднага, гуманістычнага, агучанага ў свой час яшчэ Плютархам: *Вайна — зло…* Нездарма ж эпіграфам да ўступнай часткі кнігі беларускі дасьледчык абірае красамоўныя словы сучасьніка падзеяў Вэспасіяна Кахоўскага: *Вайна крывавая, несправядлівая, без прычыны і аб’яўленьня* (с.5), а галоўную задачу дасьледаваньня бачыць у тым, каб *паказаць рэальнае аблічча той вайны, засяродзіць увагу на самым малавядомым — ходзе падзеяў на Беларусі, лёсах карэннага жыхарства, а таксама на месцы вайны 1654–1667 гг. у беларускай гісторыі* (с.7).

Акрэсьленыя задачы аўтар рэалізуе ў лягічна пабудаваных разьдзелах-нарысах, назва кожнага зь якіх гаворыць сама за сябе: „*Напярэдадні*“, „*Нашэсьце*“, „*Пад уладаю „вызваленцаў*“ і інш.

Дасьледуючы перадумовы зьяўленьня акупацыйных войскаў на беларускай зямлі („*Сия,* — паводле вызначэньня цара Аляксея Міхайлавіча, — *благого дела…*“), аўтар дэталёва разглядае вайсковую й дыпляматычную падрыхтоўку Масквы, падае параўнальную характарыстыку мабілізацыйнай гатоўнасьці царскай арміі й войскаў Вялікага Княства Літоўскага („*Напярэдадні*“, с.8–13). Аналізуючы прычыны непадрыхтаванасьці Вільні да вайны з Масквой, ігнараваньня кіраўніцтвам Вялікага Княства ваеннай пагрозы з Усходу, сп. Сагановіч акцэнтуе ўвагу на канфлікце літоўскага польнага гетмана, прэтэндэнта на булаву вялікага гетмана князя Януша Радзівіла й караля Рэчы Паспалітай Яна Казімера. Аднак дасьледчык крыху спрашчае сутнасьць дадзенага канфлікту, зводзячы яго прычыны да сэпаратысцкіх памкненьняў князя, які ў прысутнасьці манарха кідаў польскім сэнатарам абразьлівыя рэплікі, кшталту: *Прыйдзе час, калі палякі да дзьвярэй не патрапяць — праз вокны выкідваць будзем!* (с.12). Разам з тым беларускі гісторык нічога ня кажа пра рэлігійныя матывы паводзінаў Радзівіла, які, як вядома, быў прызнаным лідэрам літоўскіх дысыдэнтаў. Якраз канфэсійныя матывы абумовілі ягоную прагу ня столькі адарваць Вялікае Княства ад Кароны, колькі пасадзіць на трон манарха-некаталіка (а менавіта аднаго з прадстаўнікоў трансыльванскай княскай дынастыі). Аўтар слушна зьвяртае ўвагу чытача на тое, што Януш Радзівіл меў апанэнтаў ня толькі ў асобе караля, але й сярод прадстаўнікоў магнацкіх клянаў-канкурэнтаў у самой Літве, і гэта таксама вельмі нэгатыўна адбівалася на баявой гатоўнасьці літоўскага войска.

У наступным разьдзеле кнігі — *„Нашэсьце“* (с.14–27) — сп. Сагановіч займаецца дасьледаваньнем мілітарных аспэктаў пачатковага пэрыяду вайны. Выказанае ім у папярэдняй частцы кнігі меркаваньне пра недастатковы ўзровень мабілізацыйнай падрыхтаванасьці літоўскіх войскаў тут даволі пераканальна ілюструецца хронікай вайсковых няўдачаў сярэдзіны — другой паловы 1654 году: стратай замкаў, паразамі ў бітвах, у тым

ліку й разгромам пад Шапялевічамі 24 кастрычніка 1654 году, пасьля якога армія Вялікага Княства спыніла сваё існаваньне (с.18).

Даволі нязвыклаю ўкраінскаму чытачу можа падацца ацэнка дзейнасьці на беларускіх землях 20-тысячнага казацкага корпусу пад кіраўніцтвам северскага гетмана Івана Залатарэнкі. Аўтар зьвяртае ўвагу перш за ўсё не на хуткасьць руху войскаў, а на спусташэньне земляў, якое было вынікам гэтага руху (с.19–20).
Увогуле трэба адзначыць, што ў сваёй кнізе сп.Сагановіч робіць націск менавіта на гуманітарным аспэкце праблемы, таму й спыняецца так падрабязна на жорсткасьці акупацыйных войскаў і вялізнай колькасьці ахвяраў сярод тутэйшага насельніцтва. Дарэчы, зьвяртае на сябе ўвагу й тая акалічнасьць, што дасьледчык, які цалкам слушна не дае веры паведамленьням царскіх ваяводаў пра колькасьць зьнішчаных войскаў праціўніка („прыпіскі“ і ў тыя часы былі звычайнай справай), безаглядна прымае інфармацыю пра „ратныя“ дзеі маскоўцаў падчас сутыкненьняў з цывільным насельніцтвам, у якой, несумненна, таксама была доля пахвальбы.
„Гурманы“ вайсковае гісторыі знойдуць у дадзеным разьдзеле й пэўныя цікавосткі, што тычацца абаронных дзеяньняў беларускіх месьцічаў. Так, напрыклад, падчас абароны Смаленскага замку жыхары гораду, ужо ня маючы пад рукамі ні каменьня, ні вару, скінулі на ворага дзьве калоды з пчоламі, і тыя загналі царскіх ваякаў назад у шанцы, чым дапамаглі адцягнуць на нейкі час захоп фартэцыі (с.23).
Надзвычайна важныя для разуменьня лёгікі разьвіцьця вайскова-стратэгічных падзеяў на Беларусі і разважаньні сп.Сагановіча што да палітычных аспэктаў вайны, пададзеныя ў наступным разьдзеле кнігі — „*Пад уладаю „вызваленцаў*“ (с.28–33). Аўтар акцэнтуе ўвагу на тым, што ўрад Аляксея Міхайлавіча прагнуў як найхутчэй інкарпараваць акупаваныя беларускія землі, ператварыўшы іх у правінцыі Маскоўскай дзяржавы. Паколькі афіцыйны курс Масквы быў скіраваны на палітычнае замацаваньне краю з праваслаўным насельніцтвам, на захопленых тэрыторыях захоўвалася магдэбурскае права, шчодра раздаваліся жалаваныя й ахоўныя граматы мясцовай „прысяжнай“ шляхце (то бок той яе частцы, якая склала

прысягу на вернасьць маскоўскаму манарху). Асабліва настойліва дэкляраваўся клопат усходняга праваслаўнага цара аб Праваслаўнай Царкве. Праваслаўным парафіям і манастырам перадавалася маёмасьць і культавыя збудаваньні, што раней належалі каталікам і ўніятам, якім увогуле забаранялася прылюдна адпраўляць свае рэлігійныя патрэбы: „*костелом не быть, а петь в домех*“… „*униатам не быть*“… „*жидом в Белоруссии не быть и жития никакого не имети*“ (с.28).
Адначасова сп. Сагановіч зьвяртае ўвагу на той відавочны з пункту гледжаньня дакумэнтальных сьведчаньняў факт, што палітычныя дэкларацыі маскоўскай улады ўва ўмовах вайны нярэдка разыходзіліся з сапраўдным станам рэчаў. Так, аўтар падае багата прыкладаў таго, што гвалт, учынены царскімі вайскоўцамі, быў скіраваны ня толькі супраць іншаверцаў, але й супраць праваслаўнага беларускага насельніцтва (с.30–31).

Як асаблівую вайсковую й палітычную сілу на акупаванай тэрыторыі аўтар выдзяляе казакаў — украінскіх і беларускіх. Галоўнай мэтай украінскай старшыны ў Беларусі, на яго думку, было падпарадкаваньне паўднёва-ўсходніх яе раёнаў сваёй юрысдыкцыі. Неабходнасьць такога кроку дыктавалася тым, што палітычная праграма Багдана Хмяльніцкага нібыта прадугледжвала стварэньне дзяржавы ў межах Кіеўскай Русі (с.32, 62). Калі апошняе сьцьверджаньне выглядае крыху гіпэрбалізаваным, дык тэза адносна намераў украінскай казацкай старшыны замацавацца ў згаданым рэгіёне й тым самым узмацніць гетманат як палітычна, так і эканамічна, мае пацьверджаньні ў крыніцах і ўжо неаднаразова выказвалася ўва ўкраінскай гістарыяграфіі. Ацэньваючы тактыку Івана Залатарэнкі, аўтар прытрымліваецца погляду Амяльляна Тралецкага, Івана Крып’якевіча, Міхайлы Грушэўскага ды іншых гісторыкаў, што бачылі ў дзеяньнях наказнога гетмана перш за ўсё мэтанакіраваную рэалізацыю палітыкі тагачасных кіраўнічых сілаў Гетманшчыны, а менавіта: стварэньне ў паўднёва-ўсходняй Беларусі ўласьцівага Ўкраіне палкова-соценнага ўладкаваньня ды ўтрыманьне рэгіёну пад уладай гетмана (с.32).
Разьвіваючы гэтую думку далей, сп. Сагановіч робіць выснову, што ўжо з самага пачатку беларускай кампаніі казацкія палкі,

згодна з плянам ураду Хмяльніцкага, павінны былі ня столькі дапамагаць маскоўскім ваяводам, колькі інсьпіраваць паўстаньні беларусаў і гуртаваць іх вакол казацкіх палкоў (с.32). На маю думку, такі погляд даволі сумнеўны, бо адбівае рэаліі не пачатковага этапу кампаніі, а ўжо той яе стадыі, калі выявіліся разыходжаньні ў бачаньні царскім і гетманскім урадамі палітычнай будучыні паўднёва-ўсходніх ваколіцаў Беларусі.
Вайсковым аспэктам наступнага этапу вайны, што пачаўся ўвосень 1654 году, прысьвечаныя чарговыя разьдзелы — *„Апошняя кампанія Радзівіла“* (с.34–39) і *„Государев поход“ 1655“* (с.40–54). Аналізуючы ход апошняй кампаніі вялікага літоўскага гетмана Януша Радзівіла, сп. Сагановіч вызначае тыя чыньнікі, што, з аднаго боку, зрабілі магчымай наступальную апэрацыю восені 1654 — зімы 1655 гадоў, а зь іншага — перашкодзілі замацаваць дасягнутыя посьпехі. Значная ўвага аддаецца тут марным спробам Радзівіла ды польнага гетмана В.Гасеўскага захапіць Магілёўскі замак, які на працягу студзеня-красавіка 1654 году абаранялі казакі Івана Залатарэнкі. Зьвяртаючы ўвагу на адсутнасьць у дзяржаўным скарбе грошай на ўтрыманьне наёмнага войска (вызначаная соймам 1654 году колькасьць — 15 тысячаў — так і не была набраная), аўтар неаднаразова зьвяртае ўвагу на нізкую баявую гатоўнасьць шляхецкага рушэньня і на наяўнасьць у Радзівілавых аддзелах значнай колькасьці беларускіх сялянаў. Уласна, дзьве згаданыя акалічнасьці, як вынікае з кантэксту дасьледаваньня, і сталіся галоўнымі прычынамі неэфэктыўнасьці дзеяньняў літоўскай арміі. Хаця тут, дзеля справядлівасьці, варта было б адзначыць і тое, што аддзелы Івана Залатарэнкі таксама фармаваліся не на прафэсійнай аснове і пераважную іх большасьць складалі не казакі, а паказачаныя ўкраінскія сяляне або ўчорашнія земляробы з паўднёва-ўсходніх беларускіх паветаў. Такім чынам, прычыну, відаць, трэба шукаць у іншым.

Сагановіч адзначае таксама, што да спусташэньня беларускіх земляў падчас вайны прыклалі руку й польскія жаўнеры, прысланыя на дапамогу літоўскаму войску. Нізкі маральны дух арміі абумовіў зьяўленьне ў жаўнерскім асяродзьдзі бунтарскіх настрояў, прывёў да рабункаў шляхецкіх маёнткаў, сядзібаў і

нават каталіцкіх касьцёлаў (с.43).
Значнае месца ў кнізе адводзіцца рэканструкцыі ўзаемаадносінаў Рэчы Паспалітай са Швэцыяй, умовам падпісанай Радзівілам з прадстаўнікамі швэдзкага караля Карла X Густава Кейданаўскай дамовы, а таксама грамадзкай думкі на Літве аб гэтых прашвэдзкіх захадах (с.43–44, 47–49). Дарэчы, тут гаворка йдзе ўвогуле пра Вялікае Княства Літоўскае, тады як было б цікавей даведацца пра стаўленьне да згаданых падзеяў шляхты ўласна беларускіх земляў.
У наступным разьдзеле — *„Вакол Віленскага замірэньня“* (с.55–69) гаворка йдзе пра складаныя дыпляматычныя пэрыпэтыі ў Вільні восеньню 1656 году, што адбываліся на тле пэрманэнтных вайсковых апэрацыяў літоўскіх, маскоўскіх і ўкраінскіх фармаваньняў на тэрыторыі Беларусі, а таксама пра ня менш значныя палітычныя перагрупаваньні. Аналізуючы часовы Віленскі мір, Генадзь Сагановіч зьвяртае ўвагу на неадназначную рэакцыю шляхецтва Рэчы Паспалітай, і асабліва Вялікага Княства, на яго падпісаньне, адзначае пачатыя ім перагрупаваньні палітычных сілаў у рэгіёне.
Украінскага чытача ў гэтым разьдзеле зацікавіць перш за ўсё погляд беларускага гісторыка на прычыны ўскладненьня ўкраінска-расейскіх стасункаў. Аўтар знаходзіць разыходжаньні як вайскова-стратэгічнага характару — аднаасобны выбар Масквой тэатру баявых дзеяньняў, так і палітычнага — ігнараваньне царом казацкіх прэтэнзіяў на беларускія землі (с.62). Пры гэтым, на маю думку, недастаткова акцэнтуецца адрознасьць поглядаў цара і ўкраінскага гетмана на пытаньне часу і ўмоваў замірэньня з польскім каралём, дзе, відаць, крыўся яшчэ адзін надзвычай важны штуршок да пагаршэньня ўзаемаадносінаў паміж Масквой і Чыгірынам. І хаця аўтар адзначае, што Віленскае замірэньне значна ўскладніла становішча ўкраінскіх казакаў у Беларусі, бо для Масквы іх вайсковая дапамога страціла сэнс (с.64), аднак ігнараваньне матываў віленскага водападзелу перашкодзіла прасачыць у кнізе прычыны трансфармацыі паводзінаў казацкіх аддзелаў у паўднёва-ўсходняй Беларусі. У дадзеным кантэксьце цяжка пагадзіцца са сьцьверджаньнем сп. Сагановіча, нібыта толькі ўпартасьць новага казацкага атамана Івана Нячая *перашкодзіла спробам палкоўніка Ждановіча* (колішняга палкоўніка кіеўскага. — **В.Г.**) *вывесьці казацкія залогі зь беларускіх паветаў* (с.64).

Заўважу, што Ждановіч, падчас супольнага з расейскім афіцэрам М.Сіўковым разгляду скаргаў маскоўскіх ваяводаў на злоўжыванні Нячая, прадстаўляў інтарэсы Багдана Хмяльніцкага, а яны ня розьніліся ад палітыкі, якую праводзіў казацкі палкоўнік. Прызначаючы яго на месца памерлага ад раны Залатарэнкі, гетман, дарэчы, упершыню тытулаваў Нячая „палкоўнікам беларускім“, такім недвухсэнсоўным спосабам засьведчыўшы сваю пазыцыю наконт палітычнай будучыні паўднёва-ўсходняй Беларусі.
Даволі контравэрсійным падаецца й тлумачэньне сп. Сагановічам сутнасьці Радноцкай дамовы 1656 году — якраз яе, відаць, ён мае на ўвазе, калі кажа пра *пагадненьне паміж швэдзкім каралём Карлам Густавам, трансыльванскім князем Георгам Ракочы і Багданам Хмяльніцкім, да якога дайшло на пачатку 1657 г.* (с.65). Перш за ўсё варта адзначыць, што ў працы над умовамі пагадненьня, акрамя прадстаўнікоў швэдзкага кароля й трансыльванскага князя, бралі ўдзел і паслы ад Літвы (дакладней — ад прашвэдзкага сэгмэнту ейнага палітычнага істэблішмэнту), тады як інтарэсы Войска Запароскага на перамовах у Радноце прадстаўленыя не былі. Таму тут можна весьці гаворку толькі пра салідарнасьць ураду Хмяльніцкага з намерамі фундатараў дамовы пачаць супраць Кароны Польскай узброеныя дзеяньні, што абмяркоўвалася падчас двухбаковых украінска-швэдзкіх і ўкраінска-трансыльванскіх перамоваў. Цяжка пагадзіцца й з тым, што *Вялікае Княства Літоўскае, Галіцкая Русь і Мазовія аддаваліся князю Ракочу* (с.65).

Калі ацэнка вонкавапалітычных рэаліяў у „Невядомай вайне“ ўтрымлівала пэўныя недакладнасьці, то аналіз сп. Сагановічам нутраных аспэктаў вайны — нашмат больш зьмястоўны і імаверны (разьдзел *„Акупанты і партызаны“* с. 70–82). Аўтар, у прыватнасьці, адзначае, што Віленскае замірэньне паміж Маскоўскім княствам і Рэччу Паспалітай мала што зьмяніла ў становішчы мірнага насельніцтва Беларусі, якое й надалей *цярпела ад маскоўскіх гарнізонаў, ад казакаў, ад швэдаў, а ў дадатак — і ад сваіх здэмаралізаваных жаўнераў…* (с.70). Грунтуючыся на словах літоўскага канцлера Альбрэхта Радзівіла, сп. Сагановіч сьцьвярджае, што ў тыя часы слова „жаўнер“ было сынонімам слова „рабаўнік“.

Аналізуючы прычыны актывізацыі партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі, аўтар вызначае шэраг абставінаў, што спрычыніліся да гэтага. Перш за ўсё ён акцэнтуе ўвагу на злоўжываньнях царскіх войскаў на чале з ваяводамі, якія *насилством ночью на маетности шляхетские и на крестьянские дворы... находят и наезжают и огнем жгут и до смерти побивают* (с.71); дэталёва характарызуе канфэсійную палітыку расейскай улады, што выклікала хвалю абурэньня сярод каталікоў і ўніятаў; уважліва аналізуе прымусовыя дэпартацыі мясцовага насельніцтва ў Расею. У прыватнасьці, рэканструяваная дасьледчыкам карціна людалоўства, шырока практыкаваная „вызваліцелямі“ на беларускіх землях, выглядае асабліва ўражальна, востра дысануючы з дагэтулешнімі тлумачэньнямі дзеяньняў царскіх войскаў як *сяброўскай і бескарысьлівай дапамогі сваім братам*. Генадзь Сагановіч аргумэнтавана даводзіць, што гаворка йшла не пра асобныя злоўжываньні царскіх ваяводаў на захопленай тэрыторыі, а пра мэтанакіраваную палітыку, санкцыянаваную царом і патрыярхам. Так, на яго думку, акурат царскі загад ад 30 ліпеня 1654 году паклаў пачатак распрацоўцы цэлай заканадаўчай базы, на падставе якой палонных пачалі ператвараць у прыгонных, а патрыярх у 1655 годзе адкрыта падтрымаў намеры сьвецкай улады перасяліць на зьнелюднелыя абшары Маскоўскай дзяржавы 300 тысяч палонных беларусаў (с.31, 74–75).

Разглядаючы ўздым руху супраціву, аўтар зьвяртае ўвагу на тое, што спачатку найбольшай актыўнасьцю вызначаліся партызанскія аддзелы на поўначы і ўсходзе Беларусі — у Віцебскім, Полацкім, Магілёўскім, Мсьціслаўскім і Смаленскім паветах, а пачынаючы з 1656 г. цэнтар партызанскай барацьбы перамясьціўся ў раёны, кантраляваныя палкоўнікам Нячаем. Паводле назіраньняў сп. Сагановіча, толькі адзін партызанскі аддзел насамрэч падпарадкоўваўся казацкаму палкоўніку, а астатнія толькі зваліся „сотнямі Нячая“, на самой справе ня маючы да казакаў ніякага дачыненьня (с.76–77). На жаль, у кнізе няма адказу на пытаньне, чаму так сталася. З пункту гледжаньня папярэдніх разьдзелаў, дзе аўтар не шукаў адрозьненьняў паміж дзеяньнямі ўкраінскіх казакаў і царскіх ратнікаў, наадварот — падкрэсьліваў іх падабенства ў адносінах да мясцовага насельніцтва, нечаканае аб’яднаньне

беларускіх партызанаў з казакамі падаецца алягічным. Гэтаксама павярхоўна, без дэталёвага аналізу прычынаў і ходу падзеяў, сп. Сагановіч характарызуе грамадзкае супрацьстаяньне ў краі, абапіраючыся на адзіную працу В.Мялешкі *„Грамадзянская вайна (1655–1658)* [*„Навіны Беларускай акадэміі“*, 1992, 26 чэрв.]“, а гэтага відавочна замала. Асобнага дасьледаваньня варты і ўдзел „прысяжных“ сялянаў у баявых дзеяньнях на баку маскоўскага цара — яно дапаможа раскрыць яшчэ адну трагічную старонку беларускай гісторыі XVII стагодзьдзя.
Пераход стратэгічнай ініцыятывы ў рукі камандаваньня літоўскай арміі сп. Сагановіч (разьдзел *„Пералом“*, с.83–105) зьвязвае з актыўнымі мабілізацыйнымі захадамі ўраду Рэчы Паспалітай, у выніку чаго колькасьць наёмнага войска ў Кароне ў 1658–1659 гадах павялічылася да 36 тысяч, у Вялікім Княстве — да 20 тысяч, што дало найбольшы колькасны паказьнік за ўсю вайну. Падкрэсьлена, што тады ж, у выніку шэрагу падзеяў, істотна пагоршыліся вайсковыя пазыцыі Расеі, якія расхіставаліся актывізацыяй партызанскага руху ў Беларусі, антымаскоўскім выступам гетмана Івана Выгоўскага, патрэбай утрымліваць значныя вайсковыя сілы на швэдзкім фронце (с.85). Асаблівае значэньне аўтар надае перамозе Выгоўскага пад Канатопам улетку 1659 году, дзе былі разьбітыя найлепшыя царскія войскі (с.86). Згаданы разьдзел месьціць таксама істотныя дэталі з гісторыі абароны казакамі Нячая Старабыхаўскага замку ў ліпені—сьнежні 1659 году (с.86–87). Несумненна, для ўкраінскага чытача будзе цікавым і апісаньне падзеяў пачатку 1660-х на Піншчыне — як працяг сюжэту з прызнаньнем у сярэдзіне 1657 годзе мясцовай шляхтай зьверхнасьці ўкраінскага гетмана (пра гэта ў свой час бліскуча напісаў Вячаслаў Ліпінскі).

З ухваленьнем у кастрычніку 1659 году гетманскім урадам Юр’я Хмяльніцкага і прадстаўнікамі маскоўскага цара новых Пераяслаўскіх артыкулаў, што прадугледжвалі вывад казацкіх войскаў зь Беларусі й адмову надалей ад якіх-колечы прэтэнзіяў на яе з боку старшыны, а таксама пасьля захопу ў сьнежні таго ж году Старабыхаўскага замку, украінскі фактар страчвае свой беспасярэдны ўплыў на разьвіцьцё беларускіх падзеяў. Але апасродкавана лёс беларускіх і ўкраінскіх земляў

застаўся цесна пераплеценым, бо вайна працягвалася. Так, бліскучая перамога польска-літоўскіх войскаў пад Ляхавічамі 28 чэрвеня 1660 году, якая, на думку аўтара, паклала пачатак пералому ў вайне (с.94–95), выклікала ў расейскага камандаваньня жаданьне рэваншу, якое мелася рэалізавацца падчас паходу князя В.Б.Шарамецева на Валынь увосень таго ж году.

Аналягічнае пачуцьцё ўзаемазалежнасьці гістарычных лёсаў двух суседніх народаў узьнікае й падчас чытаньня наступных разьдзелаў манаграфіі — „*Змарнаваныя шанцы*“ (с.106–119) і „*Андрусава*“ (с.120–129). Аналізуючы характар ваеннага супрацьстаяньня першай паловы — сярэдзіны 1660-х, сп. Сагановіч больш дэталёва спыняецца на матывацыі, падрыхтоўцы й ходзе паходу Яна Казімера на Левабярэжную Ўкраіну восеньню 1663 году, а таксама на ўдзеле ў ёй літоўскіх войскаў на чале з польным гетманам Міхайлам Пацам і польным пісарам Аляксандрам Палубінскім. Прычыну змарнаваньня Рэччу Паспалітай апошняга шанцу адолець Расею аўтар бачыць, перш за ўсё, у абвастрэньні ўнутраных супярэчнасьцяў у дзяржаве, у зьяўленьні канфэдэрацыяў у рэгулярным войску, у адмове жаўнераў выконваць загады караля й гетманаў. Ход і рашэньні сойму 1661 году, на якім не было аддадзена належнай увагі пытаньню выплаты запазычанасьці войску, затое багата часу пайшло на марныя спрэчкі пра элекцыю новага манарха яшчэ пры жыцьці Яна Казімера ды на абвінавачваньні літоўскіх магнатаў у карупцыі — усё гэта, на думку аўтара, сталася прычынай тых няўдалых вынікаў вайсковай кампаніі польска-літоўскай дзяржавы (с.106–107, 110, 118). Разглядаючы міжнародныя аспэкты падпісаньня Андрусаўскага замірэньня 1667 году, аўтар падкрэсьлівае, што яно канчаткова парушыла балянс сілаў ува Ўсходняй Эўропе на карысьць Маскоўскай дзяржавы. Апошняя па выніках вайны 1654–1667 гадоў дасягнула вяршыні рэгіянальнай магутнасьці, тады як Рэч Паспалітая, наадварот, *ужо ў Андрусаве падпісала сабе прысуд* (с.129). Між іншым, захоўваючы вернасьць абраным акцэнтам, сп. Сагановіч больш увагі аддае не тэрытарыяльным зьменам або памерам грашовых укладаньняў, а праблеме вяртаньня на бацькаўшчыну захопленых у палон беларусаў і разрабаваных культурных каштоўнасьцяў (с.125–128).

Тэма чалавечых пакутаў, якімі мірнае насельніцтва расплацілася за ваяўнічасьць уладароў, прычым не абавязкова ўласных, дамінуе і ў апошнім разьдзеле *„Забвенну і непамятну?“*, дзе аўтар падсумоўвае вынікі свайго дасьледаваньня. Паводле ягоных падлікаў, колькасьць насельніцтва тагачаснай Беларусі за гады вайны зьменшылася з 2 млн. 900 тыс. чалавек да 1 млн. 350 тыс., то бок на 53%, а гарадзкога насельніцтва ацалела яшчэ менш — толькі 45%. Дэмаграфічныя страты беларусаў, як падкрэсьліваецца ў кнізе, пераўзыходзяць па памерах нават аналягічныя паказьнікі найбольш зьнішчальнай з тагачасных войнаў — Трыццацігадовай. Так, на асабліва пацярпелых нямецкіх землях колькасьць насельніцтва зьменшылася на 66%, тады як у Мсьціслаўскім павеце гэты паказьнік дасягае 71,4%, у Аршанскім — 69,3%, у Полацкім — амаль 75% (с.130). Акрамя велізарных чалавечых ахвяраў вайна, паводле падлікаў сп.Сагановіча, амаль поўнасьцю зруйнавала эканоміку (у Віцебскай эканоміі, напрыклад, доўгі час заставаліся неапрацаванымі 74% ворных земляў, у Прапойскім і Крычаўскім старостваx адпаведна — 73 і 72%), канчаткова й незваротна пакінула ў мінулым міжканфэсійную цярпімасьць; падштурхнула мясцовую арыстакратыю да вырачэньня сваёй „беларускасьці“ (с.131–133).
Такім чынам, кніга Генадзя Сагановіча поўнасьцю зьмяняе стэрэатыпны погляд на „невядомую вайну“ 1654–1667 гадоў як на „вызвольную“. Па-іншаму прымушае яна зірнуць і на ўдзел украінскіх казакаў у беларускіх падзеях, пераконваючы, што далёка не заўсёды мэта можа адпавядаць сродкам яе дасягненьня. Вайна — гэта перш за ўсё пакуты, і менавіта такой яна паўстае з манаграфіі Генадзя Сагановіча.
З украінскай пераклаў
Андрэй Скурко паводле
Украінського Гуманітарного Огляду*, выпуск 3.*

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум

№ 8 (13) – 2000

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
Дызайн **mk**, майстраваньне Макса Маскалёва
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-01-2001**
[image]